# ЛАРЫСА ГЕНІЮШ
# ВЫБРАНЫЯ ВЕРШЫ





ЛАРЫСА ГЕНІЮШ
ВЫБРАНЫЯ ВЕРШЫ

**ББК 84. Р7**
**Г 94**

**Геніюш Л**.
Выбраныя вершы. Мн.: , 1997. — 320 с.

**ISBN 5-85968-0 19-8**

Укладаньне, падрыхтоўка тэкстаў і камэнтар
Міколы Раманоўскага

# ЛАРЫСА ГЕНІЮШ

## ВЫБРАНЫЯ ВЕРШЫ

Менск
1997

**ББК 84. Р7**
**Г 94**

**Геніюш Л.**
Выбраныя вершы. Мн.: , 1997. — 320 с.

**ISBN 5-85968-0 19-8**

Укладаньне, падрыхтоўка тэкстаў і камэнтар
Міколы Рама초ўскага

## МОЙ РОДНЫ КУТ

Мой родны кут,
мой ціхі дом,
дзе ў гольле дрэў,
аб сьцены ніў
пад сумны сьпеў
буйным крылом
паўночны вецер
звонка біў.

Мой родны кут,—
на твой ўспамін
бушуе кроў,
а ў сэрцы гар,
а ў сэрцы боль,
бо з ніў, з далін
урок мяне
туманны чар.

І ў ясны дзень,
і ў ноч бяз зор
душа, як птах,
пад гоман дум
ляціць на шлях,
дзе песьняй бор
калыша долі
нашай сум.

Мой родны кут,
цьвяцісты луг,—
пад шумы вольх
прыдзе ў начы,
як ціхі ўздох,
мой верны дух
на вечны сон
к табе спачыць.

Пад ветру шум,
пад буры кроз,
пад гоман хат
хто сэрцам жыў,
ў вясьняны чад
хто ў полі рос,
той не пакіне
родных ніў.

## ВЯЧЭРНЯЯ МІСТЭРЫЯ

Золатам тканаю рызаю
пакрылася неба бяз хмар.
Пацеркі зораў нанізаных
вечар кладзе на аўтар.

Месяц-сьвяшчэньнік кадзіць
бліскучым семенем зор.
Сыплюцца зоры ў прысадзе
на белы дзяўчыны прыпол.

Б’юць цені паклоны набожныя,
а распушчаны косы бяроз
атулілі крыжы прыдарожныя,
дзеравяны дзе церпіць Хрыстос.

Май. Гарацць сьвечкі нарцызаў,
гараць сэрцы каханьня агнём.
Блішчыць неба царкоўнаю рызай,
кадзіць зорамі месяц кругом.

## НА НАЧЛЕЗЕ

Вецер хвалі ўперад гоне, вербы гне,
ходзяць спутаныя коні ў тумане.
Буланыя мае коні
капытамі ціха звоняць
ў сэрца мне.

Доўга, доўга ноччу цуднай я ня спаў,—
аганёк па полі блудны вандраваў...
Доўга песьня салаўіна
не сьціхала срэдзь галінаў,
сярод траў.

Доўга, доўга чуў дзявочы з вёсак сьпеў,
аж пакуль рагаты месяц не самлеў...
Пакуль хлопцы не паснулі,
агонь ветры не раздулі,
аж згарэў.

Ноч была як быццам казка сіняя...
Пакуль зоры не пагасьлі, думаў я,
што, чым зоры праз галіны —
чараўней глядзіць дзяўчына,
ой, мая!..

Ходзяць коні, ходзяць ў раньнім тумане...
Ўстануць хлопцы, ды дахаты пажанем.
Вецер хвалі ўперад гоне,
яны роднай песьняй звоняць
ў сэрцы мне...

## НОЧ

Ноч трапечацца, і зоры ярка сьвецяць,
вецер песьню запяяў цішэй...
У блядых руках душу калыша месяц,
хістаючысь сярод заснулых дрэў.

Снуюцца цені на пустой дарозе,
на небе Воз адкінуў дышаль ўбок
і хмараў сініх болей не развозіць;
туман запутаўся над рэчкай у кустох.

То тонкі вэлюм свой разьвесілі русалкі,
каб вольна рытмам лебядзіных цел
прыйсьці, кружыцца, праляцець маланкай,
аж пакуль птушкі не празвоняць дзень.

Пакуль аж вецер зораў не патушыць,
расою не зазвоніць лісьце лебяды,
з рук месяц пусьціць расьпяяну душу,
ноч ногі мокрыя ня выцягне з вады.

## НА СТРУНАХ ВЭЛТАВЫ

На струнах хваль іграе вецер
сымфоню ночы зорнае.
Над глыбінёю дуб разьвесіў
свой цень, бы крыльлі ворана.
Ў сетку з ясных зор
прыбралася ноч,
ў казачны убор,
залацісты дождж.

Брыльлянтамі на дно апалі,
апалі зоры семенем.
Калышуць іх на грыве хвалі,
а ноч іх сыпле жменямі.
Нават не маглі б
вочы распазнаць —
ці прад намі глыб,
ці нябёсаў гладзь.

Пад намі неба ўсхваляванае,
над намі неба зорнае,
сінь, золатам размаляваная,
і тут, і там узорная.
Верыць бы кажны мог,
быццам стаўся цуд,
быццам неба тут
сьцелецца ля ног.

## ПА-НАД ВЭЛТАВАЮ

Па-над Вэлтаваю
лётаюць, плаваюць
кагаркі ў сонечны дзень.
Стадамі белымі,
быццам вясельнымі,
маняць на бераг людзей.

Стрэламі лётнымі,
ветру узьлётамі
шыбаюць ў сінюю высь.
Неба ж пад дотыкам
стройнае готыкі,
праскае неба дрыжыць.

Быццам бы топалі
ў сонцам растоплена
нашае неба глядзяць.
Цьветам жа ў маі
сады засыпаюць
сіняга Нёману гладзь.

Так над Вэлтаваю
кружаць, то плаваюць
кагарак белых віры...
З чарам пагоднага ж
неба, як роднага,
ўспомніцца Нёман стары.

## БЫВАЙ

Бывай, дарагая мне Прага!..
Ты ў белы прыбралася іней,
калі карабель мой жыцьцёвы
прыстаў на Вэлтаве сіняй.

Адвагі было ў мяне мала,
настрой — беларускі, гаротны.
А ты сьнегам места прыбрала
так белым, як нашы палотны!

Ляцелі, як быццам бы зоры,
танцуючы з ветрам, сьняжынкі,
у бель яны строілі горад
і цешылі сэрца чужынкі.

У неба цягнуліся вежы
так стройна, як нашы таполі,
хоць вецер ня гнуў іх на межы
і вокал ня слалася поле...

Ўсё ж ў ноч, калі сьніліся краскі
і сум крышыў сэрца ў аковах, —
мне баяў таёмныя казкі
граніт гэтых вежаў вяковых.

Бывай, залацістая Прага!..
Мой парус кірунак ўжо меніць...
Успомню цябе я няблага
за казкі і сэрца каменьняў.

За прыязьні даўняй азнакі,
за кажнага Крывіі сына —
прыймі сяньня, Прага, падзяку
ад ўнучкі Францішка Скарыны!

Глядзі, як вякі ўжо, з адвагай
ў апеку сьвятога Вацлава...
Бывай, дарагая мне Прага,
бывай ў пене срэбнай Вэлтавы...

## МАЛАДЫЯ КРЫЛЬЛІ

Ўжо сонца за морам ў пасьцельку лягло
і птушка заснула, прыкрыўшысь крылом,
у норцы прыціхла ля мышанькі мыш,—
чаму ты, сыночку, так доўга ня сьпіш?
Ці ў ручкі малыя табе халадно?
Ці ножанькі зьмёрзьлі пад тонкім радном?
Вось месяц заглянуў на нашу пасьцель,
і вугальчык зоркі на ніз паляцеў!
Ня будзе ўжо болей начамі сьвяціць —
пагас нейдзе сумна над рэчкай ў трысьці.
Заплюшч свае вочкі — з-пад небных старон
зьляціць матылёчкам табе ціхі сон!..
А я табе песьню ціхонька сьпяю
пад думкі, што голаў ўскружылі тваю...

— Хачу я, матулька, вялікі расьці,
Малочнаю Сьцежкай манлівай ісьці!
Хачу неба з шэрай зямлёю злучыць,
Малую Мядзьведзіцу ў Воз запрагчы,
акелзаць на небе разгонены гром
і сеяць на стрэхі праз Сітца дабро!
Маланкай, як пуга, як войстры бізун,
гнаць хмары, што воўкам над вёскай паўзуць,
вісяць па-над намі, як сьлёзы, як зло,
закрыўшы для сонца дарогу ў сяло!
Каб сівер у хаты крывыя ня дзьмуў —
сам ветравы лейцы я ў рукі вазьму;

расплаўлю нат сэрцам на Нёмане лёд,
я шчасьцем сагрэю свой любы народ!
Адвечныя сьлёзы братоў я зьбяру,
дзірванную розумам долю згару...
Усе нашы раны зьлічу ў рызманох
і крыкну, што нават зьлітуецца Бог!

Сын крозіць, ён целам — дзяцінны, малы,
а духам — як тыя пад небам арлы!
За вокнамі вецер б'е ў бубен-страху,
шапоча малітвы матуля ў страху.
А сэрца б'е сілай пад тонкім радном,
праз вокны ж шлях сіні, шлях ясны відно...

## У АСЕНЬНІ ДЗЕНЬ

Йду ціхім, асумелым садам.
Шмат лісьця вецер ўжо аднёс,
толькі, як жменя буйных сьлёз,
вісіць галінка вінаграду.

Над траў зялёным вадападам
ня чэшуць вербы сваіх кос,
ня вабіць ліпа мёдам кроз,
ня кліча груша сесьці радам.

Ня белы бэз пахучым чадам,
а на кустох зацьвіў мароз,
і градам буйных горкіх сьлёз
зьвісае жменя вінаграду.

## КІР

Любоў і праўду я бяру за шчыт
і з імі йду бясстрашна ў цяжкі час;
я не пяром, а гастрыём душы
пішу крывёй счарнелаю да Вас.

Жалобны кір над маім прошлым лёг:
ня ўчую больш матулі цёплых слоў —
на вуснах ёй заціх апошні ўздох,
як тысячам замучаных рабоў...

Равы братоў, цяжкія сёстраў дні,
страшэнны боль апошніх бацькі год,
людзкія душы, сёлы у агні,
а на крыжы замучаны народ.

Хоць неба сёньня срогае маўчыць,
я ў адраджэньня веру ясны цуд:
любоў і праўду, свой магутны шчыт
ўздымаю сьмела прад панамі пут.

Ня страшна мне іх мсьцівасьці і кар,
бо ў маім сэрцы вера, не сумлеў —
ў маёй душы ня попел, але жар,
ў маіх ачох ня сьлёзы, але гнеў...

## ЗАЎТРА

Поўны тугі, поўны красы
сэрцаў, народу адданых,
край, гдзе жывуць Беларусы,
сьпяць змагары на курганах.

Ў сэрцах расьце волі зярнё,
ў полі красуецца збожжа.
Гоні пажнём радасным днём,
Бог здабыць волю паможа.

Ветры гудуць зьдзеку ў адказ,
моладзь на веча склікаюць,
заўтра з-за хмар ўзыдзе для нас
сонца над зmoраным краем.

Воляй шумяць сосны ў бары,
воляй гамоніць калосьсе,
з ціхіх сялїб верны парыў
Богу малітвы даносіць.

Дні ў кайданах — думы ў агне,
сэрцы хвалююцца верай.
Прыдзе для нас гору канец,
прыдзе на нёманскі бераг.

Дрэвы гудуць, вёскі ня сьпяць,
звоніць надзеяй калосьсе,
сьпевам вятры ў неба ляцяць,
Богу малітвы даносяць.

## ЦУД

Весяліўся, сьмяяўся агонь,
чырванеў, як зара-зараніца,
і згараў на ім белы мой конь,
і згараў на ім мужны мой рыцар.

Як з паганскіх курганных часоў,
ішлі ўдовы на вогнішча сьмерці,
я, найболей няшчасная з ўдоў,
свайму рыцару кінула сэрца.

Ўзьняўся ў неба ахвярны мой дым,
рос із сэрца майго агнявіцай,
і скрозь сьлёзы я бачыла ў ім,
як ажыў йзноў конь белы і рыцар.

І сярод найцяжэйшых пакут
я паверыла сэрцам гаротным,
што з ахвяраў нам зродзіцца цуд,
што наш Рыцар і Край несьмяротны.

## ЛЯ ЧУЖЫХ ВАРОТ

Хоць доля б’е і ў сэрцы лёд,
ўсё ж думы не ў аковах.
Праходзе ля чужых варот
мой жнівень васількова.

Хоць вяне мак, душа у сьне,
калісьць, забытым маем,
вітала віхрамі мяне
краіна дарагая.

Ўздымаўся Нёман, гнуўся бор,
і топаль вабіў вочы,
а пры дарозе цьвіў чабор
пясьнярцы на вяночак.

Ў закуты край біў долі град,
сьлязьмі снаваў вясельле,
усё, што зраніў цёмны брат,
спавіла з межаў зельле.

Калі ж душу зьлівала кроў,
а думы голаў гнулі,
глыбокі боль праменьні слоў
замовіла бабуля.

Сягоньня зрываў дум, ні кроз,
ні ран ніхто няговіць,
і гэты боль, што ў сэрцы ўрос,
бабуля не замовіць...

Блукаю ля чужых варот,
хоць думы не ў аковах,
і сум душы і сэрца лёд
гарачым плаўлю словам.

Загнаны лісьць, як птах здалёк,
ў чужыне толькі ценем.
Зьвіваю ў залаты клубок
ўспамінаў павуценьне,

каб песьні новыя тварыць
і словам Край кунежыць,
той Край, гдзе вецер гнуў бары,
гдзе цьвіў чабор на межах.

## НОЧ

Ноч, цемені вечнай таемная пані,
выходзе, крадзецца із крышаў нязнаных.
Йдзе пэўна на зьмену дня яснай сьвятыні,
ніхто не стрымае, ніхто не запыніць...

Чалом ясным сонца дзень нізка сагнуўся,
яшчэ міла глянуў, яшчэ асьмяхнуўся,
праменьнямі бліснуў і ў чырвані згінуў,
бы ясную голаў сьцяла гілётына.

Заціхла зямелька ў час сумнага скону,
да гнёздаў трывожна прыпалі вароны,
і людзі у сёлах, і зьверы між бору
схаваліся ў хаты, зарыліся ў норы.

І толькі пугач, рыцар ночы адзіны,
сьмяяўся і плакаў з сухое галіны.
Ноч-пані ўсе сэрцы слабыя маніла,
брыльянтамі зоры ўгары запаліла.
Ў даверра людзкое скрадалася ценем
і вабіла душы у бездну, у цемень.

Йшлі людзі бяз сьмеху за цёмнаю паняй,
забыліся ў горы, што прыдзе сьвітаньне
і выплыве сонца. Ня газьніцай зораў,
а праўдаю вечнай расьсьвеціць прасторы.

## ТРЫВОГА

Ўжо ня буду Цябе калыхаць,
сумных песьняў ня буду пяяць,
каб ня плакаў, каб ціхенька змоўк,
ноч крадзецца із цемры, як воўк.

Аб заклятай красуньні вярбе
ўжо нат баяць ня буду Табе;
не магу ўжо найсьці ў сабе слоў,
каб спакой Табе лгаць і любоў.

Пакуль злую пазнаеш зямлю,
лепш да сэрца Цябе прытулю,
няхай б'е Табе праўду, як звон,
няхай ціхі старожыць Твой сон.

Ні вядзьмар, ні дзікія ваўкі
не страшныя, як брат твой людзкі;
ён ад матчыных родных грудзёў
адарваць Цябе, сынку, гатоў.

І крывёю пасьцельку абліць,
і абоім жыцьцё загубіць.
Не, ня буду ўжо песьняў пяяць,
моўчкі будзеш на сэрцы мне спаць.

Пакуль стук яго чуцьмеш у ноч,
будзь спакойны, саколік-сынок,
вечнай ласкай і негай б'ючы,
будзе верна Цябе сьцерагчы.

## БРАТ МОЙ А.

Брат мой, кажуць, ад кулі памёр,
гнаны доляй, ў чужыне загінуў.
Ўсё ж Ён срогаму сьвету ў дакор
ясны сьмех свой званочкам пакінуў,
сінь вачэй адказаў васільком,
мілы голас — жывым ручайком.

Нёс надзею і радасьць для нас...
Вастрыё засталося ўспамінаў
і адзіны, крывавы адказ:
мэдалі із-пад Монтэ-Касіна,
і кашуля з засохшай крывёй,
і кусочак зямелькі чужой.

Лёг у дваццаць вясьняных гадоў
сярод красак цьвітучай Італіі,
бы учадзеў ў пахучых садох,
бы расплыўся ў чаруючых далях,
ў кіпарысах трагічна-сумных
абарванай надзеяй заціх.

## ДЗЯДЫ

Дождж падае вонку прыцішаным звонам,
дождж льецца, дождж плача на шыбах аконных,
балючы стон ветру даносіцца з даляў,
і зоркі на небе нам ноч не запаліць.

Ў сьвятынях сьціх гоман малітваў нядзельных,
на могілках сьвечкі даўно дагарэлі.
А ў краі, гдзе думы мае безупынна,
чакаюць у хатах дзядоў на гасьціну.

Да нас не забудзьце, прыходзьце, дзяды;
хопіць малітваў ў мяне і яды
з сёлаў забытых, з лагчын і бароў
і з наднямонскіх старых цьвінтароў.

У дом мой плывеце на сьветла агню,
вокны шырокія Вам адчыню;
гэдак прыходзьце, як колісьць жылі,
весткі прыносьце із роднай зямлі.

Душу Вам вышлю насустрач сваю,
палкай малітваю Вас напаю,
сэрца маё каля Вашых магіл,
там, гдзе сумуе мой край дарагі.

Ў вечар таёмны, у поўначы час
з Божае волі чакаю на Вас;
разам мы просьбаў гарачы наш жар
слаць будзем шчыра прад Божы аўтар.

Сумна і пуста ў вокнах маіх,
ніхто ня прыдзе сюды з жывых;
кругом пустыня, навокал цьма,
над горнай прорвай стаю сама.

Будзем прасіць за тых, хто не забыў
ні роднай мовы, ні родных ніў.
Хто мёртвых ўваскрошваў сьвятою рукой,
Той нас не пакіне ў хвіліне цяжкой.

## МАЛЫ ПЕРАПЫНАК

Ачамі да воблакаў сініх прыпаўшы,
п'ю кволасьць праменьняў ў парыве вясьняным,
нат заўтра здрадлівым ударам ня страшыць,
іголкамі сэрца ўспаміны ня раняць.

Вось проста ў дарозе малы перапынак,
усё, што дадзела, на бок адкладаю,
любуюся бельлю вішнёвых галінаў,
запененай руньню, чакаючай дальлю.

Гляджу, як гуляюць вятры на свабодзе,
як рэкі на хвалях калышуць праменьні,
як дзень замірае, як ноч надыходзе
з балотных лагчынаў трывожачым ценем.

Праз плечы ёй месяц на золаце зораў,
бліскучы і ясны, ляніва зьвісае.
Штурмуючы хмары адважным напорам,
з выцьцём і адчаем вятры прылятаюць.

Ўстаю, ўжо мне нельга вакольле галубіць,
бяру сваё гора, дарога чакае...
Ноч доўга, трывожна ў рог месяца трубіць
і зоры вятрамі ў засекі зганяе.

## УДАР

Учора сурова падбілі мой лёт,
песьні паранілі ясныя крыльлі,
гэдак часамі вясною гальлё
бура шалёная глуміць і хіліць.

Заўтра мо большы, страшнейшы удар
целам маім страсяне чалавечым.
Потам пакрыецца зморaны твар,
гледзячы сумна у вір небясьпечны...

Толькі мой вольны ня зломіцца дух,
божая іскра у целе бязрадным.
Голаву ўзьняўшы, там ў цемень пайду,
сэрцам у небе пытаючы праўды.

## Я НЯ БУДУ

Я ня буду пісаць аб каменьнях,
славіць песьняй красу пірамід,
калі сілай людзкога цярпеньня
уздымаўся нячулы граніт.

Песьняры куюць гімны з жалеза,
славяць працу зьняволеных рук,
іх ня вабіць куст белага бэзу,
не чаруе зялёная рунь...

Знаю рогат шалёны турбінаў,
зброю, гонар падзеяў людзкіх,
знаю моц дасягненьняў няўпынных,
ўсё ж пяяць я ня буду аб іх.

Пакуль лёну маленькае семя
на зямлі будзе небам сінець,
пакуль зоры сьвяціцьмуць у цемень,
а сасонкі закоўвацца ў медзь,

пакуль зморшчанай, цёплай рукою
маці будзе нам сэрцы бяліць,
пакуль рэкі вадою напояць,
а зямля будзе хлебам карміць,—

быццам лільяў цудоўных бярэмя,
дабра водгульлі ўсюды зьбяру,
буду віць з іх начамі паэмы,
як сачыстая, нашая рунь.

Прыдзе дзень як крыло галубіцы,
сьвет на зьмену крывавых начэй,
прыйдуць брацьця напіцца з крыніцаў,
каб было ім на сьвеце ясьней.

## ЮНАСЬЦЬ

Сады адцьвітаюць за дротам,
а вёсны даўно адцьвілі,
сплылі яны крыўдай і потам
за волю каханай зямлі.
Сады адцьвітаюць над Нёмнам
ля берагу нашай Дзьвіны,
а юнасьць — на поўначы цёмнай,
цяжкія рвучы кайданы.
Цьвілі сады нашы адвеку,
вякі яшчэ будуць цьвісьці,
а юнасьць, вясна чалавека,
раз толькі красуе ў жыцьці.
Усё ж нам ня жаль яе цьвету,
найлепшых, чароўных гадоў
для ніў тваіх шчасьця, для сьвету,
зьняволены краю Дзядоў.

* * *

Я з вамі ў няволі, я з вамі усьцяж
У сьмелых сваіх летуценьнях,
Я з вамі у кожнай гадзіне жыцьця,
У кожнай мінуце цярпеньня.
Пяцёрачным строем я з вамі іду,
Хоць штык нада мною узьняты,
Я шлю вам прылівы хвалюючых дум,
Апершысь аб чоран лапаты.
Я з вамі у шахтах, пры працы цяжкой,
Калі чало потам абліта.
Тужу і сумую збалелай душой,
Калі хоць адзін з вас нясыты.
Я з вамі ў надзеі разьіскраны час
Ўсёй сілай маёй адзіноты.
Нічога, браты, што дарога да вас
Калючым заплецена дротам!

* * *

Я сустрэлася з сябрамі не на балі,
не да танцу заіграў аркестр,
не на танга хлопцы запрашалі,
лёгкім жэстам ўскакваючы з месц.
Не ў сукенцы, быццам павуценьне,
расьсяваючы парфумаў лёгкі чад,
я прышла да вас, браты, ў цярпеньні,
на плячо накінуўшы бушлат.
Працягнула руку без пярсьценьняў
не такую, як ў другіх жанчын,
бо на ёй, мест дарагіх каменьняў,
быў мазоль, чырвоны, як рубін.
І таму вось ў бесканечным горы,
праз тугі прабіўшыся агонь,
маё сэрца з Вамі так гавора,
быццам вы зрадзіліся з яго.
У зацішшы любых нам сялібаў
разам мы сядзелі за сталом,
жытні хлеб, парэзаны на скібы,
запівалі цёплым малаком.
Разам мы надзею гадавалі,
для пакутнай Маці сьветлы дзень,
разам путы Беларусі рвалі,
разам сталі пад нажы цярпень.
І таму, о Рыцары Пагоні,
я аб Вас, зьняволеных, пяю,
сваё сэрца ў мужныя далоні
Вам адным на векі аддаю.

Колькі б гора ні было прад намі,
колькі б цяжкіх ні лягло дарог,
пройдзем імі, калі будзе з намі
еднасьць, згода і Вялікі Бог.
Гэта мы, на славу пакаленьням
у праменнай сонечнай красе,
ў ланцугох цераз усе цярпеньні
нашу волю горда пранясем.
Я сустрэлася з сябрамі не на балі,
разам йшлі да найсьвяцейшых мэт,
адным болем волю здабывалі
Рыцары і верны іх паэт.

## НЯ ЗНАЮ

Ня знаю, я з гора ці з працы,
Ці з лютых, як вораг мой, зім,
Я ўжо не умею сьмяяцца
І плакаць ня ўмею зусім.
Ня краты, ня цяжкасьць аковаў,
Ня штык і ня люты канвой
Зрабілі мой воблік суровым
І душу маю ледзяной.
Я собскага болю ня знаю,
Ад сэрца адорваны сын,
Вось толькі начамі, бывае,
Мне душу трывожыць адзін.
Пот моўчкі сьціраю з аблічча
Ды голаў ўздымаю ізноў.
У нашай зямлі не палічыш
Такіх вось няшчасных сыноў.
Ад сьлёзаў народных разьліву,
Ад гора саломяных стрэх
Замоўк мой калісьці шчасьлівы,
Жаночы, нястрыманы сьмех.
Так, я не умею сьмяяцца,
Праменную радасьць змаглі,
Ўсё ж ўмею як волат змагацца,
Каб людзі сьмяяцца маглі!

## НАШ ШЛЯХ

Наш шлях як ноч, як крыж балесны,
народ ў цярпеньні і журбе.
Наш шлях як радасная песьня,
таму што шлях наш да Цябе.
Праз тундру, скованую лёдам,
гдзе вуснаў замірае ўздох,
наш шлях к табе, як насалода,
як травень у Тваіх садох.
Праз белы сьнег і чорны вугаль,
паўночнай гнаныя пургой,
мы ўсе, з-над Нёмана, з-над Буга,
скрозь боль ідзем к Табе адной.

* * *

Беларусь маю зноў закавалі,
толькі путы навокал зьвіняць,
гіне юнасьць на шэрым Урале,
але праўды — яе не скаваць!
Яе нельга апутаць дратамі,
з цемры ў неба крыніцаю б'е,
яна ў нас, яна з вернымі, з намі,
верце ў праўду, будзеце яе!
За яе непахісна і дружна
рвеце жудасьць кайданаў і крат,
за яе падымайце аружжа,
за свабоду, за сонца для хат!

* * *

Краіна родная, ня плач сьлязьмі крывавымі,
надзеі нашае ў няволі не губляй,
мы сілай, мужнасьцю Цябе яшчэ праславіма,
жаданай воляю пад новы ураджай.
Праменьмі вышлі мы змагацца з сілай чорнаю,
праменьмі яснымі кіруем сонца ўсход.
Заўсёды гордыя і непакорныя,
праменьмі пойдзем мы грэць змучаны народ.
Прайшлі мы тундраю, прасторамі сьцюдзёнымі,
гублялі маладосьць над ломам і кіркой,
каб хмары разагнаць над нашымі загонамі,
каб ўстала сонейка над нашаю зямлёй.
Ня плач, каханая, вярбамі прыдарожнымі,
сьлязамі мацеры, зажураных дзяўчат,
прыдзем мы верныя, заўсёды пераможныя,
вярнёмся з воляю да любых хат.
Уступяць ворагі прад нашай сілаю,
на векі вечныя пакінуць наш парог,
з калень падымецца Айчына мілая,
і будзем з Ёю мы, а з намі будзе Бог!
Праменьмі вышлі мы змагацца з сілай чорнаю,
праменьмі яснымі кіруем сонца ўсход,
заўседы гордыя, як праўда непакорныя,
праменьмі пойдзем мы грэць змучаны народ!

* * *

Калі ноччу дарогай засьнежанай
пойдзеш шчасьце Радзіме шукаць
з грамадою адважных начлежнікаў, —
я ня буду цябе трымаць.

І сьлязьмі на грудзях не зальюся,
хаця гора заслоніць мне сьвет...
Толькі вусны, прыпаўшы да вуснаў,
гарачэйшы пакінуць мо сьлед.

Мо цябе пацалунак ня ўзрушыць,
але верыць ты будзеш усе ж,
што маю палымяную душу
ў бой крывавы з сабою бярэш.

Не зальюся тугой неабмежнай
у адчаі трывожных гадзін, —
калі ўвечар паклічуць начлежнікі,
я скажу табе толькі: «Ідзі».

## УЗВЫШША

Прад намі, мой мілы, узвышша,
глянь, воблакаў сіні плывуць,
з сялянскае хаты Ты вышаў,
каб гэтых высот дасягнуць.
Ня колас, наліты у полі
у ліпні ядроным зярнём,
а воля, народная воля
Цябе ўспалыміла агнём.
Магчыма, што тужыць палоска,
калыша вясьняную рунь,
Табе ж стала цеснаю вёска,
Ты сэрцам абняў Беларусь.
Паны у сябе мы, ня слугі,
ярмо нам адкінуць пара,
вятры зашумелі ад Буга,
такія ж ад хваляў Дняпра.
Гамоняць старыя курганы,
ля сьвежых магілаў крыжы,
аб тым, як замучана, ў ранах
гаротная Маці ляжыць...
Ўсё клічуць вятры па дарогах,
ўсё пеняцца хвалі ракі.
Ідуць здабываць перамогу
з сялянскай сям'і юнакі.
Бо толькі быў, ёсьць і будзе
той варт на зямлі сваёй жыць,
хто хаты свае не забудзе

і волю патрапіць здабыць.
Глянь, сябра, прад намі узвышша,
арлы ў паднябесьсі снуюць,
з сялянскае хаты Ты вышаў,
каб гэтых высот дасягнуць!

* * *

Не хачу быць тваёю жонкаю
На падставе жадань людзкіх,
Хачу песьняй быць яснаю, звонкаю
Твайго сэрца, аднак на міг.
Не такою, навек прыкаванаю
Ланцугом заржавелых праў,
Хачу мілай быць, крыху жаданаю,
Вось такою, як ты шукаў.
Не для рук, а для сэрца створанай,
Не для вуснаў, а лепш для дум,
Каб у час, калі ў сьцюжы і ў горы мы,
Разагнаць твой нявольны сум.
Хачу душу адкрыць табе сьпеўную,
Свае вершы злажыць, як дань,
Каб ты сілу меў, сілу пэўную
Для цярпеньняў і для змагань.
А на заўтра пашто загадываць,
А аб заўтры пашто сумаваць,
Край пакліча, і будзем радам мы
Непахісна ў агні стаяць.
Не для шчасьця я, дружа, створана,
Не для сьмелых тваіх пяшчот,
Бо душа мая непакорная
Знае толькі ідэйны ўзьлёт.
А ты сон гэтай ноччу таёмнаю,
Перапынак ў цяжкім шляху,
Летуценьні душы мае ўтомленай
Без надзеяў і без граху.

Але ўсё ж, пакуль сум над старонкаю,
Ланцугі на руках тваіх,
Хачу песьняй быць яснай і звонкаю
Твайго сэрца — аднак на міг.

## КАХАЦЬ

Глянь, месяц спыніўся на сіняй мяжы,
Прашчаецца доўга з зарой-зараніцай.
Паволі зацягваю пояс тужэй,
Гарачай рукою бяру рукавіцы.
Сягоньня прыдзецца спаткацца з пургой,
За вокнамі вецер. Ну што ж, мы гатовы.
За вахтаю недзе чакае канвой,
Такі, быццам тундра, дзікі і суровы.
Шкадуеш? — Магчыма; ня трэба, аднак, —
Цяпер ужо словы твае не сагрэюць.
Душы не прывабіць спакойны барак,
Калі мая доля — пурга і завея.
Мяне не ацэпліць ў смуту гэтых дзён
Грашовае полымя ціхае сьвечкі.
Распальвае грудзі інакшы агонь,
Натхнёнае ласкі — сьвяты і адвечны!
Стараешся ў лёце спыніці сястру,
Разьлівам пачуцьцяў яе дакараеш,
Ты хмарамі сонца гатоў загарнуць
За тое, што, можа, засільна кахае.
Змагацца, дык шчыра, на поўны уздым,
Памерці, дык горда, за волю і славу,
Калі пакахаць, дык пачуцьцем такім,
Каб шэрую землю расплавіць на лаву!
Ў палётах ня чуці граніцаў, ні пут,
Натхнёнаю сілай парываў бурлівых
З халоднага неба прыклікаці цуд,
Даць шчасьце далёкім, пакінутым нівам.

Кахаць — гэта кінуць сябе на аўтар,
То выкаваць веліч ідэяў у чыны,
То попел падзеяў разыскрыць ў пажар,
Каб немагчымае стала магчымым!
Кахаць — гэта гора мільёнаў адчуць,
Самой не заплакаць ад полымя болю,
Кахаць — гэта мэты свае дасягнуць,
Ў жыцьці маім гэта — Айчыне даць волю.
Ля Горадні сівай ёсьць сонечны кут,
Такі сабе жытні, шырокі, звычайны,
Начамі пахучы, як бэзавы куст,
І сэрцу майму дарагі да адчаю.
Вясна там іначай на межах цьвіце,
Там вецер у полі цясьней абнімае,
Учадзелі думы у гэтым куце
У траўневы вечар, і рады нямае.
Там юнасьць мая пагубляла сьляды,
Кранулася сэрца дзіўное каханьне,
Там, зоры пакінуўшы, месяц бляды
Няраз на руках дагараў да сьвітаньня.
Радзіліся песьні з курганаў старых,
Ўздымаліся крыльля да ясных узьлётаў.
Там плакалі песьні ня раз да зары
Над доляй Народу цяжкой і гаротнай.
Там сонейка ў поўдзень і месяц ўначы
І Нёмнавых хваляў чароўная сіла,
Бабуся старэнькая, лён прадучы,
Паэтку так моцна кахаць навучыла.
Ў пургу, ў непагоду, ў цяжар гэтых дзён,
Калі у цярпеньні мне душу калечаць,
Распальвае грудзі вялікі агонь
Натхнёнае ласкі — сьвяты і адвечны!

Сумую? — Магчыма. Усё ж не пытай.
Выходзім, хтосьць кажа. Цясьней зашпіліцца.
Б'е вецер. Сьмяюся. «Пакуль што бывай!»
Ага, не забыцца б хаця рукавіцаў.

## КРЫЛАТЫ

Шырокім размахам хвалюючых крыл,
апаўшы ў даліны з паднебных палётаў,
арол мне уральскае сонца закрыў,
чырвонае сонца над тундрай гаротнай.

Вузкі і шырокі стаў дум маіх край
ў пачуцьцяў сваіх палымяным разгоне.
Я з ім сустракаю надходзячы май,
чакаю з-пад хмараў яго на сутоньні.

І сэрца маё замірала ня раз
ад бляску маланкі і грому удараў
аб ім, найдарожшым. А ён у той час
адзін калыхаўся на вогненных хмарах.

Ён з бураў варочаўся, як з перамог,
заўсёды магутны, прыгожы і сільны,
хоць раны ад віхру балелі ў грудзёх
і кроплі крыві дагаралі на крыльлях.

Я дотыкам вуснаў лагодзіла боль,
душою, што радасьці меры ня знае, —
ўспрымала пачуцьцяў арліных прыбой,
як вольную песьню радзімага краю.

Я гладзіла пер'і, сьціраючы кроў,
я сыпала краскі на гордыя крыльлі,
і, чуючы сэрца арлінага зоў,
ад сьмелых пяшчот замірала бясьсільна.

Так часта з-пад неба арол прылятаў,
сумны адзінотай, ўсхвалёваны боем,
і, крыльлем магутным абвіўшы мой стан,
ў край думаў міражных адносіў з сабою.

І я пакахала ягоны палёт, —
гдзе можна у хмарах з арламі сустрэцца, —
і сінь чарадзейных прыгожых высот,
і верныя грудзі, і сьмелае сэрца.

...Адных Бог для шэрых далінаў стварыў,
другім даў гняздо на убогай сасонцы;
мне ж сілаю духа праменнай закрыў
арол назаўсёды і неба, і сонца.

## ШАХЦЁР

Тае сьнег на шляхох і дарогах,
сохнуць лужы на цеплым вятрэ,
дрыжаць вусны вясьнянай трывогай,
сонца душу ў абдымкі бярэ.
Можа быць, незадоўга прыдзецца,
не сустрэўшы цябе, ад'язджаць,
буду моўчкі, спыняючы сэрца,
табе хустачкай белай махаць.
І вятрам раскажу на чужыне,
прашапчу у нячулы прастор
я ня раз твае мілае імя,
мой апутаны дротам шахцёр.
Ня раз ў ноч, як палі Беларусі,
як вясьняныя косы бяроз,
мне прысьняцца салёныя вусны
і пралескі рассыпаных сьлёз.
Цяжка долі суровай пярэчыць,
калі ў вочы глядзіць аўтамат,
буду верыць у радасьць сустрэчы
ля радзімых замучаных хат.
А калі будзе нельга сустрэцца,
буду думаць, сыночак, усе ж,
што хоць ты сваё вернае сэрца
Ёй, пакутнай, як дар прынясеш.
Бо хачу, каб Цябе калісь, мілы,
за твой юны, змагарскі парыў
Беларусь, як сястра, прытуліла
пахам ліп, песьняй хваль, шумам ніў.

А цяпер, калі зноў катаржане
будуць моўчкі у даль ад'язджаць,
Табе, верны мой, на разьвітаньне
буду хустачкай белай махаць.

* * *

Перастань, не траві мяне ядам
сваіх словаў, ад іх не умру,
захачу, і пасыплюцца градам
твае сьлёзы на бель маіх рук.
Не зьбірайся пісаць мадрыгалы,
і ў магіле патраплю я жыць,
трэба тысячу кобравых жалаў,
каб біцьцё майго сэрца спыніць.
Больш цяпла, чымсьці яду у зьмея,
ў маім сэрцы, што вораг ня змог,
абагрэць нават гада умею
негай слоў на ласкавых грудзёх.
Зьверу лютаму гледзячы ў вочы,
ўмею душу так аздаравіць,
што да сьмерці ён піць не захоча
беларускай, нявіннай крыві.
Я ня раз ужо выпіла брагу
у баі на жыцьцё і на сьмерць,
мне шкада твае, сябра, намагі,
ўмею піць, але і не п’янець.
І таму не паі мяне ядам,
іншай дай сваю ліру і сьпеў,
гдзе ты бачыў, каб ястраб, ды разам
з беспакойнай арліцай прысеў.

* * *

Можна сэрца жывое пакласьць на агонь
Ці мячом разрубаць на палову,
І таптаць, і тыраніць ў няволі яго,
І ня вырваць патрэбнага слова!
Можна піць з яго кроў, хто ня знае пра жаль,
Ды паганіць яго без прычыны.
Ўсё ж яго не зламаць, як шляхотную сталь,
Калі гэта ёсьць сэрца жанчыны.
Йду адна. Прада мной расьсьцілаецца ноч,
Вецер думы кіпучыя студзіць.
Зьдзек чужацкі, як добра адточаны нож,
Вастрыём упіваецца ў грудзі.
То пячэ як агонь, то марозіць як лёд,
Непакоіць, і мучыць, і раніць.
Зьдзек варожы кругом, як наежаны дрот,
Што апутаў мае існаваньне.
Ўсё ж ня зломлены дух і ня склонены стан,
Не дастаць ім да гордага сэрца,
Прыдзе сонца, абман ападзе, як туман,
Але праўда — яна застанецца!
Я ня гнуся ў палоне, ня знаю, што страх,
Не палохайце словам, ні чынам.
Не ўздрыгне яно нат ў найстрашнейшых руках —
Беларускае сэрца жанчыны!

## УСЁ РОЎНА

Ўсё роўна мне, ці сьмерць, ці перамога,
ці цесны гроб, ці песьня у саду.
Ўсё роўна мне, я са свае дарогі,
з дарогі праўды сэрцам не зыду!
Ня дом, а лагер, не пасьцель, а нары,
кругом натоўп, а чалавек адзін,
нават ня сон, а толькі солад мараў,
далёкі і балючы успамін.
Ўжо шэсьць гадоў, як пад замком іржавым
такія ж йржавыя плывуць за днямі дні,
і боль наш служыць злыдням для забавы,
і сьвятасьць праўды топіцца ў хлусьні.
Забыты сьмех, тут сум у кожнай песьні,
ў зьдзічэлай тундры вечны плач бяз сьлёз,
на крыльлях дум сьляды цярпень, як плесьня,
ў вачах усё, што ў горы перанёс.
І цемень прорвы, жах ад праўд расьпятых,
і ўзьлёт надзеяў ясных праз драты,
і сум з таго, што мест пяра лапата,
і жаль з таго, што мучацца браты.
Той самы штык учора, сёньня, заўтра
ў руках людзей, якіх малітва — зьдзек,
той самы бой з той сілаю упартай,
з якой жыцьцё ратуе чалавек.
Ня раз душа зьляцела б з сумных вуснаў,
лягла б падбітай птушкай на мароз,
калі б ня тое, што для Беларусі
назначыў йсьці такой дарогай лёс.

## НА МАГІЛУ З.К.

Ты выбачай, што мы цябе так плытка пахавалі.
Ня стала сіл дзяўбці прамерзлую скалу.
Ламы і кіркі ўжо тупымі сталі,
а ў доле па калена я ўсяго стаю.

Мароз за сорак. Узмакрэлыя ад поту,
аблізваючы губы смаглым языком,
халодны сьнег сухім хапаем ротам
ды кіркам і ламам спакою не даём.

Крыху глыбей яшчэ, каб гаспадар таёжны
вясной тваю магілу не разрыў,
у дол цябе мы без труны паложым,
ты на труну, бядак, не зарабіў.

Не падышоў табе «бушлат дубовы»,
а гарнітур хэбэ капцёршчык закасіў.
Ў кашулі, споднiках у дол гатовы
цябе на адпачынак палажыў.

Ня будзе тут табе фанфараў і салютаў.
Сьлёз разьвітальных па табе не праліюць.
Пурга завые толькі над прамерзлым трупам,
а ўлетку мо алені часам забрыдуць.

Прывяжам бірку мы табе з фанеры
на твой вялікі палец наназе,
каб там Пятро, у рай адкрыўшы дзьверы,
адразу бачыў, хто гэта брыдзе.

Бывай, зямляк, у траурным маўчаньні
мы над магілай ціха пастаім.
У галавах табе яшчэ паложым камень,
няхай стаіць ён помнікам нямым.

## ВЕЧАР

Вось ідзем праз тундру, беразьняк убогі,
нат сьляды аленяў сьнегам замяло,
толькі моўчкі тужаць белыя разлогі,
у далі агеньчык нагадаў сяло.
Так іду ў задуме, летуценьняў пражу
на праменьнях зораў, месяца сную
і ня чую нават з аўтаматам стражаў,
што бяруць на мушку галаву маю.
Вось, здаецца, побач каўзанулі сані
і званочак недзе, плачучы, замёр,
быццам бы паслаў мне нехта прывітаньне
з раненага сэрца ў ледзяны прастор.
Не спугнулі птушкі, не спаткалі зьвера,
нат дарогі заяц нам не перабег,
і ніхто з сялібы, адчыніўшы дзьверы,
не паклікаў родным словам на начлег.
І павісла сэрца сьлёзамі на зорах,
ды, узьняўшы крыльлі, як бунтарны птах,
паляцела ў неба цёмнае з дакорам
за цяжкую долю, за пакутны шлях.

## ДОЖДЖЫК

Я ня плачу, то вербы у тундры шумяць,
як калісьці вятры ў картафленьні,
я ня плачу, ня плачу, ня цешцесь дарма,
гэта падае дожджык асеньні.
І расою змывае сьляды маіх ног,
ляціць градам на белыя шчокі,
то ня вырваўся з сэрца, з нутра майго ўздох,
гэта водгульле з шахтаў далёкіх.
Не ад болю мне сінія вочы блішчаць
і гарачкаю спалены вусны,
як каменьні на полі, умею маўчаць,
і ня страх мне зьмяіных укусаў!
Не пад сілу цярпеньне — пад хмары ўзьлячу,
там, гдзе сонца любоўна сьмяецца.
Будзе слухацца нават, калі захачу,
і маё неспакойнае сэрца.
Я ня плачу, то вербы у тундры шумяць,
ные вецер на моху аленім,
то ня сьлёзы дакорам ў вачах мігацяць,
гэта падае дожджык асеньні...

## УСЁ Б'Е Ў ТВАР

Усё б'е ў твар пакутны лёс,
яшчэ не дахлястаў...
За пазухай мой хлеб замёрз,
як камень цьвёрды стаў.

Ім не сагрэцца ў гэты час,
зубоў нат не ўстраміць.
А ўдома хтосьць чакае нас,
і трэба, трэба жыць.

Гдзе глянеш, белай тундры даль
і вышак грозны цень,
і неба шэрае, як сталь,
і лес, што не расьце.

Усюды штык, усюды дрот,
а ўгору не ўзьляцець,
адно, што тут без перашкод,
вось гэта: летуцець.

Ёсьць недзе край, і людзі там
за нас мо п'юць віно,
прамовы льюць па вечарам,
а нам тут халадно...

Ёсьць недзе дом, і сьвяты стол,
і сіла у руках,
далі б і нам на хлеб і соль,
каб не адвечны страх.

Затое ў нас яго няма,
нам сэрца не дрыжыць.
Нас мучаць голад, зьдзек, зіма,
а ўсё ж мы *будзем жыць*!

* * *

Гнаны холадам, гнаны ветрам,
Шляхам тундры у ноч пустым,
Прабіраецца пяцьдзесят чацьверты
За наежаныя драты.
У каго надзея блукае,
Хто застыў, але не на сьмерць,
Няхай верыць, няхай чакае,
Няхай выйдзе яго сустрэць.
Толькі чаркі нашы пустыя,
Мы забыліся смак віна.
Ну, а сьлёзы? — Нават і тыя
Ужо выпітыя да дна.
Йдзе прывід, чалавек цярпеньня,
Ўсе гады пад штыком прайшлі,
А другія такія цені
Ў гэту ноч устаюць з зямлі.
Сорак першы, другі, сорак трэці,
Пяты, шосты, пяцьдзесят другі,
Дань для тундры, шахтаў, для сьмерці
Жывых душ. За чые даўгі?
О, калі ж Ты прыдзеш, жаданы,
Залаты і шляхотны век,
Каб галінкай сьвятое пальмы
Чалавека вітаў чалавек?
Дык сьмялей, Брацьця, супраць ветру,
Яшчэ доўга трэба стаяць.
Йдзе сьнягамі пяцьдзесят чацьверты,
Але выйдзем яго спаткаць.

Няхай ўбачыць, няхай пачуе
Голас ценяў, учора нямых.
А не — схопімся з ім уручную
За жыццё для усіх жывых!

## ЛЁС

Лёс ударыў ў жыцьцё маё долатам,
Брызгі сінія ўпалі з твару,
Пакацілась абломкамі золата
Са сьцюдзёных, зьняволеных рук.
Ўсё жыцьцё засталося за брамаю,
Выпіць чару прышлося да дна.
Цяжка быць Беларускай і мамаю,
Даруй, сыну, цярплю не адна.
Часта ручкі малыя мне сьніліся,
Як змагаюць жыцьцёвы цяжар.
Ўрэшце, хлопча, мы ж дагаварыліся
Злажыць ўсё на адзіны аўтар
І дайсьці да супольнае мэты,
Боль губляючы свой ў барацьбе.
Знаю, будзеш сьпяшаць да мяне Ты
Так, як я буду жыць для Цябе!
Зьнялі крыжык малы з мае шыі.
Божа, толькі чакаю, калі ж
Так, як гэты драбніцы сьвятыя,
Здымуць свой мне з плячэй яны крыж,
Пад якім я дастойна ступаю,
З Божай помаччу не заламлюсь,
Бо нясу яго горда для Краю,
Бо цярплю пад ім за Беларусь!
Ўзялі персьцень. Мой Краю замучаны,
Я ж ня знаю, ці быў ў мяне Муж,
Я з Табою на векі заручана,
Верна толькі Табе аднаму!

Для Цябе, для народнага заўтра,
Шматпакутны, над ўсё дарагі,
Я стрываю дастойна і ўпарта
Усе ўдары паўночнай пургі.

* * *

Помню Прагу, вясьняныя сьвяты.
Адхіляючы цюль ад вакна,
з поўнай чарай, да сонца паднятай,
я стаю у задуме адна.

І пад шум дарагіх лімузінаў,
галаву адкланіўшы назад,
п'ю за нівы, лясы і даліны,
п'ю за шчасьце пакінутых хат.

Задрыжэла крыштальная чара,
сэрца болем туга заліла.
Беларусь дарагая, ня дарам
я Табе свае дні аддала.

Сёньня ў думах Цябе я вітаю,
п'ю салодкую чару віна.
Можа, заўтра бяз скарг, дарагая,
за Цябе вып'ю горыч да дна.

Поўнач. Сьцёжа. Вясьняныя сьвяты.
Цераз бераг аж пеніцца боль.
Прада мною кірка і лапата,
але думы заўсёды з Табой.

Жоўць спаліла мне горыччу вусны,
але чара ня падае з рук.
За здароўе сваёй Беларусі
я яе падымаю ўгару.

Як калісьці сьвятое Прычасьце
з яснай чашы ля царскіх варот,
п’ю свой боль, як вялікае шчасьце,
за каханы крывіцкі народ.

* * *

Востры боль пранізаў навакольле,
Горай зьвера тупы чалавек.
Толькі б мець непахісную волю,
Магутнейшую волю за зьдзек.
Не падходзьце! Я сёньня малюся,
Сьвятой сілы ў грудзёх маіх брак,
З маіх болем заціснутых вуснаў
Нават слова ня вырваць ніяк.
Уздымаюцца брудныя хвалі,
Неспакойны варожы бярлог,
Ўжо ня раз яны пенай апалі
Ля маіх, ля зьняволеных ног!
Не баюся няроўнасьці бою,
Што адна супраць цемры стаю,
Што мне душу атрутаю пояць.
Я жа знаю, за што яе п'ю!
Я стрываю. Цярпеньне ня скосіць.
Прайду, голаў падняўшы ўгару.
Мне Эстонка дае папяросу.
Дзякуй, мілая, я не куру.
Недзе там, ў цені дрэваў кудлатых,
Гдзе мая не даходзіць нат весьць,
Ёсьць старыя, каханыя хаты,
Вось бы там на хвіліну прысесьць.
І душою, параненай горам,
Праляцеўшы праз цемень і сінь,
Праз дзікія, чужыя прасторы,
Ўбачыць землю, гдзе ходзіць мой Сын...

* * *

За Урал ўпала сонца, бы зарава,
Залатымі праменьмі аб лёд.
Я сную сваё сьмелае марыва,
Як крылун з недасяжных высот.
Толькі ймкнуцца думы міражныя
Летуценьнем сваіх дарог.
Замянілі мне волю стражаю,
А лапатай маё пяро.
Праз марозную сінь бясконцую
Я сьнягамі да Вас брыду,
Не з падбітай душою, а з моцнаю,
Бы з мяцеліцай радасных дум.
Не сьпяшу я да Вас за помаччу,
Іскры духа у вачах блішчаць.
Я іду беласьмертнай поўначчу
Руку сьмелую Вам падаць.
Іду тундраю заінелаю
Жарам слоў Вашы дні сагрэць.
У жыцьці маім не умела я
Нат ў мучэньнях пакутна тлець.
Мае думы сягоньня, як зарава,
Прабіваюць наежаны дрот.
З паднявольля ўзрываюся марывам,
Як крылун з недасяжных высот!

## ДАЛЁКА АД РОДНАГА КРАЮ

Далёка ад роднага краю,
ў бязьлітаснай сьцюжы на дне,
гдзе сэрца ад болю ўздрыгае,
ты там падышоў да мяне.

Ў час люты вось гэтае сьцюжы
з цярпеньня Твайго і братоў
зрадзілася блізасьць, мой дружа,
пад ценем калючых дратоў.

Ў дакор ўсім прыгнечаным, сумным,
хацелася сонца кахаць,
шапталі яны: «неразумна
пачуцьцем рэжым нарушаць»...

Дзень цяжкі і вечар галодны,
трывожная, цёмная ноч,
б'е вецер, адзіны свабодны,
са злосьцю ў малое акно.

Ня ўсеялі цьмяныя зоры
халоднага неба загон,
адны толькі ходзяць канвоі,
трывожаць нявольнічы сон.

У цемры ачэй не ступаю
адважна ў варожай цішы,
бунтарныя песьні складаю
з такой жа бунтарнай душы.

А заўтра йзноў дзень на парозе,
галодны, ў пурзе над кіркой,
штыком, аўтаматамі грозіць
ўсім думам свабодным канвой.

І кожны узмах мой лапаты,
і кожны удар мой кіркі
быў там прывітаньнем для брата,
для друга усьціскам рукі.

Праклёнам быў тым, што гадамі
бяздушна вялі замярзаць
і гналі з аружжам прад намі
замерзлую тундру капаць.

І ў вір беласьнежнай мяцелі
бязьлітаснай сьцюжы на злосьць
з-пад лома нат іскры ляцелі,
а з імі жыцьцё, маладосьць.

Паслухай, ў нас дружба ня тая,
што ў лесе, ў палёх, над ракой
вясёлае сэрца вітае
вясны бестурботнай парой.

Яна ў нас ідзе з успамінам
апутаных дротам хвілін
і дзён, гдзе даўно бы загінуў
бяз моцнага слова: «ня гінь»...

Бяз братняга слова: «ня дайся,
каб сьлед наш закрылі сьнягі»,
бяз шчырага слова: «мужайся,
сільнейшаю будзь ад пургі».

Там недзе над мілаю Шчарай
ў тумане ціхіх вечароў
бярозы дзявочыя мараць
аб тым, што вярнемся дамоў...

І йзноў ў цемры ранкаў халодных
маўклівыя, строга па пяць
ідзем бесканечнай калонай,
а братнія словы зьвіняць.

Якойсьць нерэальнай надзеяй
ці казкай з дзіцячых гадоў
ўсё ж грэюць, нясказана грэюць,
і дух падымаецца йзноў.

Йду горда насустрач надзорам,
канвоям, нярадасным днём,
гляджу на іх сьмела з дакорам,
і ўсе адступаюць кругом.

І знаю, што сіла ня ў долі,
ня ў тым, што згарае ў агне,
што ломіцца сьцеблем ў няволі,
а сіла ў змаганьні, ўва мне!

Што сіла ў сяброўстве, ў каханьні,
у вернасьці нашым шляхом,
якімі ідзем без хістаньня
на помач нявольным братом,

што сіла у шчырасьці, ў дружбе,
ў пачуцьцях тваіх і маіх,
што сьмела гарэлі у сьцюжы
і моцна трымалі другіх.

## ХТО?

Хто боль мой ўвесь зьбярэ і ў словы згорне,
той жаль душы, якое не змаглі?
Жыцьцё маё — агарак сьвечкі сёньня
на аўтары пакутнае зямлі.
Крывавіў боль, надзея палымела,
сплывалі сьлёзы воскам на аўтар.
О Беларусь, мой галубочак белы
ад чысьціні нязьлічаных ахвяр.

## З МІНУЛАГА

Сілаю ў сеці злоўлена,
краты ўсё і ланцугі.
Сэрца маё перапоўнена
горам праз берагі.
Крыўда ўзьвіваецца полымем,
здаецца, з прадоньня пяшчэр.
З пекла упала на голаў мне
ўся гэта СССР.
У змаганьні, ў цярпеньні за кратамі,
адна, заўсягды адна,
у праўдзе сваёй заўзятая,
рукі ламлю да відна.
Скаргі, аднак, ня вымаўлю,
болю ня знаю, бадай,
выцерплю, ў Бога я вымалю
волю табе, мой Край!

•

* * *

Ізноў ўсё навокал, што сэрцу няміла,
Па жылах цячэ неспакой,
Паэт распраўляе, натужвае крыльлі,
Каб вылецець ў новы бой.
Жыць бы, як людзі, і сеяць на гонях
Аберуч нам хлеб і любоў,
Страх каб ня поўзаў крывавым сутоньнем
Ля сэрцаў і ціхіх дамоў.
Каб кожны адчуў, калі сонца засьвеціць,
Свабодна тварыў на зямлі,
Ля бацькавых рук каб ўздымаліся дзеці,
Каб з матчынай мовай жылі.
Супраць паэтаў насільле і краты,
У сэрцы народу ўвесь боль,
А ў тых, самаўласных, расшчэплены атам —
Будзе няроўны бой...

* * *

Ў горы я над Тваімі ранамі...
Божа, болей Цябе не карай,
старажытны, любы, каханы мой,
вечна скованы, родны Край!

Мой курганны, жытні, зубрыны мой,
вытрывалы ў агні пакут,
Еўфрасініи сьвяты, Скарынавы
беларускі адвечны кут.

Ломяць віхры збуялае, кволае,
мінаюць цьвярдыя камлі.
Прашумелі яны над сёламі,
Твой пакінуўшы сьлед на зямлі.

Воблік Твой і адвечную мову,
літасьць ў сэрцах і лад стары
не крануў нат віхар суровы
у балотах ды у бары.

Сьвітка наша, льняная кашуля
не здала свае мовы ў палон,
затуліла яе, прыгарнула,
захавала да сёньняшніх дзён.

Калі зноў агартае нас цемра,
мы ўцякаем душою ў сяло,
бо прывыклі мы чэрпаць аберуч
у народу жывога сьвятло.

## ВОЎПА

Воўпа. Дамоў ўжо няма прывычных,
замест царкоўкі стаў клуб грамоздкі.
Ў старым мястэчку недруг ўсё зьнішчыў,
зрабіўшы вёску.

Так, як калісьці, луг зелянее,
сьцежачка ўецца, кліча дадому.
На небасхіле хмары прыселі,
як ад утомы.

Мінаю вёску, сьцелецца поле,
перад вачыма ўстае араты,
як з лет дзяцінных голасам родным
кліча дахаты.

Схапіўшы сэрца аберуч з гора,
загадам волі йду на гасьціну.
Вецер мне толькі нешта гавора,
адзін ў пустыні.

Пытаю поля, пытаю дрэваў,
пытаю неба, нават каменьняў:
гдзе жа ўсе тыя, к каму я сёньня
йду ў задуменьні?

Зямля ня знае, зямля ня помніць.
Сюдой вякамі, гэтай дарогай,
сто пакаленьняў прайшло ў няпамяць.
Было іх многа.

Зямля ня тужыць, зямля ня плача,
горычы ўтраты, болю ня знае,
на папялішчы, дзярні магільным
йзноў зацьвітае.

Прытуліць сэрца, прыгорне косьці,
ў казкі і песьні зьбярэ надзеі,
і з маладосьцю з суседняй вёскі
йзноў маладзее...

* * *

Над народам ўсё чужыя «босы»,
Каму «на» у іх, а каму «не»,
А народ, як рыба безгалосы,
Моўчкі шыю перад імі гне.
А народу сьніцца сваё поле,
Што і ён удома гаспадар,
А народу часам сьніцца воля,
Як нябёсаў найсьвяцейшы дар.
Усё сьніцца, што ён сам засее
На вясну свой хлебаробны край,
Ды пад сонцам вырасьце надзеяй
Блаславенны, ўласны ураджай.
Песьня сьніцца родная і мова,
Што ад маці з малаком ўвабраў,
І бясёды вечарам зімовым,
Клопаты ля гаспадарскіх спраў.
Працаваць, было б на чым, ня цяжка,
Зажынаць сваё яшчэ лягчэй,
І здаецца ўсё далёкай казкай:
Гаспадарка, чарада дзяцей.
Сёньня дзеці ў сьвет ідуць і гінуць,
Не туды адзіны сын пайшоў.
Нат імя няма каму пакінуць,
Стала пуста на зямлі дзядоў.

* * *

Не пазнаю цябе, мой Краю,
Нявечыць людзкасьць лад чужы,
І прадзедаў зямля чужая,
І толькі нашыя крыжы.
І толькі нашыя магілы,
Старыя ў полі курганы —
Няўжо й мінуласьць нашу скрылі
Пад тоўстым насыпам яны?
Чужым нам ў сэрцы цэляць словам,
Каб насьмерць роднае забіць,
Лучынай гасьне наша мова,
Чужая — лагерам гучыць.
Ад сухавеяў, што з усходу,
Плытчэе Нёман ў берагах,
Душа малее у народу,
Мрэ песьня, як падбіты птах.
Ў няволі крыльляў не разгорне
Ні птах, ні песьня, ні душа.
Нат белы дзень здаецца чорным,
Хоць быў жа сонечны сьпярша.
Чужы палон, прыгон адвечны
Махлярствам душы гне і злом,
Ніжэй ўсё нам згінаюць плечы
Нейкім нябачным бізуном.
Стаяць над намі ўсе чужыя
Ды сьцёбаюць да працы нас,
Як быццам страшнага Батыя
Вярнууся незабыты час...

* * *

Толькі вятры гамоняць на курганах,
Начны збудзіў іх зо сну халадок.
Наш край быў калісьць, як вясна, расьпяяны,
Сёньня ж у путах сурова замоўк.
Падбітая песьня ў зьняволеным целе,
За мову, за песьню нас мучаць, нас б'юць...
Душа, як пажаты загон, апусьцела,
І вусны ня тое, што сэрца, пяюць...

* * *

Беларусь маю гора, як каменем,
да магілы народнае гне.
Чы ж бы ўсе яе дзеці каханыя
палеглі на шалёнай вайне?
Возьмеш жменю зямлі беларускае
з партызанскіх, змагарных шляхоў,
ўшыр і ўздоўж па краіне раструшчаных, —
а яна ж як запечана кроў.
Ёй бы сёньня, касьцямі усеянай,
за сыноў сваіх мужную сьмерць
быць бы слаўнаю, быць непадзеленай,
роднай мовай і шчасьцем квітнець.
Адступіў пераможаны вораг,
абаронцам палеглым ня ўстаць.
Іх магілы з глыбокім дакорам
ў беларускае неба глядзяць.

* * *

Прайграў вайну народ-змагар.
Мо ваяваць ня ўмеў...
Схаваў ў далоні сумны твар,
у сэрца ж люты гнеў.

Малітвай сонца не вітаў,
ня дбаў, які ўраджай,
паўночны ж вецер хмары гнаў
на паднявольны Край...

Ўсё сьніўся вольных песьняў хор,
засеяны загон,
багаты йзноў сялянскі двор
з тых беспрыгонных дзён.

Ды дарам, ціха сьпіну гнуў,
як наш граніт, маўчаў,
зрываўся толькі ён са сну,
шукаў рукой мяча

і пружыў грудзі, як змагар,
пад сэрца люты гнеў,
пад крыўды боль, пад волі жар,
пад помсты дзікі сьпеў...

* * *

Далі ёсьць далі, і лёс наш круты,
І нам ўжо з табой не сустрэцца,
Ўсё ж чую праз гэтыя далі, браты,
Як вашыя тужаць сэрцы.
Сьніцца Вам край найцяжэйшых пакут,
Адвечны наш лад гаспадарскі,
І хоць бедны прыбыткамі дзедаўскі кут,
Ўсё ж багаты нясказанай ласкай.
Сягоньня іначай, камбайны кругом,
Не пяюць надвячоркамі жнейкі,
І большая крыху, цяжэйша зярнём,
Хоць не свая ужо жменька.
Сягоньня іначай, ня тое сяло,
І доля і мова ня тая,
Адвечнае наша дабро і цяпло,
Аднак, у душы не згасае!
А згасьне — зьдзічэем, загінем тады,
Ад роду ня нам адыходзіць,
Любоў, быццам сонца, ратуе з бяды,
Зямля нат бяз сонца ня родзіць.
Ня клічам вас воляй, яе ў нас няма,
Зямлі ў нас няма, ні багацьця,
Адно засталося нам: продкаў імя.
Імем роду мы клічам вас, брацьця!

* * *

Пуста ў сядзібах бывае сягоньня,
анямелі яны без пары,
на парослых сьцяжынах сутоньнем
бродзіць сум і гуляюць вятры.
Шумяць дрэвы, схіляюцца нізка
у паклоне маўклівай зямлі,
ёсьць у кожнага з нас калыска,
сьвяты кут, гдзе бацькі жылі.
Першых словаў, пазнаньня праменьні,
цеплыня мілых матчыных рук,
крэсла пэўнае: бацькі калені,
дабрыня любых сэрцаў наўкруг.
Родны кут наш, сям'я дарагая,
гдзе нам кожны прыхільны і рад,
гдзе кахаюць, чакаюць, вітаюць,
калі вернемся з даляў назад...
І хоць ўдома няма ўжо нікога,
зьнішчыў род акрываўлены час,
думкі ймкнуць да старога парогу,
быццам ўдома чакаюць на нас...

* * *

Воўны белае пасмачкі кволыя
з хмар кудзеляў вятры прадуць,
на палёх белы кужаль пад сёламі...
Не. Па сёлах даўно не прадуць.
Не снуюць вечарамі, ня мараць
ды ня ладзяць забытых красён,
калі бачаць старое прыладзьдзе,
даўніну ўспамінаюць, як сон.
Гэта сьнег, першы подзьмух зімовы,
па дарогах сумёты растуць,
не палотны, ня кужаль вясковы,
ў нас па сёлах даўно ўжо ня ткуць...
З ціхай сьцежкі жыцьцё саступіла,
шэрых досьвіткаў ў хатах няма,
не майструе грабель і цапільняў,
на таку не малоціць зіма.
Не патрэбныя сьвірны, ні гумны,
старых песьняў зямля не пяе,
крыху сумна, а можа, ня сумна,
новы час сумаваць не дае...

* * *

На зямельцы дзядоў нашых, прадзедаў
Промень сонца ад хмараў пагас.
Рвецца кволае, тонкае прадзіва
Роднай мовы, сьвятое для нас.

З найстарэйшых крыніц і вытокаў,
З болю нашага, з сэрцаў цяпла,
З летуценьняў дзяўчат сінявокіх
Яна песьняй па жылах цякла.

Варкавала, кахала, тварыла
Неўміручыя скарбы жыцьця
Ды надзею з сэрцаў нам біла,
Калі лёс нашы крыльлі падцяў.

Ад зямлі нашай тонка-льняная,
З ясных рэк і бясконцых дарог,
І спрадвечная і маладая,
Ператканая сонцам ў палёх.

Роўня з думаў высокіх прыбоем,
Не ўступаеш зьмястоўна другім.
Толькі ты яшчэ пахнеш вясною,
Звоніш коласам ў полі тугім.

Вабіш гронкамі сьпелай рабіны,
Ўмееш словы, бы крыльлі, разьняць,
У табе ціхі шум жураўліны,
Калі ў далеч з-над Нёмна ляцяць.

Ў табе сілы адвечнай закляцьце
У жывым яшчэ сэрцы сяла.
Сьвятасьць словаў пяшчотнае Маці,
Што навекі ад нас адыйшла.

Мовы роднае звонкае прадзіва,
Благаславенны і творчы агонь,
Векавечная спадчына прадзедаў,
Ніці з сэрца Твайго і майго.

* * *

Нас, забітых, загнаных на сьвеце,
Навучалі бацькі ад веку:
Найвялікшая мудрасьць, дзеці, —
Быць, застацца ў жыцьці чалавекам.
Няхай сэрцы, быццам крыніцы,
А сумленьне — чыстае неба,
Нельга злу, няпраўдзе карыцца,
Калі нават бракуе хлеба.
Хлеб крапіўка, бульба заменіць,
Зямля згінуць ня дасьць, як Маці.
Людзям страшна тых, без сумленьня,
Хто ўжо твар чалавечы страціў.
Не люблю землякоў «асьвечаных»,
Што на ўсё пазіраюць сонна.
Далягляд іх рублямі адмечаны,
На пярэдзі — свая пэрсона.
Нат мінуласьць зямлі адкінулі,
Цяжкі лёс па-іхняму «цёмны»,
Не за праўдаю, а за сілаю
Йдуць, як тыя сыны бяздомныя.
Над іх лёсам думаю сёньня я...
Нат сумленьне за грош разьмянялі.
Разумелі мяне брацьця «цёмныя»,
«Асьвечаныя» мяне прадавалі.
Неба хмарылася ўжо з раніцы,
Ўсё ж мы ведалі: сонца будзе!
Гультаі прападалі і п'яніцы,
Выжывалі чэсныя людзі.

Продкаў спадчына — скарбы вялікія:
Працавітасьць наша, сардэчнасьць,
Гарады старыя, шматлікія,
А найбольшы скарб — чалавечнасьць.
Што багацьце, што «веліч» дутая,
Калі страціў сваё аблічча,
Калі з брацьцямі не пакутаваў,
Калі нелюдзем цябе клічуць.
Многа гора ў жыцьці пазналі мы,
Цяжкі быў наш народны будзень,
Усё ж ня дарам людзі казалі нам:
Беларусы — гэта ёсьць Людзі!

* * *

Кажуць — добра, а мне нядобра:
Я ня бачу сэрцаў харобрых,
Я ня бачу сарцоў закаханых
Ў край свой любы, ў зямлю курганную.
Тут купляюць усё за грошы,
Тут няма Кастусёў, толькі Прокшы...
Волю краю, дзядоў летуценьні
Прадаюць тут разам з сумленьнем.
Веру продкаў сваіх і мову,
Нават душу прадаць гатовы.
Ўсё бяз слова здаюць, бяз бою.
Тут ня скажуць — наша, сьвятое!
Тут народу адданых брацьцяў,
Як Хрыста, вядуць на расьпяцьце.
Хто прад злыднем ня стаў на калені,
Ў таго матам, ў таго каменьмі...
Ўсё тут нагла і ўсё бязбожна,
Нат «крывіч» тут сказаць няможна.
А ў суседзяў іншая доля,
Хлеба й волі ў людзей даволі.
Годзе загадаў чужых і працы,
Час ужо зо сну нам прачынацца.
Быць у няволі нас не прымусяць —
Гаспадары мы на Белай Русі!
Нашыя землі, нашы магілы —
Адступіць вораг прад нашай сілай!!!

* * *

Сьцішаным сэрцам я чую: бурліць,
Як вясьняныя бурныя воды,
Мова адвечная з родных крыніц,
Мова зямлі і народу.
Вякі падбіваюць, спыняюць яе
Чужацкія дзікія орды,
А мова жывая, а мова пяе,
Гучыць яна ўпэўнена, горда!
Людзі, цясьней, няхай сэрцы ня сьпяць,
З зямлі мы адной і роду.
Змагацца з насільлем і перамагаць,
І быць нам народам, ня збродам!

* * *

О Беларусь, мой край стары і слаўны,
мой горды лёт, мой сэрца кожны стук,
я волі не вымольвала ў тыранаў,
дачка Твая, я са змагань і мук.
І допыты, і вязьніца глухая,
гдзе дотык сьмерці і халодны пот,
і долі лёд, і тундра ледзяная,
клыкі сабак, і боль, і штык, і дрот.
Даруй жа тым, што мову прадавалі,
аб Тваёй волі не хацелі чуць,
што за Цябе мячоў не падымалі,
даруй жа тым, даруй і не забудзь!

* * *

Край мой любы, войнамі змучаны,
Над народам сьмяротны цень.
Моладзь споена, моладзь аблучана,
Ці падыме Цябе з калень?
Адным чарку, другім у партыю,
Толькі б нечым заціснуць рот,
А гдзе ж тыя, нечага вартыя,
Што стаялі б за свой народ?
Жаль, браты, Вас, хлусьнёй зьняволеных,
Мовы роднае не чуваць,
Можна збожжа прадаць, жывёліну,
А ці ж можна душу прадаць?
Не было нам ніколі соладка,
Горда ўмелі мы боль стрываць,
Можна хату прадаць і вопратку,
А ці ж Маці можна прадаць?
Мужыкамі нас клічуць і хамамі,
Мазалі на нашых руках,
Наша вопратка не духмяная,
Йдуць «паны» па нашых сьлядах.
Нам баранка, лапата, кельня,
Ім бізун, каб нас паганяць
І тапіць нас ў хлусьні пякельнай,
Род з зямлі нашай карчаваць.
Жылі хаты па-чалавечы,
Ім сягоньня ніяк няўцям,
Што ўсё нашае нам нявечаць,
Забіраюць радасьць жыцьця.

Душа нашая — бель палотнаў,
Толькі б бруд у яе не прасяк,
Беларус зноў малы, гаротны,
Толькі б моцны ў яго кулак.
Ён стрывае любую працу,
Бо ягоныя тут палі,
Чужым злыдням ў ярмо ня дасца
На пакутнай, сьвятой зямлі!
Век дваццаты, ня час Батыя,
Нельга нішчыць сем'яў, сыноў,
Беларусы сёньня ня тыя,
Навучыліся біць паноў!
Розных масьцяў: белых, чырвоных,
Што з народнай крыві жывуць.
Беларусам годзе прыгону,
Беларусы з каленъ ўстаюць!
Ў беларуса свая ёсьць мова,
Гаі, пушчы воляй шумяць,
Бараніць іх жыцьцём гатовы ён,
Барацьбы хлусьнёй не стрымаць!
Душа чыстая, як на споведзі,
За жыцьцё ўстае для жывых.
Аблучаць ўжо ня дасьць ён моладзі,
Воля гімнам бурліць ў крыві!!!

* * *

Час ймкне наперад, час адлятае,
Што ўзяў з сабою, ўжо не вяртае.
Ймкне бураломам. У дзікім імкненьні
Толькі б ня вырваў з зямлі карэньняў!
Вясна галіны лісьцем пакрые,
Калі карэньні яшчэ жывыя.
Крыўда народу агнём нас паліць,
Такое сечы ня знае памяць.
Гэта ня пекла недзе па сьмерці,
А гэта доля, якой ня сьцерпець...
Душаў няволя, ня знаем горшай,
Хоць на гарэлку сыпнулі грошай.
Як бы ні хмельна, як бы ні сыта,
Для Беларусі мала карыта.
Нашая толькі праца з нудою,
А што над намі — усё чужое!
А мы жывыя, не, мы ня цені,
Мы тут з карэньняў і мы з цярпеньняў.
Бедна жылі мы, але затое
Усё, што наша, было сьвятое.
Усё, што з працы, з бору і з ніваў —
Ад лусты хлеба да песьняў сівых.
Заела сэрцы чужая ласка,
Забралі нават гонар сялянскі.
Не, мы ня слугі, ня гнуцца плечы,
Ўздымае грудзі дух чалавечы.
Глуміць нас, мову нельга нікому,
Мы не чужынцы, ў сябе мы ўдома!

Лёс наш пакутны, ўсё ж дух наш творчы,
Путы чужыя скінем аднойчы!
Голаў ўздымеце, сьпінаў ня гнеце,
Мала карыта людзям на сьвеце!
Сьвіньням — карыта, людзям — свабоду,
Гордасьць і годнасьць свайго Народу!
Гордыя душы сякуць на раны,
Слабыя душы купляюць танна.
За лык гарэлкі гандаль вядзецца,
Гэтак куплялі ў прэр'ях індзейцаў...
Думайце, брацьця, брацьця, зважайце,
Душы і мовы не прадавайце!
Дружна ўставайце, зорка глядзеце,
Хто нішчыць род наш, ня з тымі йдзеце!

## БАРАЗНА

Дуб зваліўся, упала сасонка,
Кроў-жывіца сьцякае з кары,
Баразна, Баразна-баразёнка,
Прыгаралі Цябе без пары.
Колькі скарбаў напрадзеных, тканых
На дне куфраў сялянскіх ляжыць,
Ты ва ўсё гэта быў закаханы,
Як жа, хлопча, Цябе ажывіць?
Як жа сумна і як жа дрымотна:
Ні зары, ні сьвятла, ні відна,
Хто ж раскажа Краіне гаротнай,
Каго страціла ўчора Яна...
Яшчэ вусны ўсяго не сказалі,
Яшчэ рукі ўсяго не знайшлі,
Як жа рана Цябе адабралі
У зьняволенай нашай Зямлі!
Не на золата ўжо, не на грошы
На адвечнай зямлі Крывічоў,
Тут палююць бязьлітасна Прокшы
На выдатных Краіны Сыноў.
Не вайна, а магілы, магілы,
Не зьлічыць сьветлых, сьцятых галоў,
Што ж, патрэбны народ ім бяскрылы,
І таму выбіваюць арлоў.
Не заб'юць ўсіх, мы з болю і ранаў,
З лютай помстай за мукі нягод,
У нас волаты новыя ўстануць
І прыбіты падымуць народ!

Як быльнёг, яны злыдняў падкосяць
Пад народны, караючы гнеў,
Няхай літасьці, ласкі ня просіць,
Хто над намі спагады ня меў!
Дуб зваліўся, упала сасонка,
Што любоўна народ ўзгадаваў,
Прыгаралі навек Баразёнку —
Ведаў вораг, каго забіваў...
У народнага гора прадоньні,
Гдзе насільле, махлярства і страх,
Баразны нашы гаснуць, як промні,
Што народу асьвечвалі шлях.
Баразна, Баразна, Баразёнка,
Жаль, дажыць не далі да відна,
У народу, у роднай Старонкі
Залатая была Баразна...
Пяе вецер працяжна і грозна,
Ліжа раны пакутнай Зямлі,
Лічыць колькасьць крывавых барознаў,
Што пралеглі па Ёй без вайны.
Зноў пакутны паўсюль лад прыгонны,
Анямела старонка уся,
Толькі вецер — змагар неўгамонны —
Будзіць сёлам штоноч Кастуся!

* * *

Хто сьцінае дубы і хвоі,
на зямлі нашай нішчыць жывое
і няволіць братоў у палон —
таму ад нас вечны праклён.
За гады людзкога цярпеньня,
за нявінных суровую сьмерць
да чацьвертага пакаленьня
ўсім нашчадкам яго цярпець!

## КАСТУСЬ

Калі ў бой на змаганьне з царамі
йшоў адчайна славуты Кастусь,
мала вёснаў ён меў за плячамі,
а у сэрцы — адну Беларусь.

Меў яшчэ свой адвечны, сярмяжны,
прагны шчасьця, працоўны народ,
яму волі хацеў недасяжнай —
нагароды з усіх нагарод.

Боль і путы, чужацкая цемра,
чужы зьдзек, чужы лад, чужы пан,
толькі ў сэрцы, бы вогнішча, вера
ў справядлівасьць народных змагань.

Толькі сіла у Яські з-пад Вільні
палымяных, адвостраных слоў,
ды пад шэраю сьвіткаю крыльлі
і размах найсьмялейшых арлоў!

Хацеў волі, народнае волі,
не раздумваць, ня ныць, а гарэць,
за сабою меў зьдзекі нядолі,
прад сабою ж свабоду ці сьмерць!

О свабода, твой подых, як вёсны:
ўваскрашаеш памерлых з тугі,
падымаеш сялянскія косы
і куеш змагара са слугі.

Крышыш праўдай, у прах разьбіваеш
паднявольля ярмо на гарбе,
о свабода, той не памірае,
хто загінуў ў баі за Цябе!

Ён суровым памостам кладзецца
праз багно паднявольных пакут,
перамогай запальвае сэрцы,
на змагарны выводзіць іх грунт!

Не, ня шляхціц, а роўны з усімі
адыходзіў сурова ад нас,
пакідаючы прыклад і Імя
і арліны змагарны наказ —

быць сынамі Айчыны, народам,
каб нам сэрцаў зламаць не маглі,
бараніць для нашчадкаў свабоду,
пядзю кожную роднай зямлі!

* * *

То ня гоман чужы і грымотны,
Ў шумных выкрыках спакваля
Голас сьціплы чутно і гаротны:
То гамоніць мая зямля!
З непахіснай, надзейнай сілаю
Прарастае з глыбінь зярнё,
Чутно голас дзядоў над магіламі,
Прабіваецца праз дзярнё...
Слова кожнае, слова важкае —
Ўмацаваньне народных праўд,
Не паўзеце, сыны, мурашкамі
Па зямлі на чужы загад!
Не хавайце ў магілу мовы,
Сваіх звычаяў і імя,
Крывічы мы, род ганаровы
І ня зроджаны да ярма!
Нам даўно ўжо свабоду забралі,
Нясем долі круты цяжар,
І ў бядзе мы, аднак, захавалі
Чалавечы, дастойны твар!
І таму прарасьцем з магілаў,
Цераз краты і кайданы,
Каб свабодай зямля ўскаласіла,
Яе праўдай засеюць сыны!
Нат касьцьмі, толькі болей ня нашымі,
Іх замнога народ злажыў,
Уміраць нам было ня страшна,
Толькі б Край наш квітнеў і жыў.

Толькі годзе ўжо пакутаў,
Толькі годзе ўжо ахвяр,
Вольнай волі зялёнай рутаю
Мы засеем наш родны Край!
З продкаў нашых вялікім імем
Пойдзем ў новы, крывіцкі дзень,
Нат слабых мы з калень падымем
На узровень вартых людзей.
Халуёў мы адмыем з бруду,
З чорных плямаў братняй крыві,
Любоў творыць часамі цуды,
Уваскрошвае нежывых.
Нам народ караць не прыстала,
Ён ў няволі душой зьнямог, —
Ўсё ж мы будзем людзьмі, ня стадам,
Хай нам ў гэтым паможа БОГ!!!

* * *

Страх за праўду кінуцца ў бой,
страх не дагадзіць акупантам,
быць удома самым сабой,
чалавекам быць страх пракляты!
Суд за думкі вольны размах,
воля толькі прадажнаму слову.
Беларусам быць тройчы страх,
страх валодаць роднаю мовай.
Страх ў чужыне сваіх братоў,
перад зьдзекам страх не скарыцца.
Страх маліцца на мове бацькоў,
дзікі страх наагул маліцца!
Страх, што ўвечары Каляда,
і за сына, што пойдзе ў школу,
страх, што бліжняга не прадаў,
страх, што чэсны, што не жывёла.
Брыгадзіраў страх на сяле,
страх падлізаў зьмяіных усюды,
страх хадзіць па сваёй зямле,
гдзе начальнікі і Іуды.
Страх гуманнасьці, дабраты,
перад Рускім страх, перад Ляхам, —
мы ж ня горшыя, што ж, Браты,
можа, хопіць гэтага страху?

* * *

Луг прайсьці і ног не памачыць —
гэткае ня кожнаму даецца.
То ня значыць, што умелі жыць.
Гэта значыць, што ня мелі сэрца.

Не зайздрошчу вышыні ў жыцьці,
кожны шчыт здаецца мне убогім,
на які хтосьць здолеў прапаўзьці
у наш час, не прамачыўшы ногі.

Знача, гінуўшых не ратаваў,
ахвярованых не дараваў з прадоньня,
знача, не пяяў, а падпяваў,
запрытна ўсім пляскаў у далоні.

Не зступіў і ног не памачыў,
калі брацьця гразьлі па калені,
не здабыўся на рашучы чын,
калі людзі ў лагерах калелі.

Пакрамсалі роднае – маўчаў,
мову забіралі – не пярэчыў,
а хваліў варожы сьвіст біча,
што народу ападаў на плечы.

Выдаваць адважных памагаў,
братні лёс яму быў абыякавы.
Толькі косткі сытай не ўпускаў,
за якую рваліся сабакі.

Вечна ненамочаны, сухі.
Калі б гналі ў лагеры і маці,
і тады застаўся бы глухім –
голас сэрца не дае багацьця...

* * *

Падкрадаецца зьнячэўку страх
ды рукой кастлявай сэрца шчыміць.
Цьвёрда на сваіх стаю нагах
і гляджу цьвярозымі ачыма.
Каб мякіны за зярнё ня ўзяць,
словы лёгкія людзей кладу на вагу,
каб хлусьнёю праўды не назваць,
я знайду заўжды ў грудзёх адвагу!

* * *

Шэры дым з камінoў узьвіўся,
Цёплы подых з сялянскіх хатаў.
Хто пра Маці сваю забыўся,
Называцца сынам няварты.

Дні ўцякаюць шалёнай рысьсю,
Супраць ветру брыдзем упарта.
Той, хто мову сваю забыўся,
Называцца братам няварты!

Каб ніводзін злу не скарыўся,
Стаімо непахіснай вартай.
Хто аб долі народу забыўся,
Чалавекам звацца няварты!

* * *

Сонейка у небе і вецер-гусьляр,
Подзьмух ля ніваў вясновы.
Ўсё гэта долі ласкавае дар,
Як маці пяшчотныя словы.

Продкі далі мне калісьці жыцьцё
Ў Жлобаўцах ціхіх і мілых,
Сэрцу з каханай зямлёю зьліцьцё,
Душы маёй сьмелыя крыльлі.

Цьвілі мае вёсны – ў палёх васількі,
У лес мой ўрываліся буры,
І сыпала сонца са шчодрай рукі
Цяпло маёй дзіўнай натуры.

Тысячагадовыя сказы з сяла,
Зьмястоўныя, творчыя словы,
Не, неабыякавай доля была
Да будучых сьцежак жыцьцёвых...

Вось запяяць бы зямлі маёй гімн —
З няволі да слоў п'едэсталу!
Вартым, адвечным, да болю сваім,
Як нэктарам, душа набрыняла.

А доля народу, як цемрадзь сама,
Каб змог, праглынуў бы нас вораг,
І толькі каханьню граніцаў няма,
Калі яно меч, не пакора!

Словы як стрэлы і сэрца як лук,
Стыхіяй змаганьня напяты,
Ня страшна пагрозаў, ні зьдзекаў, ні мук
За сьвятасьць пакрыўджаных хатаў.

Калі над пабоішчам кружыць арол
І вогненна сэрца кахае,
Дык сьмерць найдарожшых, пакрыўджаных боль
Ва ўзьлёт барацьбы прарастае.

О сэрца, мне ранаў Тваіх не зьлічыць
За вернасьць палём і дубровам,
За тое, што слова маё не маўчыць
У долі прыбоях суровых.

За вернасьць шляхам, што Скарына праклаў
Да ўзвышшаў старому народу,
За ўзровень належных зямлі маёй праў
Стаю непахісна і горда!

Адна супраць злыдняў бярозай стаю,
Пот, ня сьлёзы, мой твар залівае,
Я люблю Цябе, Край мой, як душу сваю.
Я знаю — за гэта ўміраюць...

* * *

Ноч глухая наўкол, цемень сэрца трывожыць,
Гдзесьць запозьненых струнаў чутно перабор.
Месяц ў хмары апаў, як на шлюбнае ложа,
І на шлях мой ня сьвецяць ліхтарыкі зор.

Цішыня. Чутно стукат уласнага сэрца.
Вецер гольлем бярозавым не скалыхне.
Я бяз страху іду. Мне заўсёды здаецца,
Што ў хвіліну трывогі ты сілай пры мне.

* * *

Сягоньня сьвята, і я сьвяткую,
замест у царкоўцы — у небе аўтар,
сэрца малітву пяе сьвятую
Табе, сусьвету любы Ўладар.

Кажуць ўсе: страшна, а мне ня страшна.
Людзі ў няволі, сёлы ў журбе,
гнецца вярбінай старонка наша,
а я душою веру ў Цябе...

Сьмела выходжу насустрач зьдзеку,
Цябе шукаю, Табе пяю,
веру у міласьць, веру ў апеку,
у справядлівасьць веру Тваю.

* * *

Чалавечы, нястрыманы боль,
Крык душы адзінокай адчайны,
Горкі сьлёзаў жаночых прыбой —
Ўсё спыніла, прыкрыла маўчаньне.

Толькі волі народнае кліч,
Ўзмах свабоды магутны, арліны
Вырываецца к сонцу, каб жыць,
З нетраў краю майго глыбінных.

Парывае, ўздымае з сабой,
Крышыць боль мой пякучы ўласны,
Чую кліч наш, чакаю на бой,
І маўчаньне маё да часу!

## МАРЫ

Мары мае высокія, нязбытныя,
мары мае — народу вольна жыць,
а ад мяне чакаюць чалабітнае:
душу і голаў ў пояс пахіліць.

Я пахіліла б голаў заінелую,
ў час буралому хіляцца камлі,
душы свае, аднак, сагнуць ня сьмею я,
ўва мне пяе душа мае ЗЯМЛІ!

* * *

Сьвішча вецер ярасна і востра,
Хлешча душу гордую маю.
Я з жыцьцём ў крутым адзінаборстве
Вытрывáла ўсё яшчэ стаю.

Не зламалі недругі і гора,
Мо таму, што у часы нягод
Пунктам непахіснае апоры
Быў такі ж трывалы мой народ!

## НЕ ПРАШУ!

Не прашу я ў вас дапамогі,
Слабым дапамогі ня даць...
Сама я гора за рогі
Парою умею браць!
Натура ў мяне такая —
Другіх засланяць сабой.
Толькі пот мне з чала сьцякае,
І ня ваш, але мой гэта бой!
Мацней заціскаю зубы,
Ня звучана адступаць.
Хто Край свой бязьмерна любіць,
Умее перамагаць.
Зьвіняць кайданы на запясьцях,
На творчых маіх руках,
Змагацца за волю ёсьць шчасьце,
Змагацца за праўду ня страх!
Мая доля — сьляды на паперы,
Вашы словы — сьляды на вадзе,
Танным словам змаганьня ня мераць,
Калі нехта на сьмерць ідзе...
Калі збураць падмурак, аснову,
Рухне Храм, што стрываў мячы,
Калі нам забяруць нашу мову,
Стануць Прусамі Крывічы...
Падчас, калі злога замнога,
Млее сіла, што ў сэрцы нашу,
Я крыкну: Браты, дапамогі! —
І ўсё ж я яе не прашу...

Не прашу я ў вас дапамогі,
Шмат хто ў путах душою заглох,
Ў час найбольшай за Край мой трывогі
Мая дапамога — БОГ!!!

## ЗІМА

Зіма — беласьнежна-суровае зьзяньне
са сьвіту румянцам, з красой без цяпла.
Шпарка са скрыпам ўразаюцца сані
у горы сумётаў, што ноч намяла.

Вецер ліхарскі галінамі верціць,
нясе, бы на крыльлях, палозы саней,
будзіць, трывожыць, пяе аб бясьсьмерці
слаўных падзеяў, вялікіх людзей.

Вочы забрызгаў ўспамін неспакойны,
гляджу, як праз веку далёкую сінь,
здаецца мне, з косамі ў сьвітках суконных
выходзяць насустрач з сяліб Кастусі.

* * *

Беларусы ад касы,
Нам сьняцца высокія травы,
Пакосы, як паясы,
Касавіца для нас — забава!
Чало ў поце, лугі з расой,
Гнецца первіна, зноў атава.
Размахнуцца шырока касой —
Гэта ёсьць мужчынская справа.
Беларусы ад касы,
З асёлкам ў кішэні кожны,
І хіляцца каласы
З налітым зярнём на пожню.
Косы зьвіняць у сяле,
Іх клеплюць на бой пераможны,
І хлеб, бы зара, на стале,
І засек зімой не парожні.
Беларусы ад касы!
Дарогамі, да сьвітаньня,
Хлопцы з косамі йшлі ў лясы,
На бунты йшлі, на паўстаньні!
Вашчыла іх вёў і Кастусь,
Зьвінелі ў паходах косы,
Адраджалася Беларусь
Пад звон іх рашучы і востры.
Вокам сябра гляджу на касу,
Кранаю асёлак рукою.
Не, на злом яе не панясу,
Няхай павісіць пад страхою!

* * *

Сэрцам да краю зьвернена,
Хоць зьдзекам чужым застрашана,
Моладзь шукае зернятка
Праўды вялікай, нашае.
Хай не блішчыць палацамі
Вёска наша адвечная,
Усё ж дабрынёй і працаю,
Як сонцам, яна асьвечана.
Даўно не чуваць у горадзе
Слова свайго, народнага.
Усё акалела ў холадзе
Сібірскага альбо моднага.
Душа анямела ў выкрыках
Суровай вайны, партызаншчыны,
Душа азьвярэла ў выкрутах
Калгаснай, чужое паншчыны.
Моладзь шукае добрага,
Сонечнага і простага,
Моладзь шукае роднага,
Карэньняў жывых для росту.
Моладзь шукае шчырасьці,
Вялікага, не зямнога,
У час духовай нішчымніцы
Моладзь шукае БОГА!

* * *

Моладзь ідзе няпэўна,
Моладзь — калінавы куст,
У пошуках долі дарэмнай
Крочыць мая Беларусь.
Песьня гучыць над імі,
Кліча і гоне: ўпярод!
Паціху другія гімны
Нявольны пяе народ.
Моладзь пад муштру крочыць.
Сумны, замкнуты круг.
Моладзь, гдзе твае вочы?
Перад табой Беларусь!
Моладзь праходзіць моўчкі.
Ўзьлёт бы, ня крок тупы!
Моладзь, народ свой топчаш,
На сэрца не наступі!

* * *

Кроў зьбяжыць рабінамі на вусны,
спыніцца ад гора стогн і дых,
толькі горкіх сьлёзаў беларускіх
у вачох ня ўбачыце маіх!
Груганы ўжо не над намі крачуць,
нашы сьлёзы адплылі ў вякі,
мужныя ня жаляцца, ня плачуць,
мужныя сьціскаюць кулакі.

* * *

Зноў час круты і б’е тупым абухам
бяскрылых слоў, расквечаных няпраўд.
Схіліліся ўдвая слабыя духам,
сумленьне замяняюць на загад.
Ўздымайцеся ўсе, хто людзьмі завецца,
няма такіх на сьвеце сёньня бед,
каб запрадаць хлусьні жывое сэрца
і чалавечы прагінаць хрыбет.
Людзкая плата — за удар ударам,
ня гнуцца ўдвое болей малайцы,
і боль і крыўда ўжо ня пройдуць дарам,
у кожнай палкі сёньня два канцы!

* * *

Не згінай мяне, я не сагнуся,
Не баюся ні страхаў, ні зла.
Нездарма я з зямлі беларускай
Непахіснай сасною ўзрасла.

Наўпрасткі йду няходжанай сьцежкай,
Мудрасьць продкаў ў гарачай крыві,
Ні прад кім не схіляю пасьпешна
Крыху гордай сваёй галавы.

Абмінаю ўсю набрыдзь, што вокал
Чалавечы мой блытае лёс.
Гляджу ў даль, не маргнуўшы нат вокам.
Розум цемру праніжа наскрозь!

* * *

Ты пан зямлі, я пан свайго сумленьня,
і нада мною ты не уладар,
бо за табою крыўды пойдуць ценем
і будзе мсьціцца збураны аўтар.

Дрыжацімеш сярод уласных стражаў,
каб змыць віну, ня знойдзеш ў сэрцы слоў,
а я прайду, і кожны ціха скажа:
— Вось чалавек дарогаю прайшоў!

* * *

Запаветная мара ўсіх часоў:
Ня біць, не глуміць, не калечыць.
Шчасьліва і мірна каб людзям прайшоў
Адмераны век чалавечы.

Аднолькава кожнаму раны баляць,
І кожны з нас сьмерці баіцца.
Высока дастойнасьць людзкую трымаць,
А рэшта? А рэшта — драбніцы!

* * *

Змагаешся з цемраю — знача, жывеш,
Родзіцца творчасьць са шчодрага сэрца,
З маленькіх пачуцьцяў ня зродзіцца верш,
З пустога вядзерца вада не пальецца!
Шмат чаго ў душу належыць ўвабраць,
Ў ёй зьмесьціцца болей, як ў нашых далонях,
Нам чэрпаць з крыніцаў сьвятла і дабра,
Мінуласьць хай сілаю ў вершах гамоніць!
Пісаць пра былое — ня знача назад,
Пісаць пра сучаснасьць — ня знача наперад,
Ў жывую паэму трэ ўсё нанізаць
І зважыць мінуласьць, каб ў заўтра паверыць!
Тварыць — гэта знача кахаць і цярпець,
З праўдаю лёс свой злучыць назаўсёды.
Ня ўчора пачатак, ня заўтра канец
Надзеям і думам старога народу!!!

* * *

Жыцьцё каламутнае зноў усялякае,
скрыўлены грозна паказвае твар,
то зацьвіце нетрывалымі макамі,
то стане на дыбы, рве прадзіва мар.

Кідае сэрца на шлях пад капыты,
топча сузор'і сьвятых спадзяваньь.
Цяжка прыдзецца братом-сьледапытам
зьбіраць нашы песьні ў свабодную рань.

* * *

Блукаю сёньня па родным краю
    збалелым ценем.
Хачу быць кропляй, што перапаўняе
    чару цярпеньня.

Хачу быць словам, што напраўляе
    на шлях сапраўдны,
сілай, якая перамагае
    ў баі за праўду.

Пад тваім небам, чыстым і сінім,
    быць канапелькай,
быць тваім гордым, вечным ўспамінам,
    мая зямелька.

* * *

Над душамі чужы, суровы пан,
рабам маўчаць, рабам загад карыцца,
шалёны хлешча ў бераг акіян
і залівае родныя крыніцы.
Начамі душыць прага піць і жыць,
нас не напоіць акіян салёны,
благаславенная вада з крыніц,
з сваіх жарол, і хлеб з радзімых гоняў!

* * *

На вейках сьляза ледзянее,
застыла лапата ў руках,
па тундры брыдзе безнадзейнасьць,
нырае ў глыбокіх сьнягах.

Замерз ужо хлеб пад бушлатам,
замерзла сьляза, не плыве,
і толькі прыцішаны атам
ў пакрыўджаным сэрцы жыве.

* * *

Вам страх маёй прысутнасьці,
Што я жыву на сьвеце,
Я сьлед вашай праступнасьці,
Які трэба зацерці.
Ахвяра вашай дзікасьці,
Сярод жывых жывая,
Так мучылі бяз літасьці, —
Я з тых, што боль стрываюць.
Я з тых, хто не забудзецца
Пра енк і кроў нявінных,
І словы мае збудуцца,
І нелюдзі пагінуць!

* * *

Зіма, беласьнежка, суровая пані
З румянцамі ўсходу, з красой без цяпла.
Гляджу, як са скрыпам ўразаюцца сані
У сьнег, што так злосна ў сумёты зьмяла.

Усё вее ў вочы, і круціць, і верціць,
Капытамі коні кранаюць саней,
Люблю, калі вецер пяе аб бясьсьмерці
Магутных пачынаў, вялікіх ідэй.

Малое усё раствараецца ў лужах,
Са сьнегам адталым ў канавы зьбяжыць.
Люблю тых, каго не зманўць, не адужаць,
Хто зроджаны мужным, каб праўдаю жыць!

Хто не «баюе» славамі пустымі,
Ў каго чэснае сэрца жывога ядро.
І веру у праўду, якая ня гіне,
Ў адточаны меч свой цярпеньнем — пяро!

Я сілу люблю у вачах прамяністых,
Што іскрамі крэсьліць намечаны шлях,
Адвагу пачынаў, гатоўнасьць як выстрал,
І слова як крэмень, і думаў размах!

* * *

Сонца, цяплынь і зрух лёду вясновы,
сіла да сьмелых змагань і турбот,
кожны бы зноў нарадзіўся нанова
яшчэ для нязнаных высот!
Груд, цёмны груд ўжо пад зеленьню кволай,
гусі дахаты скрозь хмары ляцяць,
вецер адвечным інстынктам жывёлы
ліжа палі, як сваё дзіця.
Гэта вясна, сьпеў насуперак ночы,
рана сьвітаньне і дзень без канца,
гнёзды кладзе ды з буслам клякоча,
сыпле зярняты з далоняў тварца.
Кожны з нас сейбіт, з душы, як з сявенькі,
хочацца кінуць для ўсходаў, жніва
словы і мысьлі, сучасныя веку,
ды ў пераможным палёце стрываць!

## КРЫЛАТЫЯ

Кожны сябра крылаты свой ведае шлях,
Неабмежаны, сіні, паднебны,
Як й куды скіраваць крыльляў вольны размах,
Ім на гэта указ не патрэбны!

Быць сабою, няспыненым птахам ў жыцьці,
Ў летні дзень ці размоклую восень.
Не указанай вузкаю сьцежкаю йсьці,
А ляцець, куды думы заносяць!

Знаем сьвятасьць гнязда, сілай зьвераны лёт,
Непахісныя продкаў законы.
Прага ў нашай крыві да змагань, да высот
І напрамак да родных загонаў!

* * *

Вецер схапіў ўжо асеньнюю пражу,
Ў полі снуе бадылі,
Усё нейк мінае, й пра нас заўтра скажуць:
— Яны тут ня ёсьць, а былі...

І госьць, што зьбіраўся марудна і доўга,
Нарэшце, адолеўшы страх,
Клямку кране, пастаіць ля парога
І пойдзе з тугою ў вачах.

Позна прышоў. Што ж, у час гэты грозны,
Калі вецер заносіць наш сьлед,
Сябры да сяброў ўжо прыходзяць запозна,
Забыўшы людзкі запавет.

А трэба, належыць з сваімі быць радам,
Поплеч з сябрамі ў жыцьці,
Бязбоязна ўстояць ў змаганьні за праўду,
Да змучаных ў пору прыйсьці.

Хто не адчуе сьвятога імкненьня
Быць разам ў нягодзе, як ўсе,
Сарве яго вецер, як прут без карэньняў,
І ў невараць гдзесьць панясе.

Адстаў ад сваіх, да чужых не прыстане,
Ў нядолі братом не памог,
Чужы будзе ўсім, хто ня знае хістаньня,
Вартуючы родны парог.

* * *

Зубр у пушчы, адзінец, ад стада адвык,
Не ахвяра, а пан ў сваім лесе.
Адзін, як пільгрым, што ў сьвятыню пранік,
Адзін, як арол ў паднябесьсі.

Лёс розныя творам накрэсьліў кругі,
Розныя ўзвышшы палёту.
Каго палюбілі аднойчы багі,
Сіла яго — адзінота.

Красуецца стада прыплодам цялят,
Гульнямі ў травах пахучых.
А ў сэрцы адзінца інакшы загад —
Быць рыкам адвечнае пушчы.

Адзначаны сілай, чужы для сваіх,
Стада яго не прыгорне.
З накрэсьленай жменяй законаў тупых
Баіцца яно непакорных.

Стойбішча стаду і стаду лугі,
Адзінцу — трывога ў сэрцы.
Каго палюбілі аднойчы багі,
Той са стадам ужо не сальецца.

Ля дрэваў сваіх, ля сваіх берагоў,
Здалёк ад хлусьні маладушных.
І што праўдзівей за нашэпты багоў,
Што з неба ўліваюцца ў душу?

## ЖЫЦЬ

Жыць — гэта у заўтра праменнае верыць,
з паднятай ля злыдняў прайсьці галавой.
Жыць — гэта знача прачнуцца ад цемры
і сонца убачыць над сумнай зямлёй.
У хаце з сасновых, пахучых бярвеньняў,
з нашым гаючым, сямейным цяплом
бачыць, як часам ўсе тры пакаленьні
зыдуцца разам за поўным сталом.
Жыць — калыхаць і на вечнасьць праводзіць,
род свой і мову кахаць, сьцерагчы,
хай зьзяе, хай вечна ў крыві нашай бродзіць,
роднаю песьняй чаруе ў жыцьці.
Мудрасьць дзядоў і дзяцей шчабятаньне,
гожасьць жаночая, сіла мужоў,
юнасьці сьмелай жывое сьвітаньне,
ў якім адчуваецца верная кроў.
Сіла ў далонях і посьпехі ў працы,
спогадзь суседзкая, вернасьць ў бядзе,
гордая мужнасьць за праўду змагацца,
пашана і вартасьць заўсёды ў людзей.
Жыць — кідаць вечна у ворыва зерне,
садзіць маладыя лясы і сады,
то дотыкам ног цалаваць сваю землю,
гдзе цяжка ступалі бацькі і дзяды!

* * *

Калі палеткі ад жніва астынуць
і ляжа сум асеньні на лугі,
мне хочацца ў сялянскую гасьціну,
на верасовы мёд і пірагі.

Мінуў Багач, дастатак у каморы,
бараніна з капустай на стале,
стаіць глячок нявымаўна задорны,
і гаспадар ад сэрца чарку лье.

З прынукай ўсё: да дна і на здароўе!
І слухае і п’е нявольнік-госьць,
плывуць ў застольлі шчырыя размовы,
людзкія сэрцы сьвецяцца наскрозь.

І я тут п’ю з вялікай насалодай,
п’ю да відна, да пеўнікаў, да дня,
мову сваю з тысячагодзьдзяў родную
з чаркі іх сэрцаў шчодрых п’ю да дна!

## МАЯ КРЫНІЦА

Жыта морам наўкол, сіні лён і пшаніца,
кроны дзічкаў на межах, ячмені, аўсы.
То дзяцінства майго залатая крыніца
вабіць жоралам вечным жывое красы.

З ветрам дрэвы шумяць, нешта сэрцу гавораць,
прад вачыма расквечаны траваў дыван,
і рачулка маленькая траў пераборам
до сну вербаў калыша пахілены стан.

Гдзе дарога наўпрост, полем сьцежачка ўецца,
сонца шчодрымі промнямі сее кругом.
Блаславенным цяплом заварожвае сэрца,
кліча сьветлымі вокнамі бацькаўскі дом.

Нехта быдла з дубовага поіць карыта,
ля драўлянае студні скрыпіць журавель,
а ў вадзе адбіваецца неба блакітам
і палошчуць аблокі пушыстую бель...

Ўсё тут зелена, хораша, ціха, адвечна,
панадворак травой, канюшынай прапах.
Адбіваецца водблесь нябеснай сінечы
у задуманых крыху дзявочых вачах...

* * *

Юным ня сьпіцца, ня ўцішыць сяла,
тужаць, кахаюць гітары.
Ночка-цыганка высока ўзьняла
месяца поўную чару.
Іскрыцца водблеск далёкіх планет,
ноч ў галасоў перагудзе.
Як жа харошы, харошы сьвет,
даны для радасьці людзям!
З сэрцаў пачуцьці, як кіпень з каўша,
сіла бурліць маладая,
плешчацца ў песьнях жывая душа,
долю на бой выклікае.
Вецер, разлукі, вайны не прароч,
уздым шчасьця на струн пераборах,
рукі сплятаюцца ў гэткую ноч,
сэрцы вянчаюцца ў зорах.

## РАНЬНЕ

Блаславеннае летняе раньне,
час пераджніўны на Беларусі.
Сонца, як жнейка, ахвотна ўстане,
па полі косы-промні раструсіць.
Плывуць аблокі па небе сінім,
прыбоем хвалі вітаюць сонца,
шчэбет птушыны, клёкат бусьліны,
разьлівы жыта па ўсёй старонцы.
Пах чабаровы на польных межах,
пад крушняй кроплі ярых суніцаў,
травы чакаюць касы, а жыту
месяц-сярпочак начамі сьніцца.

* * *

Дзень быў сонцам, як сэрцам, сагрэты,
стары сад беляхцеў, як лунь,
распасьцертыя крыльлі ветру
калыхалі шаўковую рунь.
Падымалі туман на дарозе,
плялі косы бярозаў-дзяўчат,
прыгіналі вярбовыя лозы,
абтрасалі ў саду сьнегапад.
Полем травень размашыста крочыў,
абуджальнік жыцьця, чарадзей,
з салаўінымі сьпевамі ноччу,
з пільнай працай на полі удзень.
Гэткі край, наскрозь потны у будзень,
гожы сьвятам духмянай вясны,
гдзе радзіліся слаўныя людзі
ў гушчы сёл, на сялібах лясных.
Гэткі край, расьпяяны і хлебны,
слаўны працай цярплівых жанчын,
край нявольны, чужымі цярэблены,
з чорным таўрам «мужык» на плячы.

* * *

Здратаваны кулямі і ботамі,
ўмеючы на камені пражыць,
за цябе, чужымі ператоптаны,
сэрца неспакойнае баліць.
Край мой, муражнік, вайной разбураны,
цуд, узьняты з попелу руін,
гудуць ў полі віхры сямiструнныя
пра адважны, велічны пачын.

***

Дзіўны час, ўсіх збываюцца мары,
волі гімн на тамтамах тугіх,
ўстаюць белыя, чорныя твары
з адным колерам сэрцаў людзкіх.

Нада мною столь з дошак і бэлек
пралягла на бярвеньнях тугіх,
стырчаць гакі старых калыбеляў,
ноч мінуласьць калыша на іх.

Ўжо замест буркатні калаўрота
пад агонь і патрэскваньне дроў
аб кудзелях, аб белых палотнах
сьпікер гутарку ў радыё завёў.

Іншы бохан ляжыць пад абрусам,
на сьцяне цікавейшы абраз,
толькі роднае мовы на вуснах
не крануў ўсёмяняючы час.

Час усё непатрэбнае крышыць,
дарагога ж нішто не кране.
Сьвеціць золата на папялішчах,
бо яно не згарае ў агне.

Часу ўзьлёт маёй мове пасільны.
Думы геніяў ў ёй песьняй гучаць.
Недзе людзі пад стрэхамі пільна
ўмелі сэрцам яе шліфаваць.

Яна сьвеціцца мудрасьцю, ласкаю,
партызанскай адвагай пяе
і з крыніцы свае праславянскае
непадробленым праменем б’е.

Мова з крыўдай, са скарбамі ўласнымі,
што пранесла праз жудасны век,
і сівая, і разам сучасная,
як харошы, жывы чалавек.

Новы час непатрэбнае крышыць.
Наша ж мова, як вечнасьці ніць,
з праславянскіх крыніц і узвышшаў
красавацьбудзе з намі і жыць.

## ЗАЛАТАЯ СОНЦА КАЛЯСЬНІЦА

Ноч крылом пастукала у дзьверы,
вецер сілай тузае прабой,
застанецца ўсё, што на паперы,
ўсё, што ў сэрцы, — забяру з сабой.

Заўтра залунае сьнег вішнёвы,
зацьвіце на сонцы бэзаў куст.
Ёсьць такое казачнае слова,
вырванае з рэбраў: Беларусь.

Вораг далі не аддасьць затанна,
гордасьць выбілі ў паніжаных рабоў,
паляглі айчынныя тытаны
недзе за пярэплецьцю дратоў.

Недасказана, нязроблена так многа,
неадпомшчана за сьлёзы і за кроў.
Я пакіну вам мае трывогі,
я пакіну вам маю любоў.

Няхай сэрцу змучанаму сьніцца
пах вясны, вішнёвы белы дым,
залатая сонца калясьніца,
вольны сьцяг і пераможны гімн.

* * *

Пакуль аж сьмерць мне не закрые вочы,
Зямля ня спыніць мой апошні дых,
Буду ісьці, буду змагацца моўчкі
За Край мой родны і цярпець за ўсіх.

Ня страшна мне, калі кругом трывога,
Ня боязна варожых, чорных спраў,
Я не сама, я сэрцам веру ў Бога,
Які нат Сына на ахвяру даў.

Ударыць гром, ярмо нявольнік скіне,
Жывы народ падымецца з калень,
Загіну я, ўсё ж Край мой не загіне,
Крывіцкі, слаўны расьсьвітае дзень!

* * *

Зноў вясны пераможнай напеў,
Беласьнежных галінаў у квецьці,
Да зялёных кустоў, ў белі прыбраных дрэў,
Як дзяцюк, заляцаецца вецер.

Закаханы усюды, вясьняны настрой,
Рой пчаліны на цьвет ападае.
Мы за рукі ўзяліся, як дзеці, з табой,
Свае вёсны ізноў ўспамінаем.

Ўсё чужыя дарогі, чужыя шляхі.
Йдзем па іх, толькі думы ля Нёмна,
Ля свае залатой, саламянай страхі,
І у сэрцы надзея, як промні!

* * *

Сонца у полі сумуе і цешыць,
травам ўздымацца і дрэвам цьвісьці,
вецер павеяў як быццам цяплейшы,
жаль, што інакшы павеяў ў жыцьці.
Розна бывае ў жыцьці і у полі,
ў адным жа ў прыродзе падобны закон:
чаму зацьвітаць не апозьніцца тое,
ў які б ні закінулі жудасны сон.
Юнае сьмеласьці віхар адчайны,
ідуць, засяваюць, чакаюць пары.
Дні нашай мовы дарма падлічаюць,
вясна на парозе, цяплеюць вятры!

## БЕЛАРУСЬ

Беларусь мая сьпеўная, летняя, жніўная,
Палавеюць загоны густой ярыной.
Напаю свае вочы блакітам і нівамі
І лясоў Тваіх цьмяных суровай красой.

На дарогах жыцьця п'ю я сьлёзы па поўніцы,
Кожны крок мне да болю бывае цяжкім.
Толькі ласкай Тваёю душа мая поўніцца,
Тваё імя сьвятое у сэрцы, як гімн.

Аддалёк, бы дыван, зелянее бульбянішча,
Паабапал дарогі зацьвіў чабарок.
О зямля маіх прадзедаў, наша прыстанішча, —
Зноў на грудзі упала сьляза незнарок...

Паглядаю навокал, дачка Твая верная,
Да адчаю, мой скарбе, кахаю Цябе.
Адзінокі мой шлях і усыпаны цернямі.
Толькі я не прыстала яшчэ ў барацьбе!

Маці сілу дала і палі навакольныя,
І дубы, якіх бурам ліхім не зламаць,
Расьцьвітай жа свабоднаю, слаўнаю, вольнаю.
Абэліскі з граніту на варце стаяць...

* * *

Родны дом, родны сьпеў, родны край,
Гладзяць косы вятры пералётныя,
Бохан хлеба, бы той каравай,
Ў ручнік белы матуля загортвае.

І птушыная скрозь мітусьня,
Ў завушніцах галіны бярозаў,
Урываецца ў душу вясна
З белых дрэў, з зарунелых барознаў.

Толькі вецер у нашых палёх
Гэтак гладзіць нам русыя косы,
Гнуцца травы пад пальцамі ног,
Па-сялянскаму белых і босых.

Гдзесьць аблокі гуськом паплылі,
Ўзьвейна-лёгкія, з сіняга пуху.
Йсьці так слаўна па роднай зямлі,
Адгалоскаў мінулага слухаць.

## НАД ЗЭЛЬВЯНКАЙ

Стаю адна, а прада мной ірдзіцца,
сінее поясам вузенькая рака...
Прышла сюды я раньнем на граніцу
з другога боку птушак сустракаць.

Вось вылетуць яны з зялёных хвояў,
пачнуць вясёла з сонцам гаманіць
і паплывуць у сіні нада мною,
ня знаючы ні межаў, ні граніц.

Вось вылетуць... ушыр і ўдоўж па краі,
гдзе толькі кліча рэха братніх мук.
Іх вольны лёт нішто не затрымае –
ні сінь Дняпра, ні быстраводны Буг.

Ня ўбачу больш, як сонца тут устане
і ў сініх хвалях голаў акуне...
Не заірдзіцца у кустох ружова раньне
і толькі ў чужыне прысьніцца мне.

Як гляну я на стрэхі родных вёсак,
што у лугах, як птушак чарада...
Мне гэтак цяжка родныя палоскі
і край свой любы сёньня пакідаць...

Калі цягнік жалезам зарагоча
і панясе ў далекі, гулкі вір,
імглою смутак ападзе на вочы,
ўпадзе мой стогн на прыдарожны жвір...

І, ціха стоячы ў вакне вагону,
я захачу, самотная, адна
свае аўсом засеяныя гоні,
і вобраз сёл, і буры лес абняць.

Бывай ужо, плыві далей, Зэльвянка,
нам прыдзецца з табой расстацца ўсё ж...
Іду дамоў, а прада мной сялянкі
ступаюць па дарозе басанож.

Глядзяць у твар, і чуецца пытаньне:
чаму ў вачох такі дзіўны агонь,
адкуль прыйшла сюды чужая пані
і плача так няведама чаго?

Пайшлі далей, іх словы заціхалі,
упаўшы недзе ў польны малачай.
Мне ж засталася толькі жменя жалю
й дарога сумная ў чужы, далёкі край.

## ЗЭЛЬВА

Раненым крылейцам сонейка хіліцца,
коўзае, падае птушкай далоў.
Тоненькім вэлюмам дымы над Зэльваю
ўюцца з падбеленых камінOў.

Сьцежкай асеньняю, лісьцем усеянай,
з сумкамі, з кнігамі йдуць хлапчукі.
А над Зэльвянкаю вуды з прыманкамі,
хлопцы з каханымі, аблакі.

* * *

Усю ноч аж да ранка
Пад напевы трысьця
Ловіць хваляй Зэльвянка
Адгалосы жыцьця.

Калі вецер патопіць
Семя зор у вадзе,
Забяжыць сюды хлопец
І дзяўчына зайдзе.

То пасядуць на бераг,
Злучаць рукі бяз слоў.
То кахаюць і вераць,
То расходзяцца зноў.

А Зэльвянка, як маці,
Ловіць невадам хваль
І глыбока хавае
І каханьне, і жаль.

Ўмее сьлёзы уцерці,
Знае гоечы лек.
Злучыць вусны і сэрцы,
Злучыць рукі навек.

І мяняюцца песьні,
І мінаюць гады.
Маладосьць адплывае
З быстрай хваляй вады.

Толькі казкі ня гінуць
Пра каханьня дзянькі.
Застануцца ўспаміны
Не для любай ракі.

Забяжыць сюды хлопец,
Прыйдзе сівы дзядок,
Пакуль жыць будзе Зэльва,
Наш малы гарадок.

## БЕЛАВЕЖА

У Белавежу іду, як у храм.
Кругом дрэваў маўчаць калоны.
На кары, гдзе ля шраму шрам,
Бы счарнелі старыя іконы.

Навальніцы сьціхае плач,
Яшчэ кроплі вісяць, як пэрлы.
Купал сонечны ўпаў бы, як мяч,
Толькі кроны яго падперлі.

Пахіліліся ўсе кусты,
На калені пасталі радам.
Ядлаўцовы скрозь пах густы,
Чабаровы, мурожны ладан.

Ціха тут, толькі сэрца стук,
Лёгкакрылае птушкі напевы,
Тут касуля прышла б да рук,
Каб застыць я магла ля дрэва.

Кроў каліны вісіць над ракой
Сьвятой кропляй з цярнёвай кароны,
Узвышаецца над душой
Само неба замест амбоны.

Жар суніцаў — кроў з нашых ран,
Незагоеных, набалелых.
Калі бусел ўзьляцеў з палян,
Мне здавалася — анёл белы.

Зубр суровы ягнём прылёг
Ля бярозаў у белай адзежы.
Калі недзе бывае Бог,
Ён напэўна тут, ў Белавежы.

## БАРАВІКІ

З прыполу хмар асеньні дождж пасеяў
Кругом грыбы... Вось забірай дарма.
Бягу у лес з кашом, поўным надзеяў.
Шукаю шчырых, а такіх няма!

Кругом паганкі, дробязь, мухаморы,
Ня зьлічыш пачарнелых савякоў,
Такіх нярадасных, разьмякшых ў горы
І апусьціўшых капялюш далоў.

Гарацць рыжкі, ірдзяцца сыраежкі
І сьлізгаюцца ў пальцах масьлякі.
Краснагаловікі пад асіной на ўзьмежку,
А ў марах, ў сэрцы ўсё баравікі.

Такія шчырыя, праўдзівыя, як крэмень,
Што сярод лесу, дружныя, жывуць,
Як два браты, і ўпрыгажаюць землю,
Без чарваточыны пад галіной ўстаюць.

Шукаю шчырых, баравых, харошых,
Хоць сонейка ўжо падышло ўгару
І мой яшчэ зусім ня поўны кошык.
Шукаю шчырых, іншых не бяру.

## ЎСПАМІНАЛА ДЗЯЎЧЫНАНЬКА

Ўспамінала дзяўчынанька
залатую вясну.
Быць такому адзінаю,
хто цалуе адну.

І дарогай туманнаю
у няведамы сьвет
йсьці такім пакаханаю,
хто кахае навек.

Быў такі, тугой высьнены,
які сэрца крануў.
Вусны сьпелымі вішнямі
аддавала яму.

Йшла пры ім ганаровая,
быў ад брата вярней.
Што ж, такія героямі
палеглі на вайне...

* * *

Ты ня кліч у сьвет мяне з сабою,
Мне патрэбны вецер малады,
Гутарка адвечная з зямлёю
І паэмы, як цьвітуць сады.

Мне патрэба ў ціхі час вячэрні
Пачуць песьні даўнія касцоў,
Каб палеткі сыпалі мне зерне
На далоні проста з каласоў.

Мне патрэба зельлечка у жменю,
Ад якога згіне мой нядуг,
Йсьці травою роснай па калені
Раніцою папраз бацькаў луг.

Над маленькай рэчкай наўзьніч легчы,
Ў неба беззаганнае глядзець,
Запаліць агонь сутоньнем ў печы,
Душу ярым полымем сагрэць.

Мне патрэба роздуму гадзінку,
Ценяў дрэваў на рачной вадзе,
Надвячоркам мілую сьцяжынку,
Што да хаты роднае вядзе.

## НЕІСНУЮЧЫ

З каменьчыкаў імя не выкладаю
Я Тваяго на беразе ракі.
Ня сьню цябе і ноччу не чакаю
На любы дотык вернае рукі.

Не для цябе паставіла вазоны
Цьвісьці ў вакне у сьцюжу і ў мароз,
Не па табе тугу маю сягоньня
Хімерны вецер ў бездараж панёс.

Хоць твой абраз, імя тваё у сэрцы,
Малітваю на вуснах лекаціць,
Чало тваё падушкі не кранецца,
Вачэй тваіх каханьне не займгліць.

Ў віры жыцьця не для цябе квітненьне,
Ля белых рук не для цябе прыпын,
Душа твая ў агні і захапленьні
Бясьсьмерце дум пераплаўляе ў чын.

Няхай стаяць ў акне маім вазоны
І да сьвітаньня лямпачка гарыць.
Натруджаны і стомлены сутоньнем,
Калісьць прыйдзеш ля рук маіх спачыць...

* * *

Ноч разгарнула бяззорны плашч,
стукочуць гольлем аб стрэху вішні.
Вецер і холад, і дождж, як плач,
звоніць аб вокны хаты зацішнай.

Нехта спазьніўся, нехта прамок,
сушыцца хусьце і варыцца страва.
У хаце ня ўсе яшчэ, сына здалёк
бацька чакае, прысеўшы на лаву.

Прыдзе напэўна, калі будзе мог,
ветру насупраць, на злосьць непагодзе.
Калі стары бацька чакае ў дзьвярох,
нанач дахаты сыны папрыходзяць.

Бо бацька і маці і родная мова,
узьнятая к славе амаль з небыцьця
паэтаў натхнёным і велічным словам,
для Беларусаў — пытаньне жыцьця.

* * *

Вечар жыцьця ўжо ступіў на парог,
Моўчкі да нас прабіраецца ў сені.
Ляснуў зьнячэўку ля клямкі замок,
Аж ўздрыгануліся вушы у сьценах.

У печы кафлянай паленьні трашчаць,
Сум і цяпло, цішыня па пакоях.
Упэўнена сьцены старыя стаяць,
Вартуюць наш вечар і рэшткі спакою.

Кніжкі навокал, ў душы дабрыня,
Прысела дастойна за стол чалавечнасьць,
А гдзесьць за дзьвярамі грыміць мітусьня,
Што розуму, праўдзе і сэрцу пярэчыць.

Сьцішана боль адплывае з душы,
Дом наш — прыпынак радзімае мовы
І веры ў народ наш, які не скрышыць
Ніякім няпраўдам, ніякім аковам.

Часамі ўрываецца зло на парог,
Пенай хлусьліваю хітра бушуе
І замаўкае, бо ў покуці Бог,
Ласкавы і мудры, які нас вартуе.

* * *

Вянуць ружы мае на кустах,
Смажыць вусны гарачы поўдзень.
Напісала б Табе ліста,
Толькі ён да Цябе ня дойдзе.

Ненапісаны некалі ліст...
Дзеці й сёньня ня пішуць, Мама.
Як Ты вестак чакала калісьць,
Я дарма іх чакаю таксама.

Адарвалі ад родных крыніц
І Цябе і мяне дарогі.
Былі толькі законы граніц
І суровасьць жыцьця да зьнямогі.

Калі тае даверра ў сяброў
І бяздумна жыцьцё мітусіцца,
Я хачу цеплыні Тваіх слоў,
Як вады з наднямонскіх крыніцаў.

Была юнасьць, бы Нёмана гладзь,
І снапочкі гадоў на загонах,
Толькі юнасьці не затрымаць,
Бо жыцьцё не мяняе законаў.

Гады плечы дадолу мне гнуць,
Жыцьцё скроні даўно пабяліла,
Напісала б, як ўнукі жывуць
Ды шчабечуць, як Ты гаманіла.

Напісала б пра сьлед маіх дзён,
І пра дум непакорных узвышшы,
І пра песьні з Тваіх верацён,
Толькі сёньня Табе не напішаш...

* * *

Мне патрэбны бор стары сасновы,
Дзе на рукі сочыцца жывіца,
Мне патрэба роднай чыстай мовы
З сырадоем у сяле напіцца.
Мне патрэба праўды неўміручай
Так, як з ніваў жыта, хлеба ўволю,
Песьні у бясёдзе мілагучнай
І спагады для людзей ў нядолі.
Слоў айчынных, слоў сардэчных жменю,
Ў родных хатах болей калыбеляў,
Мудрасьці мінулых пакаленьняў,
Велічы сьвяточнай у нядзелю.
Цеплыні суседзкае сустрэчы,
Хаты ціхай, добрай, мірнай працы
І адносін нашых чалавечых:
Быць людзьмі, ня толькі імі звацца!

* * *

Йзноў басонач іду па расе,
Дзень, народжаны з ночы, вітаю.
Вецер сонца ў праменнай красе
Ўжо на раніцу выганяе.

Чутна ўсюды птушыны сьпеў,
А здалёк, на старым гарадзішчы,
Сярод лісьцяў разбуджаных дрэў
Салавей, не сьціхаючы, сьвішча.

Прачынаюцца паплавы,
Яшчэ вецер балотам блукае
І паволі з расою з травы
Туманы, бы той вэлян, згартае.

Мне здаецца, я зноў праз гады
Стаю ў бэзам абсаджанай хаце,
Бачу бацькавых крокаў сьляды,
Чую, як прачынаецца маці.

* * *

Адзінока ў гарачцы ляжу,
А суметы ад сонейка таюць,
І за вокнамі стук капяжу,
І свавольна вятры пралятаюць.

Ужо гіне ў палёх белізна,
Неба сьвеціцца сіняе, сіняе,
Працягае далоні вясна
Да гусінага, першага выраю.

Сьніцца наквеці рожавы дым,
Матылькі на праменьнях павісьлі,
Вецер з поля, пяюн малады,
Каля вокан запутаўся ў вішнях.

* * *

Раніца, як марыва. Травы у расе.
Цень ляжыць ад явара на маёй страсе.
Праляцелі стаямі нада мной грачы.
Ад жыцьця прыстала я, час і на спачын.

Шуміць вецер з кронамі, абтрасае сон,
Пахаджае промнямі сонца ля вакон.
Толькі гасьне марыва, серабро ў касе, —
Цень ляжыць ад явара на маёй страсе...

## МАЛАДЗІК

Не спыняй, ня кліч мяне ў зазор'е,
вось іду басонач па зямлі.
З паплавоў раскалыханым хорам
мне вятры насустрач загулі.

Мые твар свой ў цьмянай ручаіне
адзінокі кволы маладзік,
з ціхай хаты выбегла дзяўчына,
на далонях вынесла рушнік.

Ён узорны, вышыты па белі,
ўвечары маланкай зіхаціць,
час дамоў, зачыніць маці дзьверы,
а дзяўчо чакае ўсё, стаіць.

Аб зазор'і марыць, сьніць аб шчасьці,
незнарок касу перапляла,
а зямля свае ёй бае басьні,
дарагая, родная зямля...

Паплыў месяц па нябесным ўлоньні
адзінокім зораным шляхом,
не прыпаў аблічам да далоняў,
жаль, ня выцер твару рушніком...

## ГРОМ

Дзіўны мой дом быў у юнасьці,
дзьверы насупраць вятроў,
шчодрае сонца да любасьці,
сьнегу зімой — да галоў!

Стыў ля старога магільніка
камень, што мохам аброс,
птушкі пісалі мне крыльлямі
вершы на карце нябёс.

Добра дружыць было з месяцам,
віхры ўрываліся ў сад,
у хмараў разгойданым месіве
чэрвень маланкі красаў.

Жыцьцё напралом, бездарожжамі,
ў попеле сэрца і дом,
толькі начамі трывожнымі
чэрвеньскі чуецца гром.

* * *

Там пад дрэвамі поўначчу цёмнай
бродзіць ўсё неспакойны мой дух,
ў ноч там віхры на сто верацёнаў
незабыўныя казкі прадуць.
Тупат коней там, грукат калёсаў,
некім згублены сьмех незнарок,
слоў мужчынскіх хвалюючы россып
і дзявочы жывы галасок.

* * *

Шумяць дрэвы ў адвечным лесе,
сонца гойдаюць ў вышыні,
на дно сэрца старая песьня
запусьціла даўно карані.
Гэта песьня гула калісьці
надвячоркамі у жніво,
калі гойдалі ветры калыску
маіх юных, дзіцячых трывог.
Плыла песьня насупраць ночы,
словы падалі на чабор,
вось прарваўся той чар аднойчы
ў мае сэрца і там замёр.
Жаль глыбокі і сум балесны,
з-пад кудзеляў, з-пад верацён
столькі долі, што ў гэтых песьнях,
столькі шчасьця, што з юных дзён.

* * *

Разьвітальна заплакала восень,
Кроплі сьлёз на маім акне,
Ветру вольнага хор стогалосы
Ў чыстым полі сумуе па мне.
Я з раўнін, гдзе туманна і сіне,
Вольна сэрцу, прасторна для дум.
Гасіць восень дажджамі касымі
Жар рабінаў, сячэ лебяду.
Са сваіх я засеяных гоняў,
З нашых рэк, што ўвабралі у плынь
Ліўні сьлёзаў сялянак прыгонных
І няволі агорклы палын.
З беларускай учэпістай гліны
І з рабра наднямонскіх вярбін,
Я галінка ля белага тыну
Напалову забытых сьвятынь.
Маё сэрца з зямлёю зраслося.
Калі восень бярозы сагне,
Ветру вольнага хор стогалосы
Ў чыстым полі сумуе па мне...

* * *

Адплывалі няўпынна ў вечнасьць дзеі жыцьця.
Гадавала жанчына каля сэрца дзіця.
Спавівала каханьнем, апаіла дабром,
Лётам дум палымяных, што плылі з малаком.

Вырас любы саколік дрэнным людзям ў дакор,
Ясным чубам да столі, шчырым сэрцам да зор.
Сны юнацкія сьняцца, душу боль закрануў,
— Не сумуй, мая маці, што пакіну адну.

Твае вочы — сьвітаньне, Твае рукі — цяпло,
Без Цябе ні каханьня, ні жыцьця б не было.
Але мне, маладому, што ля рук Тваіх рос,
Яшчэ хочацца грому з недасяжных нябёс.

Яшчэ хочацца ў моры гураганы спаткаць
І падужацца з штормам, ў злыбядзе не дрыжаць.
З найсьмялейшымі радам ў вышыню, напралом!
Яшчэ хочацца праўды ў мёртвай хватцы са злом!

* * *

Дзень у сумётах сініх дагарае.
    З чужых дарог
я прыду, матуля дарагая,
    на наш парог.
Прынясу з сабой вядзерца
    жывой тугі
ды каханьня з сабой у сэрцы
    па берагі.
Кужалем прасьцеле мне дарогу
    белы сьнег,
можа, месячык двурогі
    твой знойдзе сьлед.

## СОНЦА ЯСНА ЗАСЬВЯЦІЛА

Сонца ясна засьвяціла,
пухам сьнег ляжыць.
Запражы каня, мой мілы,
ў сані запражы.
Працу адлажы на потым,
кончым ўсё на днях,
адчыні шырэй вароты
на бясконцы шлях.
Хай ляціць наш конь стралою
ў цёмны лес далей,
атулі мяне палою,
прыгарні цясьней.
Хай званочак льецца звонка,
калі мы з Табой,
мне так хочацца разгону,
песьні маладой.
Запяі, як пахне ўлетку
чабаровы цьвет,
і аб тым, як раз паэтку
пакахаў паэт.
Песьняю скажы, славамі
верхавінам дрэў,
як ён вёў яе сьнягамі,
ў сьцюжу сэрцам грэў.
Глянь, прад намі раздарожжа
залатым шляхом,
можа, заўтра ўжо ня зможам
паляцець разам.

І таму пад сьпеў, што льецца
ў даль свае зямлі,
гарачэй мяне да сэрца
сёньня прытулі.

* * *

Гутарка сэрца людзкога бяз слоў,
Прыліў цеплыні і павагі.
Можа, так прачынаецца ў душах любоў
І шчасьця няўлоўная смага?

Ён неяк загадкава вокал глядзіць,
Лішніх слоў не рассыпле ніколі.
Хочацца думкі яго прасьлядзіць
Агеньчык, што з нейкага болю.

Крокам нябачным прыходзіць ў спакой,
Тайну думаў, бы кніжку, гартае,
Словам харошым, бы шчырай рукой,
Непрыкметна душу закранае.

Бы юнасьць імкнецца на белым кані
Ды сонейка бродзіць ля весьніц.
Туман адзіноты і сумныя дні
Ператварыліся ў песьні.

## ВЕЦЕР

Вецер лісьцямі кружыць, кружыць,
бабам лецейка тчэ павук,
была жонка — сяброўка ў мужа,
вусны з мёду і двое рук.
І яшчэ было вераценейка
яе ўласных, сьвітальных дум,
былі вочы і было сэрцайка —
палымянае, на бяду.
Солад чарай скупой адмераны,
страж нябачная у дзьвярох,
куты сумныя, дзянькі шэрыя:
«Ня йдзі, жоначка, за парог»...
Вятры гналіся, вятры біліся
чалом ў дзьверы, крылом ў акно,
варкавалі па-галубінаму,
з сабой вабілі ў буралом.
Тут пялюшачкі, тут падушачкі,
воля мужава, строгі гнеў,
кругом розныя пабракушачкі,
а за вокнамі ветру сьпеў.
Віхры блытаюць, віхры кружацца.
Давялося ёй ўпершыню
ляцець з некім, ад віхраў дужайшым,
не ў абдымкі, а ў вышыню.
Ўжо ня жоначка паслухмяная,
здань крылатая угары
уздымаецца над туманамі,
даганяюць яе вятры.

* * *

Песьня каронай на голаў лягла,
цярнёвым вянком на чало.
Песьня-сяброўка з малога сяла,
скромная, як сяло...

Хочацца рукі шырока разьняць
і даць ёй свабодны ўзьлёт.
Хай кружыць, варкуе, пяе, як вясна,
прарваўшы праменьнямі лёд!

## САЛАВЕЙКА

Ні сялянскі, ні панскі,
проста шчодры, нічый,
пяяў з чыстае ласкі
салавейка ўначы.

Ў белай вішняў парошы
песьні вёў да відна
без падзякі, бяз грошай,
бо дастаў іх дарма.

## НАЧНАЯ АКВАРЭЛЬ

Такая ноч, не шалахнецца вецер,
галінка не зварушыцца назьдзіў.
На сіні хмар, бы залаты брасьлецік,
прынадна сьвеціць кволы маладзік.

Ў акне сьвятло апошняе пагасла.
Мядзьведзем расьцягнуўся цёмны бор.
Ў такую ноч адны толькі пэгасы
капытамі кранаюць ясных зор.

* * *

Цягнецца ў неба таполя.
Шлях нацянькі да сяла.
Я заблудзілася ў полі,
сьцежкай крутою пайшла.

Явар ў задуме глыбокай
гольлі схіліў да зямлі.
Ёсьць ў нашым краі урокі,
недзе й мяне ураклі...

Пахла ля ног канюшына.
Буйна цьвіла сенажаць.
Маці мяне навучыла
з родных дарог не змыляць.

Часам спынюся ад болю,
моўчкі пот вытру з чала.
Я заблудзілася ў полі,
сьцежкай крутою пайшла.

* * *

Даўно за поўнач ўжо, а мне ня сьпіцца,
Няўмольна міма пралятае сон.
Мядзьведзіца бліскучай калясьніцай
Правезла хмары ля маіх вакон.

Рассыпала багацьце зор па краі,
З расою буйнай ўпалі на мяжу.
Я ў сэрца, бы ў далоні, іх зьбіраю,
Шнурамі слоў, як пацеркі, ніжу.

Ніхто ня чуў, ніхто мяне ня бачыў,
Лёт дум маіх закрыла ценем ноч,
А я, здаецца, чула голас матчын,
Свой юны сьмех, што адзьвінеў даўно...

* * *

На ашпараных сьцюжаю дрэвах
Промні сонца, цяпло і сьвет,
Дрыжыць лісьце, кружыць няпэўна,
А на лісьці сьмяротны сьлед...

Не сагрэць ўжо замерзлага ў промнях,
Акалеламу не ачуняць,
Будзе вецер асеньні і позьні
Іх пад дрэвамі расьсьцілаць,

І пяяць, і чакаць няўпынна
Да другой, маладой вясны,
І вітаць зноў жыцьцё на галінах,
І чакаць пераможнай красы.

Нігдзе пэўнай няма каляіны,
Ўсё ў жыцьці, як вясьняны капрыз,
Расьцьвітае, красуецца, гіне
Зьмерзлым лісьцем ля сонечных брызг...

* * *

Праляцелі гады з разлукаю,
боль туманамі уваччу.
Ты гаворыш, а я ўсё слухаю,
ты пытаеш, а я — маўчу.
Слоў ня хопіць, каб боль наш высказаць,
ўсе надзеі, усю тугу,
успаміны ваўкамі рыскаюць,
зноў, здаецца, чутно пургу.
Распагодзіцца, боль уляжацца,
дум уціхне пчаліны рой, —
ўцякла доля ад нас з пакражаю,
наша шчасьце ўзяла з сабой.

* * *

Іду адна, а прада мною — ноч.
Шырокі шлях, нязьдзейсьненыя мары.
Густая цемень сьцелецца ля ног,
А бледны месяц партызаніць ў хмарах.

Каля дарогі дрэвы сталі ў строй
Шыракаплеча і неперaможна.
Дзесь у сяле сабакі між сабой,
Як часам людзі, сварацца бязбожна.

Сяло ня сьпіць, гараць агні здалёк,
За імі дом мой, там ніхто ня сьвеціць...
Страсае ціха росы на пясок
Зусім нямы мой спадарожнік — вецер.

Шляхі вайны. Па іх іду ўсю ноч.
Разьведчык-месяц з хмараў выглядае,
А росы, росы сыплюцца ля ног,
З вачэй ці з траў, я і сама ня знаю...

* * *

Рукой хтосьць чорнай дакрануўся крыльляў
і струн душы, і струны не зьвіняць.
Зноў груганы свабодны лёт спынілі,
на шлях свой чорны звабіць наравяць.

Я ад зямелькі крыльлем адаб'юся
і абміну ў палёце чорны жах.
Ўзьлячу душой са сьцежак Беларусі
на недасяжны, на паднебны шлях!

Ніхто ня вольны раіць нам, ні сватаць,
пакутамі скарочваць нашы дні.
Свая туга, свае шляхі ў крылатых,
і праўды сьвет ясьнейшы з вышыні.

* * *

Навокал сьнег, бы сівізна на скронях
Маёй зямлі, застыўшай ад вятроў.
Гляджу на шлях, нейк сумна мне сягоньня.
Прачнуцца б сэрцу ад трывожных сноў.

З-за грудаў хмар ледзь заблішчэла сонца
І ўрэзалася ў неба, бы лямеш.
Я ніці дум вію на верацёнцы
І з пасмаў слоў сную і тку мой верш.

Прамерзла крыху, як той дзень зімовы.
Завеі сьвіст заместа салаўя.
На ўзьлесьсі сосны строга хмурацць бровы.
Суровы гімн пяе зямля мая.

* * *

Сьцюжа. Вецер толькі дзіка гаспадарыць,
Пралятае, злосны, вуліцай насьпех,
То скубе пад небам, быццам гусі, хмары
І на землю сыпле белым пер'ем сьнег.

І, здаецца, з ветрам кружацца лятарні,
П'яныя ад песьняў, як пад Новы Год,
Раскідаюць, сьцелюць бледны сьвет янтарны
На дыван пушысты, на бліскучы лёд.

## ПАЗЁМКА

Дзіўная сёньня з полем гаворка,
ляціць пазёмка з горкі на горку,
ўздымае вецер сьнег пад нагамі,
гоніць, ўсё гоніць паміж кустамі.
Я тут, і вецер, і месяц — трэці,
здаецца, душу ў далонях песьціць.
Ноч наступае насустрач, воддаль,
гамонім з полем на мове роднай.

## З ПАГАНАЎ Я

Ныраюць сані ў белыя сумёты,
і бель пластоў на гольлі яліны,
сьняжынкі таюць на гарачым лобе,
а коні ймкнуць. Сьнег сыпле з вышыні.
У неба дубоў ўперліся кароны,
стаяць яны, равесьнікі вякам,
бы стройныя дарыцкія калоны,
нагадваюць стары, антычны храм.
З паганаў я. Красе зямлі малюся,
ў сябе ўбіраю веліч і спакой,
а коні ймкнуць шляхамі Беларусі,
сьняжынкі таюць на вачах сьлязой...

## ЗА ГАСПАДАРА

Адкінуўшы ўбок блытаніну
чужых надакучлівых слоў,
іду я старой каляінай,
забытаю сьцежкай дамоў.

І кожны мой крок — то памяць,
позірк — сустрэча з былым,
раны старыя паляць,
боль вочы грызе, як дым.

Я чую, як мёдам ліпнёвым
з вуснаў жанчыны любой
льецца радзімая мова
і гоіць нязьлечаны боль.

Хачу на пачэснае месца,
ля вышытых ручнікоў
за стол наш дубовы сесьці
і склікаць ў застольле сяброў.

І кінуўшы сэрца насустрач,
другія агнём разбудзіць,
і хлеба духмяную лусту
пароўні усім разьдзяліць,

ды з чаркі, па бераг поўнай,
пад веры развогнены жар
таго сёньня выпіць здароўе,
хто гэтай зямлі гаспадар!

* * *

Ціха ад дрэваў лёг цень на страху,
Гольлем на шыбахваконных.
Зораў, бы маку, на Млечным Шляху.
Месячна. Ясна. Бяссонна.

Роднае неба трымціць нада мной,
Зоры ў траву ападаюць.
Ходзіць мінуласьць нячутнай ступнёй,
Вякі з цішынёй размаўляюць.

Льецца пад ногі мне месячны сьвет,
Дрэвы чубы пахілілі.
Продкі мае тут пакінулі сьлед,
Ўнукі з яго б не змылілі...

## З МІНУЛАГА

Восень прарочаць панікшы юргіні,
Сталі туманы над рэчкаю млець.
Небам прасторным, шляхом цёмна-сінім
Гусі ўзьняліся за мора ляцець.

Ходзяць дзяўчаты удзень на капаньне,
Ўвечары труць свой адмочаны лён,
Песьні з-пад церніц гучаць аб каханьні
Цудным, вясёлкавым марам ўздагон.

Хто жа насіць будзе з лёну кашулю,
Хто рушніком утрэ, зморанаы, пот,
Хто ж каля вішняў да сэрца прытуліць,
Цалуючы вочы і вусны як мёд?

## ПАМЯЦЬ

Памяць — вечны сябра, неадступны цень,
непагаслых мараў залаты прамень.
Закідае невад у мінуласьць дзён —
ў надвячоркаў сьпевы, ў шэпты ля вакон.

На чужыя воды, плыні, берагі,
у ліхую воддаль, маразы, сьнягі
цягне, цягне ноччу залатую сецьць.
Памяць не нябожчык, ёй і не сатлець.

* * *

Мне ня сьпіцца. Зноў ноч без спагады
Сумна позьні адмервае час,
Ў паднябесьсі гдзесь з месяцам радам
Неакелзаны бродзіць Пэгас.

Вышыня недасягнутых мэтаў,
Непагашаных думаў агонь.
Мне б акелзаць яго да расьсьвету,
Пакуль ценем ня стане той конь...

* * *

Цішыня раўнамерна плыве за вакном,
Як жыцьцё без прынады, бяз сьмеху.
Часам вецер зазвоніць аб шыбу крылом
Ці даўжэй б’е з разгону аб стрэху.

Я лічу павароты ўжо пройдзеных дзён,
Тых, што прыдуць, спазнаць не умею,
Час плыве, ўсё ня сплю. Заблудзіўся мой сон
Ва ўспамінах суровых завеяў...

* * *

За акном у сутоньні
сонца нікне са стрэх.
Дождж мне вымыў далоні.
Шчокі выбеліў сьнег.

Ільняную кашулю
на мой змучаны стан
каб на ноч апранулі,
ды паслалі дыван,

ды паклалі на ўзьлесьсі
у старым дзірване,
каб цягучыя песьні
калыхалі мяне.

## ЧУЖЫНЕ

Нэонавым, такім рэкламным вечарам,
шляхом сваіх неугамонных дум,
о край чужы, я да цябе даверчыва
ужо ніколі болей не прыду.
Славяне славяцца адвагаю, гасьціннасьцю
ці партызанскай мужнасьцю, як мы,
славянкі — любай цеплынёю, літасьцю.
Іуда — гэта не славянскі міф.
Твой пыл мне з ног у вязьніцы асыпаўся,
да сэрца ж ён ніколі не прыстаў.
Няслаўна ўсё, што срога і бязьлітасна,
людзкая вартасьць — мера велькіх спраў.
Нягадана мне на шляху сустрэчаны,
прадаўшы ў путах не мяне адну,
чужы, ня братні, з людзкасьцю разьвенчаны,
я да цябе ніколі не прыду...

## НЕ КРАНАЙ МАЙГО СЭРЦА

Не кранай майго сэрца прыцішаных струн,
Песьні больш не прасі салаўінай.
Чуеш? — Восень ў садох ціха ўдарыла ў сум
Па бязьлістных счарнелых галінах.

І пяшчоты ласкавай ўжо больш не прасі —
З жураўлямі яна адляцела,
Сьціхлі ў сэрцы маім даўных дзён галасы,
Як жыцьцё на палёх асумелых.

Ўпарта думы мае ты ўсё хочаш сабраць,
Ды дарма, — быццам лісьце увосень,
На пустыя палі, на лугі, сенажаць
Сумны вецер і іх паадносіў.

Пакуль даль заруніць, пакуль прыйдзе вясна,
Не хачу я чырвоных караляў,
Іхна чырвань цяпер — гэта зводна мана,
Глянь, каліна свае пагубляла.

Ды ў далонях ужо не трымай маіх рук,
Бачыш — птушкі ўзьляцелі над гаем,
І па небе паплыў доўгі, вольны ланцуг...
Так, як іх, — і мяне не ўтрымаеш.

## ЧУЖЫНА

Эх, ліхая чужына... Ня выжыў бы тут,
Каб ўспамін родных ніў не лялеяў,
Каб ня сьніўся начамі пакінуты кут
І душы не кунежыў надзеяй.
За ўсю радасьць тваю лепша дома нуда,
Ў нашым полі глухім адзінота,
Там бы родную песьню булькоча вада,
Каня тужыць адна над балотам.
Там ад траваў і красак на межах гусьцей,
І пад буйныя ветру павевы
Весялей там шапоча густое трысьце,
Прыгажэй нагінаюцца дрэвы.
З родных сёлаў і з ніў міла, звонка здалёк
Песьня к сэрцу тугой далятае,
Вецер, быццам мана, ў белы, ясны клубок
Павуціньне ў палёх павівае.
А ты каменным сэрцам так срога маўчыш, —
Ды і сэрца, магчыма, ня маеш, —
Не табе зразумець, чаму думы ўначы
Вечна рвуцца далей небакраю.

* * *

Песьняў хочаце шчырых...
Ўсюды чую: «варкуй».
Не, разьбілася ліра
У мароз аб кірку,
Калі кволыя струны
Нацягнулі на дрот,
Стаў на душу падкуты
Канваіравы бот,
Калі нехта мне сына
Адарваў ад грудзей,
Калі згасла лучынай
Мая вера ў людзей.

* * *

На прыпечку мурлыча кот,
гадзіньнік мірна б’ецца,
і сэрца шыфраваны код
чутно ў цішы, здаецца.

Маўчаньне, цемень угары.
Насуперак спакою
я з вамі гутару, сябры,
тугі мае прыбоем.

* * *

Калі бачу лютую няпраўду,
Ўсю хлусьню, што кідаюць на нас,
Я хачу, каб ты быў крыху радам,
Як апора ў самы трудны час.

Каб слаўцом ці хоць сваім маўчаньнем,
Думкамі, што йдуць з маімі ў такт,
Адагнаў з чала мне боль адчайны,
Бо сама ня спраўлюся ніяк...

Каб ў часы сяброўскае сустрэчы,
У жыцьця цяжкога пералом
Расказаў аб велічным, аб нечым,
Ад чаго б мне сэрца ажыло.

Не шукаю у жыцьці апоры,
Ўсім сама гатова памагчы.
Гэта ўзьлёт мой прыпыніўся з гора,
І таму са мною — памаўчы...

* * *

Сьнег пластом. Ляцяць шпаркія сані,
коні ў шэрані, ў белі сады,
родны край, і шляхі тыя самыя
ў даль палёў, ды ня тыя гады...
Куды едзем? — Ўжо бліжыцца вечар,
боль нясьцерпны і сьлёзы як град...
— Там, гдзе дом наш, даўно ўжо пустэча,
заварочвайце коней назад...
Ймгла былога, дымок успамінаў
міражы залатыя плятуць,
ажываюць сьляды ў каляінах
дзён мінулых — якіх не вярнуць...

* * *

Кажуць, што праўды няма на сьвеце,
дружба людзкая — словы на вецер,
вернасьць і сталасьць — як лёгкі дым,
пышуцца словам да першай бяды.

З кім бы бяды ні дзяліў папалам, —
ў горы, ў нягодзе апынішся сам,
певень і тройчы не пракрычыць —
кінуць самотнай цябе ўначы.

Як добра, што сонца ня гасьне ўгары,
і ветры гамоняць са мной, як сябры,
і дождж аблівае, змывае сьлязьмі
памяць аб тых, каго звалі людзьмі.

## БЕЛЫ СОН

Белы сон, толькі неба здалёк
ў мігатлівым, брыльянтавым маку.
І скрыпіць пад нагамі сьняжок,
ды гамоняць з марозам сабакі.

Небам месяц брыдзе наўздагад.
Беляхціць пад сумётамі поле.
Толькі ноч, бы на нечы загад,
пахавалася соснам пад гольлі.

Праз расплёсканы месячны сьвет
з нерасплёсканай шчыраю верай
ў бесканечны дабра запавет
йду і сілам ня ведаю меры.

...Прамінулі, прабеглі гады,
сэрца зьдзеку жыцьця не забудзе.
Мне ж здавалася, юнай, тады,
што на сьвеце харошыя людзі...

## НА ВАРЦЕ

Зашумелі травы на лугох,
дзяцеліна сьцелецца багацьцем,
бэз асыпаў лісьцем твой парог,
Расьціславе, адзінокі браце.

Ноч варожкай выпаўзе з альшын,
на ўзьбярэжжы туманамі ляжа;
ля зарослых ў полі каляін
цені выйдуць, як начныя стражы.

Скалыхнецца тапалёвы гай,
зашуршыць страхой амшэлай вецер
і шугне з загуменьня пугач
да ачыма дзікімі засьвеціць.

Доўга ўмее валачыцца ноч...
Сон ачэй адкрытых не кранае...
Толькі ўздох прыцішаны чутно,
быццам нехта ля кутоў блукае.

І табе здаецца сярод цьмы,
што з глухіх, чужых сусьветных даляў,
з пушч сібірскіх зноў прыходзім мы
да тых сьцен, якія ўзгадавалі.

Пот зьлівае чуб твой палавы,
рэчаістасьцяй здаюцца мроі...
Хто жывы — а хто мо й не жывы, —
ўсе прыйшлі к табе ў гняздо старое.

Ноччу з намі ты як брат і сын,
а калі загляне сонца ў вокны —
ты ізноў у зелені адзін,
дзяцеліна сьцелецца навокал...

Але днём душа тугой гарыць,
лятуць вочы ластаўкамі ў далі...
На гасьцінец саджаны глядзіш —
ўсё кагосьці сумна выглядаеш...

Лёс раскідаў нас па ўсіх канцох,
ты ж адзін грудзьмі супроць нягодаў
сьцеражэш радзімы наш парог,
не растрос яго каб прагны вораг.

Вечна, родны, не бывае цьма —
заўтра сонца засьмяецца, ўзыдзе!
Сьцеражы ж парог аж да канца,
мы к табе шляхамі долі прыйдзем.

* * *

Кожны дзень без Цябе —
гэта плач непагоды,
хаця сьцелецца сонца
праменьмі ля ног.

Кожны дзень без Цябе —
зьдзьвігі без нагародаў,
адзінота у сэрцы
і сум у ачох.

Нельга думаць аб тым,
і я думаць ня буду,
як ўпіваешся ў вочы
агнямі ачэй.

Без Цябе гэты край,
як пустыня бязьлюдна,
гдзе адзін толькі вецер
ў твар сьнегам сячэ.

Кожны дзень без Цябе —
гэта ноч без сьвітаньня,
гэта неба бяз зораў
і юнасьць бяз мар.

Кожны дзень без Цябе —
то жыцьцё без каханьня,
то бяз радасьці сэрца,
бяз Бога аўтар.

* * *

Гляджу на шлях, злы вецер ўсё пяе,
студзіць чало маё, ізноў у поце,
гляджу на шлях, мо там сьляды Твае,
толькі ўспамін іх болей не залоціць.

Дзіця тугі, дзіця маіх цярпень,
адзіны сын, апошні хлопец з роду,
прыйшоў як ноч, як хмара ў сумны дзень,
і адыйшоў, як тая непагода...

## ВОСЕНЬ

Задрыжала зьнячэўку асіна,
подзьмух сьцюжы прабег па кары.
Восень ўсё падграбла, пакасіла,
пазганяла жывёлу ў двары.

Мокры вецер ахрып, занядужаў,
над ракою лякоча вярба.
Павуценьне, апошні свой кужаль,
толькі восень снуе з серабра.

Ты апрануты йдзеш па сэзону,
сыплеш жарты знаёмым, як сват,
плешчуць сьветам нячулым нэоны
на халодны абсьлізглы асфальт.

Мо сумуеш, а можа рагочаш.
Я шкадую, што ты не пры мне.
Грыбны дожджык цябе не намочыць,
мокры вецер цябе не кране.

Лёс суровы страшной агароджай
паміж намі, няшчаснымі, лёг,
ўсё шукаю цябе, не знаходжу,
мацярынскі ня сплачаны доўг.

Веюць віхры асеньнія хорам,
строгай праўды пытаюць ў нябёс
за тваё адзінокае гора,
за дзіцячы суровы твой лёс.

Зноў ударыць — стрываем, каханы,
век мужчынскі ў цябе на плячах,
ўсе мінулыя цяжкія раны —
як рубцы на сталёвых мячах.

* * *

Зьвініць песьня запозьненым шчасьцем,
дождж  з асеньніх туманаў імжыць,
зажылі ўжо сьляды на запясьцях,
толькі ў сэрцы ня хочуць зажыць...

Прыпыніла ўжо доля трывогі,
час надзеямі ў сэрцы гудзе,
толькі памяць пустою дарогай
ўсё сьнягамі, сьнягамі брыдзе.

## НА АКНЕ

На акне маім фіранкі
не ў квяцісты ўзор.
Белыя, як сьцены хаты,
яны вытканыя ў краты,
ў роўны перабор.

Ўжо сьвітае, шэра ў хаце,
за вакном відней.
Я ў трывозе неаб'ятай
зноў спрасоньня бачу краты
на маім акне.

Плывуць хмары.
Боль па твары
ручайком цячэ...
Ах вы, людзі,
хто ж такія
ды на вокны тчэ...

* * *

Плынь жыцьця майго — цёмная ночка,
Йсьці, дык вобмацкам, вокал віры,
Быццам цені, праходзяць моўчкі
Запалоханыя сябры.

А на вуснах смага і прага
Родных слоў без хлусьні, ілжы,
Людзям сьніцца годнасьць, адвага,
Тое сэрца, што не дрыжыць,

Голас той, што праб’ецца ў неба,
Дабрыня, ад якой цяплей.
Ноч, ўсё ціха кругом, усё нема
За жыцьця ля магілы маей...

## СОН

Калі зо сну цяжкога прачнуся
ў сьлёзным поце яшчэ да зары,
адчуваю, як на Беларусі
йзноў мне гойдаюць сэрца вятры.

Ноччу сьняцца ня нашыя далі,
сонных дзеяў нязглыблены вір...
Ўсё як быццам мяне прадавалі,
недзе сілай цягнулі ў ясыр.

І я паланянкаю русай
татарскіх, забытых орд
ўсё з путаў накінутых рвуся,
каб прачнуцца і выцерці пот.

Расплываецца сон недарэчны,
завінулася сонца кругом,
землякі мае строяць бясьпечна
шматкватэрны, высокі дом.

Выязджаюць на рэйсы машыны,
дзеці ў школу ля вокан прайшлі,
а па небе, нявымаўна сінім,
хмары з сном маім адплылі...

* * *

Бесканечна ўсё раняць, як ранілі,
толькі мне гэта ўжо не баліць...
Сумна неяк вясьняная раніца
капусьцяным дажджом імжыць.
Зноў чамусьці лугі туманяцца,
над ракою густы сувой,
што быць мае, няхай тое станецца,
з гэтай чары пілі ж прада мной...

* * *

Схавалася сонейка, праца ня цешыць,
крыльлі зламжыў дагараючы дзень,
пажоўклы лісток, на парог узьляцеўшы,
сумна прыпомніў, што восень брыдзе.
Недзе ў гаях распранаюцца дрэвы,
кідаюць гожае лісьце знарок
пад млявага сонца скупыя сугрэвы
заплаканай восені проста да ног.
А сэрцу другое начамі ўсё сьніцца:
рост і квітненьне, лугоў маладосьць,
громаў разгоны і плёск навальніцаў,
што адмывалі зямлі прыгажосьць.
Восень туманная, сыта і шэра,
цёмныя хмары прыселі на стог,
вецер халодны ўсё стукае ў дзьверы,
госьцем няпрошаным йдзе на парог.
Вецер асеньні ударыў са сьвістам
па гольлі бярозаў, асінаў, вярбін,
быццам забыты стары цымбалісты
рассыпаў па струнах свой восеньскі гімн.

* * *

За вокнамі гасьне дзень,
за вокнамі гасьне белы.
І доўгі перад намі цень,
як тое, што адляцела.

Няспынны наш кожны рух,
і крок старэчы павольны,
і цемень паўзе наўкруг,
упарта паўзе, няўмольна.

Яшчэ асьвятляе шлях
сонца апошнім праменьнем,
крылаў птушыных узмах —
і прыйдуць на зьмену цені.

Бывайце, мне ўжо пара,
за мною мой дзень клапатлівы.
Каму засьвеціць зара,
той яшчэ з вас шчасьлівы.

* * *

Далі табе нямала чарак
На твой нацыянальны сон,
Народ сьвінарак і даярак,
Каб толькі не беларусоў.

* * *

Хай славіцца наш беларускі род,
душой з вясны, а воляю са сталі,
каб з гнёздаў нам ня пеўнікі на плот,
а горда арляняты вылятালі!

* * *

Атлас — гэта сіла! Аберуч той бог
трымае зямлю, не сутуліцца!
Калі ж ляжа край наш на вашых плячох,
глядзеце, каб сэрцы ня гнуліся!

* * *

Славяцца людзі гуманнасьцю спраў,
Ня сілай, а веліччу сэрца.
У хвіліну цяжкую хто руку падаў,
Той братам навек застанецца!

## БЫЦЬ

Быць, то на ўласную сьцежку ступіць,
на сілы свае спадзявацца.
Не апірайцеся на стаўпы,
удзел ўсіх стаўпоў — хістацца.

* * *

Словы пустыя — пена,
йлжывыя словы — праклён.
З такіх жа ня зродзіцца пэўны
фундамант заўтрашніх дзён!

* * *

Колькі дум маіх ні раскулачвалі,
нат ў сьмяротна трывожны час
не назвала я «мамай» мачыхі
і душы не здала ў калгас!

* * *

У кожнага зара сваіх надзей,
радасьці свае, свае турботы.
Таму ня можа звонкі салавей,
пяюн вясны, сьвістаць па воўчых нотах!

* * *

Моцны дух наш — дарагое рэчыва,
Словам, працай славімся здаўна.
Сьцеражэце ж годнасьць чалавечую.
Як жыцьцё, яна у нас — адна.

* * *

Мудрасьць сьпелую сівых вякоў
п’ю з народных жывых крыніцаў.
Паважаю чужых багоў,
ўсё ж прывыкла сваім маліцца!

* * *

Йду шляхамі крутымі,
Ў небе зоры мігцяць.
Праўда — посах пільгрыма
Ў бездарожжы жыцця...

* * *

Радасьць як вецер,
каханьне як госьць.
Дасягнутасьць шчасьця
ўжо шчасьцем ня ёсьць.

* * *

Нада мною ляглі туманы.
Замест слоў тваіх — вецер асеньні.
Шлях мой, шлях нецікавы — зямны.
Пераходжу на шлях летуценны.

* * *

На зоры глядзець немагчыма.
Міргаюць з-за хмар, бы праз дым,
і сьвеціцца месяц-лучына
на прыпечку неба глухім.

* * *

Час, бы нітка льняная, прадзецца
месяцамі, гадамі, няўпынна.
Ўсё, што сёньня трывожным здаецца,
заўтра стане няўвартым ўспамінам.

* * *

Іду скрозь зялёныя шолахі дрэў,
Адна між прадоўжаных ценяў.
Пух тапаліны на скронях асеў.
Ня здуць яго ветрам асеньнім...

* * *

Сіратліва ўзіраецца топаль
У асеньніх дарог каламуць.
Калі ў сэрцы паэта попел,
У агонь яго не раздуць.

## З НАМІ БОГ

Каляда, Каляда, зьзяе зорка ўрачыста,
Блаславенная ўзьнёсласьць славутых хвілін,
Ў скромных яcьлях ляжыць ля Марыі Прачыстай
Богам пасланы, нованароджаны Сын.

Ад шчасьлівай сямейкі сьвятло прамянее,
Пастушкоў пакланеньні, дары каралёў,
Слова сталася целам, збыліся надзеі,
Абяцаны Сын Божы на землю зышоў.

Чаму столькі трывог, чаго Ірад баіцца,
Цар магутны, азброены сёньня дрыжыць
І Дзіцятку ідуць мудрацы пакланіцца,
Што ля Маці у яcьлях быдлячых ляжыць?

Ён ня зброяй прыйшоў забіраць ім дзяржавы,
На чало залатую карону надзець,
Яму з церняў наложаць карону няслӑуна,
Ведучы ў цяжкі час на пакутную сьмерць.

За людзей будзе сьведама йсьці на расьпяцьце
І пакорна успрыме назначаны лёс,
Навучаць будзе Ён, што ўсе людзі ёсьць брацьця
І што роўныя ўсе перад Богам з нябёс!

Яго моц ў дабрыні, Яго сіла у слове,
Што плыве з найсьвяцейшых, прачыстых крыніц,
Яго моц у цярпеньні, ў няземскай любові,
Ён любоўю прыйшоў гэты сьвет пакарыць.

Нават ў дарозе пакутнай, апошняй,
Калі ўся ад гневу зямля задрыжыць,
Пад крыжа свайго непасільнаю ношай
Род людзкі будзе Ён благаславіць.

І ня ўпадзе ніхто у Яго абароне,
Ён стане ахвярай найбольшай з ахвяр,
І Яго толькі кроў з-пад цярнёвай кароны
Сплыве кроплямі болю на змучаны твар...

Ён з мёртвых устане, ўваскросьне з магілы,
Любоў пераможа і лютасьць і зьдзек,
І будзе магутнай, адзінаю сілай
З Маці народжаны Бог-Чалавек.

Несьці людзям дабро і любоў сеяць ў сэрцы
І ахвярна за ўсіх на пакуты пайсьці,
Гэта веліч і чын, непадуладныя сьмерці,
Наша вера і шчыт чалавечы ў жыцьці.

Што ж, забіць, ўкрыжаваць — гэта не перамога,
А канец сярод страшных, бясконцых трывог,
А за людзкасьць сканаць — сьмерць, дастойная Бога,
І найбольшая ў сьвеце з усіх перамог!

А пакуль зьзяе зорка, Вячэра, калядкі,
І Вялікае Сьвята прыйшло на парог,
Туліць ўясьлях Марыя Сьвятое Дзіцятка
І пяюць пастушкі: з намі Бог, з намі Бог!

## СЬВЯТЫ ВЕЧАР

Ляціць сьнег на палі, над зямлёю сутоньне,
У задуме бязьлістыя дрэвы стаяць,
Блаславенны той дом, гдзе ўрачыста сягоньня
Ля Сьвятое Вячэры зьбярэцца сям'я.

Ляціць сьнег на палі, нагім дрэвам на плечы,
Чэша вецер задумана косы бяроз,
Цішыня на зямлі. У Сьвяты гэты Вечар
Нарадзіўся у яськлях маленькі Хрыстос!

У бясьсільлі прад ім важнасьць, моц і аружжа,
І дарэмна вялікую праўду спыняць.
Прад Марыяй сьвятой, прад Дзіцяткам нядужым
Каралі на каленях пакорна стаяць.

Сьвяты Вечар у тых, хто Ягонай дарогай
Праз жыцьцёвыя буры адважна ідзе,
Хто спазнаў, пакахаў Чалавека і Бога,
Што любоў і збавеньне прынёс для людзей.

Блаславенны той стол, гдзе Сьвятая Вячэра
Ўсіх з далёкіх дарогаў склікае дамоў,
Блаславенныя людзі, гдзе праўда і вера
Ў братэрства народаў, ў дабро і любоў.

Блаславенныя тыя, што праўды жадаюць
Для маленькіх і велькіх, каб ясны ўсім лёс,
Што ня ведаюць страху, ў змаганьні трываюць
За любоў між людзьмі, што прарочыў Хрыстос.

І, зялёны ад пушчаў ды сіні ад лёну,
Што ад нягодаў суровых зьнямог,
Блаславенны хай будзе і Край наш хрышчоны,
Гдзе ў сьвятынях і сэрцах жыве яшчэ БОГ!

Калі скрозь неспакой, а у сэрцах трывога,
Сьмертаносныя сродкі з пагрозай растуць,
Блаславенныя ўсе, што ідуць з імем Бога,
Чалавечнасьць, як шчыт, прад сабою нясуць!

Дык са Сьвятам, БРАТЫ, з нараджэньнем Хрыстовым,
Вытрываласьці ў працы, ў дабры перамог,
Там, гдзе мір і любоў, гдзе натхнёнае слова
На Вячэры Сьвятой, з тымі праўда і БОГ!

* * *

Каляда, Каляда, прачынаюцца зоры,
Неба будзе здавацца ялінкай ў агнях,
Ў гэты вечар ў зямлі бесканечнай прасторах,
Як у храме сьвятым — цішыня.
Шчасьцем Маці-Марыя, радзіўшая Сына,
Ля Дзіцятка праменіць няземскай красой,
Ўскалыхнула нямую жывёлу навіна,
Забляялі ягняткі дзіцятку на сон.
Не ў багатых харомах, а ў ясьлях убогіх
Нарадзілася праўда, любоў і дабро.
Ясна сьвеціць зара, і на Зорку дарога
Ў Бэтлеем гэтай ноччу вядзе мудрацоў.
Заміраем душой ля Дзіцятка на сене,
Над маленькай галоўкай праменьні сьвятла,
Прыйдзе час, і за нас ускладуць Яму церні,
І закапае кроў са сьвятога чала.
Прыдзе Дзень, уваскросьне і зло пераможа
Ва ўсясільнай любові сьвятое Ягня,
Гэты Бог, гэты Сын чалавечы і Божы,
Сьмерць прыняўшы страшную «за друзі свая».
Сьвеціць, зьзяе зара, як калісьць ў Бэтлееме,
Усё неба здаецца ялінкай ў агнях,
Ля прачыстай Марыі Дзіцятка на сене,
А на Божай зямлі — цішыня.

## КАЛЯДА

Верным сэрцам, хоць болем параненым,
Ад зямелькі радзімай, ад хат,
Мы вітаем Вас, Брацьця каханыя,
З Новым Годам, са Сьвятам Каляд!

Хоць дарогі занесла сьнягамі
І прастор разьдзяліў нас круты,
Ў гэты Вечар мы думкамі з Вамі,
Дарагія Сястронкі, Браты!

Пажаданьні і шчырасьць прымеце,
Каб здаровымі доўга жылі,
Няхай добра Вам будзе на сьвеце,
Як на бацькавай, роднай зямлі.

Галаву пахіляючы нізка
Прад маленькім абліччам Сьвятым,
З той зямлі, што была Вам калыскай,
Я Вам шчасьця жадаю, Браты!

З Новым Годам, з Каляднымі Сьвятамі
Ад яліначкі з нашых лясоў,
Ад сьвяточнай Куцьці, ад пакінутай хаты,
Ад заплаканай Маці і сівых бацькоў.

Брацьця нашы з далёкіх краінаў,
За сталом нашым месца для Вас,
Ўсё чакае на вернага Сына,
Што вярнецца дамоў ў добры час.

А пакуль: хай бясхмарнаю будзе Вам доля
І харошыя людзі заменяць братоў,
Частка нашай душы, каласкі нашы з поля,
Ў час Вячэры Сьвятой шлем Вам нашу любоў!

## КАЛЯДА

Вецер хлешча з нялюдзкаю сілаю,
Забінтоўвае дрэвы ў сьнягі.
З Новым Годам, Браты мае мілыя,
Беларускі наш род дарагі!

Мне сьлязьмі затуманіла вочы,
Боль такі, што нічым не уняць,
За сьвяточным сталом ў адзіночку
Буду шчыра усіх ўспамінаць...

Век мой позьні і лёс мой няпэўны,
Дум калядных узьнёслы прыбой,
Старой хаты сялянскія сьцены
Мой дачасны вартуюць спакой.

Нашых сэрцаў сьнягі не астудзяць,
Не замрэ у душы дабрата,
Колькі жыць, столькі славіць мы будзем
Нараджэньне Дзіцятка-Хрыста!

Ў праўду Божую, сьветлую вера,
Ў перамогу любові над злом,
Хай спакой ў неспакойныя сэрцы,
Хай сям'я за Калядным сталом.

Сёньня ўсіх мы Вас благаслаўляем,
Неадродную частку сваю,
Хай сяброўства і вера яднае
Вас ў дастойную нашу сям'ю.

Хай адчуюць і тыя, хто з Вамі,
Што у трудны ці радасны час
Мы патрапім для ўсіх быць братамі,
Хто ў бядзе апынуўся ля нас.

Ўсіх за стол свой сьвяточны прымеце,
Болей шчасьця і меней каб сьлёз,
То для людзкасьці ўсёй на планеце
Нарадзіўся сягоньня Хрыстос!

Ён сканаў за прарочыя словы,
Ўкрыжаваны, прабіты кап'ём,
Асьвяціў нашы сэрцы любоўю,
Азарыў нашы душы дабром.

Дык са Сьвятам, Браты, з Новым Годам,
МІР, як праўды сьвяты запавет,
Быць людзьмі, быць дастойным народам,
Славіць БОГА і Божы наш сьвет!

* * *

Кружыць сьнег густым роем над хатамі,
Ў белым кужалі дрэвы, кусты.
З Новым Годам, з Каляднымі сьвятамі,
Дарагія Сястронкі, Браты!

Лёс раскідаў Сямейку па сьвеце
У суровы, няветлівы час.
Калі першая зорка засьвеціць,
Вы хоць думкамі будзьце пры нас.

Калі зьмірацца людзі нарэшце
І дабро пераможа над злом,
Кожны зойме пачэснае месца
За сямейным, за нашым сталом.

А пакуль няхай добра вам будзе
У людзей, што гасьціну далі.
Брацьця нам усе добрыя людзі
На бяскрайных прасторах зямлі.

Ўсім жадаем дабра і здароўя
Ў гэты Вечар калядны, сьвяты.
Ўсіх вітаем з вялікай любоўю:
З Новым Годам, са Сьвятам, Браты!

Ну, а Вас, дарагія, чакаем мы
За сталом, гдзе Куцьця ў нас і мёд
І Вячэра з старымі звычаямі,
Як чакаем ў сямейку штогод.

У жыцьці ўсё складаецца розна,
Часам нават спаўняюцца сны,
Прыляцеце ж, як птушкі да гнёздаў,
Як адзінай зямелькі сыны.

Пажаданьняў у сэрцы так многа,
Іх ня выказаць, не пераслаць.
Заставайцеся, родныя, з Богам,
Жыць Вам доўга і гора ня знаць!

* * *

Бясхмарнага неба туманіцца сінь.
Слова праўды — бы голас ў пустыні.
У малітве гарачай мяне не пакінь,
Сьвяты Божа, мой Ойча адзіны.

Адна сярод злых непрыхільных людзей
У бацькоў і дзядоў маіх краі,
Акрамя Божай ласкі, апекі Тваей,
Я тут болей нікога ня маю.

Праўдай Тваёю мне душу сагрэй,
Будзь сілай маёй і апекай.
Няхай не кранаецца долі мае
Ліхая рука чалавека.

Ад бураў жыцьцёвых мяне сьцеражы,
Задуманых ворагам лютым,
Век мой дастойна пражыць памажы,
Ратуй мяне з мукаў, пакутаў.

Уціш набалелы душы маёй крык
Сярод дзён, ад адчаю трывожных,
Дай голас, каб ў сэрцы людзкія пранік
Дзяцей Тваіх верных і Божых.

Хай праўда Твая азарыць гэты сьвет,
Любоў нам пранікне у сэрцы.
Барані нас ад гора, ад злыдняў, ад бед,
Ад прадчаснай з рук выклятых сьмерці.

* * *

БОЖА бацькоў маіх, БОЖА дзядоў,
Зямлі, Тваім імем хрышчонай,
Божа, што вывеў мяне са сьнягоў,
З ночы бясконца чорнай,

Божа, што сьмерць адвярнуў ад мяне,
Убок адвёў кулю канвою,
У халоднай, ліхой і чужой старане
Была ласка Твая са мною.

Там, гдзе хлеб не расьце, Ты умерці ня даў
У мароз, гдзе ўсё гіне жывое,
Карміў Ты пакутных і абграваў
Ласкай Тваёю сьвятою.

Супраць тупых, разьзяўляючых пасьць,
Што гнулі нас мукай і болем,
Ня даў пахіснуцца, ня даў нам упасьць
І выстаяць ў зьдзеку дазволіў.

Божа, ізноў прад Табой я адна,
Кругом выпаўзаюць зьмеі,
Ўздымаецца лютасьць чужацкая з дна,
Разьюшана хлешча, шалее.

Божа цярпеньняў, любові сьвятой,
Моцы вялікай і цудаў,
Ратуй мяне ў горы апекай сваёй
Ад кесараў ўсіх, ад Іудаў.

Калі ж Твая воля згарэць мне ў агні
Табою пасланых цярпеньняў,
Дух мой, Табой акрылёны, ўздымі
На ўзровень маіх летуценьняў!

Адна толькі сьцежка, ня знаю другой,
Твой шлях для мяне навука,
Пакорная волі ўсявышняй Тваёй,
Калі трэба, я выстаю ў муках.

Толькі зямлі, гдзе ляноў нашых сінь
І горыч крыві ахвярнай,
У ласцы прачыстай Сваёй не пакінь
У апецы над ўсімі ўладарнай.

Народ мой у край наш ў сямейку зьбяры,
Палі захавай нам і пушчы,
Умацуй у сьвятынях Твае аўтары,
Тваю веру у нашых душах!

## У ЖЫРОВІЧЫ

Ляцяць з выраю птушкі, гамонячы,
Прыпадаюць крылом да бяроз.
Завязеце мяне у Жыровічы,
Гдзе ўладарыць Марыя з нябёс.

Там сьвятымі малітвамі, сьпевамі
Дзень вітаюць у храмах сьвятых.
Галубы пралятаюць над дрэвамі,
Зьзяюць промні з крыжоў залатых.

Маці Божая, Багародзіца,
З дабрыні ўся і са сьвятла,
Ты зьявілася у Жыровічах,
Калі груша бела цьвіла.

Твая зьява — сьвятая спадчына,
Ты прышла да нас ў час цяжкі.
Абразок Твой першымі ўбачылі
Басаногія пастушкі.

Прастадушныя і сардэчныя,
На аблічча Тваё глядзяць.
Вось такія, як ў ясьлі з авечкамі
Прыйшлі Сына Твайго вітаць.

Калі цяжка ў жыцьці становіцца,
Ў час пакутны для нас і круты,
Мы ідзем да Цябе ў Жыровічы,
Ў Твой прыпынак Божы, сьвяты.

Табе молімся, Цябе клічам мы,
Маці Божая, памажы,
П'ем вадзіцу з сьвятое крынічанькі,
Славім Сына Твайго на крыжы.

За любоў к Табе ўсюды гнаныя,
Папраз цемрадзь, што навакол,
Йдзем к Табе са сваімі ранамі,
Нясём крыўды з забытых сёл.

Сэрца Божае, сэрца матчына,
Літасьцівае да людзей,
Нясём просьбы к Табе гарачыя,
Дапамогі просім ў бядзе.

Ў нашых храмах дзьверы зачынены,
Не пускаюць нат на парог,
Цемрадзь глуміцца над Сьвятынямі,
Топча душы, ў каторых БОГ.

О Прачыстая, Непераможная,
Дорыш людзям сьвятло і любоў.
З намі вечна будзь, Маці Божая,
Што прыйшла калісьцы да пастушкоў.

Нас зрачыся Цябе не прымусілі,
Нам ня страшна цярпеньняў, нягод.
Маці нашая, Беларуская,
Сьцеражы наш пакутны народ.

Ў дні ліхія, у дні трывожныя,
Калі зьдзеку столькі і зла,
Ты вядзі нас сьцежкаю Божаю,
Да дабра вядзі, да сьвятла.

Сілу ўлі Ты у сэрцы нашыя,
Каб нас ворагі не змаглі,
Каб маглі мы ў хвіліну цяжкую
Быць людзьмі на сваёй зямлі.

Прад Табой на каленях стоячы,
Бачым сьвет, калі ўсюды цьма.
Ласкі, праўды шукаем ў Жыровічах,
Бо навокал яе няма.

* * *

Вецер марозны гуляе над вёскамі,
Далёка яшчэ да вясны.
Дзякуй за шчырыя словы сыноўскія,
Дзякуй за сэрца — сыны!

Такія на вецер ня кідаюць словаў,
За словам рашучасьць і чын.
Зварот Ваш сыноўскі, як подзьмух ліпнёвы
Ў марозную лютую стынь.

Мне цёпла ад вашых пачуцьцяў, мне сонечна,
Як ад акрыленых спраў,
І лёд, што ўжо сэрца марозіў на поўначы
Гадамі — сягоньня растаў.

Знача, ня дарам пурга дабівала,
Сьмерць урывалася ў сны.
Знача, ня дарам за Вас я стаяла,
Дзякуй за сэрца — Сыны!

# КАМЭНТАР

**Скарачэньні назваў зборнікаў Ларысы Геніюш:**

**АРН** — «Ад родных ніў».
**НзН** — «Невадам з Нёмана».
**НЧН** — «На чабары настоена».
**9В** — «Dzieviać vieršaŭ».
**БС** — «Белы сон».
**Лнд** — «Вершы. Рукапісны зборнік з 1945-1947 гг.»
**МіС** — «Маці і сын».

**Іншыя скарачэньні:**

**а., аа.** — аркуш, аркушы.
**адв.** — адварот.
**а/з** — адзінка захаваньня.
**г., гг.** — год, гады.
**дыял.** — дыялектнае.
**закр.** — закрэсьлена.
**ЛіМ** — «Літаратура і мастацтва».
**пад.** — падобныя.
**пар.** — параўнай.
**прысл.** — прыслоўе.
**р., рр.** — радок, радкі.
**рук.** — рукапісны.
**с., сс.** — старонка, старонкі.

Гэты том «Выбраных вершаў» грунтуецца перадусім на матар'ялах з архіву Ларысы Геніюш, які захоўваецца ў ***адзьдзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнае Навуковае Бібліятэкі Нацыянальнай Акадэміі Навук Рэспублікі Беларусь (фонд 31, вопіс 1).*** Далей у спасылках на матар'ялы гэтага архіву нумары фонду і вопісу апускаюцца. Паэтычная спадчына Ларысы Геніюш займае ў яе архіве 181 адзінку захаваньня (справу), агулам каля трох тысяч аркушаў. У гэты лік уваходзяць аўтографы і аўтарскія машынапісы. Пры падрыхтоўцы кнігі, дзеля браку часу, цалкам абсьледваны быў толькі корпус аўтарскіх машынапісаў;

аўтографы браліся пад увагу толькі ў асобных выпадках. Поўнае расчытаньне рукапіснае часткі архіву Ларысы Геніюш яшчэ наперадзе. Асобныя вершы, тэкстаў якіх у абсьледванай частцы архіву не знайшлося, падаюцца паводле кніжных выданьняў ці самвыдаўскіх перадрукаў.

Вершы з АРН прадстаўленыя ў кнізе мінімальна. У 90-я гады яны выходзілі двойчы: у БС і ў рэпрынтным выданьні АРН. Таму ўкладальнік палічыў магчымым шырэй паказаць іхным коштам пазьнейшую творчасьць Ларысы Геніюш, дагэтуль ня цалкам вядомую і больш спрэчную тэксталагічна.

Укладальнік рады нагодзе падзякаваць: А.Мальдзісу, А.Лісу і А.Лойку, апекунам архіву Ларысы Геніюш, — за ласкавы дазвол працаваць у ім; супрацоўнікам адзьдзелу рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН РБ і асабіста яго загадчыцы Я.Кісялёвай — за дапамогу падчас гэтае працы; Ул.Арлову, М.Канашу, А.Лісу, З.Саньку, З.Саўку, М.Тычыну, М.Чарняўскаму, Л.Юрэвічу — за тэксты, парады й маральную падтрымку; С.Андраюку і А.Дразду з выдавецтва «Мастацкая літаратура» — за дазвол выкарыстаць партрэт Ларысы Геніюш з выдавецкага архіву; Ю.Зісэру і М.Хаткевічу — за тэхнічную дапамогу; выдаўцам — за супрацоўніцтва і цярплівасьць; але перадусім фундатару гэтае кніжкі сп. Ю.Лазуту, без якога яе ўвогуле б не было. Вядома, усе названыя асобы не нясуць ніякай адказнасьці за любыя хібы і заганы нашага выданьня, якія цалкам застаюцца на сумленьні ўкладальніка.

Укладальнік будзе шчыра ўдзячны за любыя заўвагі і прапановы што да гэтае кнігі, якія можна дасылаць на адрас: Беларусь, 220050, Менск-50, а/с 167, Міколу Раманоўскаму.

У камэнтары падаюцца наступныя зьвесткі:

*1. Адрас першае публікацыі* (калі верш друкуецца не ўпершыню) *і пазьнейшых кніжных перадрукаў*. Назвы кніг падаюцца скарочана. Недаступныя ўкладальніку замежныя выданьні ня ўлічваліся. Пры вызначэньні адрасоў першых публікацыяў выкарыстоўвалася картатэка пэрсаналіяў беларускага адзьдзелу Нацыянальнае Бібліятэкі Рэспублікі Беларусь.

2. *Дата і іншыя аўтарскія пазнакі пры вершы.* Трэба заўважыць, што датам, прастаўленым у НзН, няма веры. Як піша Данута Бічэль: «Кнігу «Невадам з Нёмана» 1964 года ўкладаў Уладзімір Караткевіч. Каб перадрукаваць асобныя вершы з праскага зборніка 1942 года «Ад родных ніў», ставіў пад вершамі ня тыя даты. Гэтыя змушаныя праўкі ды перапраўкі зрабілі амаль немагчымай як датоўку вершаў, так і збор усіх магчымых варыянтаў» (МіС, сс.5-6). Найбольш веры, вядома, аўтарскім пазнакам, адале, на нашую думку, і самвыдаўскім перадрукам.

3. *Крыніца асноўнага тэксту, выбранага для публікацыі.* Найчасьцей гэта тэкст з архіву паэткі. Знак роўнасьці (=) злучае адрасы аднолькавых перадрукаў, зробленых пад капірку. Так, а/з 178, а.1=4 азначае: аркушы 1 і 4 ў а/з 178 друкаваліся пад капірку ў адной закладцы. Гэтаксама а/з 24, а.8 = а/з 161, а.4 азначае, што пад капірку ў адной закладцы друкаваліся аркуш 8 з а/з 24 і аркуш 4 з а/з 161. Паўсюль, дзе не пазначана інакш, спасылка на архіў паэткі азначае спасылку на аўтарскі машынапіс. Калі ў розных перадруках тэксты супадаюць або адрозьніваюцца мінімальна, то адрасы такіх перадрукаў уводзяцца словамі «Тоесны тэкст».

4. *Праўкі ўкладальніка ў асноўным тэксьце* (апрача безагаворачных, пра якія ніжэй). Зьлева ад падвойных касых рысак (//) ставіцца аўтарскі, справа — наш варыянт.

5. *Варыянты асноўнага тэксту* (уводзяцца словам «варыянты» без пазначэньня адрасу).

6. *Варыянты паводле іншых тэкстаў з архіву паэткі.* Калі варыянт падаецца праз падвойныя касыя рыскі, то зьлева ад іх ставіцца слова (група словаў) з асноўнага тэксту, справа — з адпаведнага неасноўнага. Закрэсьленыя аўтаркаю варыянты бяруцца ў вуглавыя дужкі, у квадратных — нашыя заўвагі. Нумарацыя радкоў — паводле асноўнага тэксту. Калі сярод варыянтаў зьмяшчаюцца слупкі, якіх няма ў асноўным тэксьце, то пры далейшай спасылцы на гэтыя фрагмэнты нумар радка падаецца з зорачкай (напрыклад, *25), а нумарацыя ідзе паводле асноўнага тэксту плюс новыя радкі.

Так, калі замест рр. 21-24 асноўнага тэксту ў варыянце стаяць іншыя 8 радкоў, то пры адсылцы да першага з гэтых васьмёх яго нумар будзе пададзены як *21, а да пятага — *25. Гэта не ўплывае на нумарацыю радкоў варыянту, адпаведных радкам 25 і наступным асноўнага тэксту.

Шматлікія рэдактарскія і цэнзурныя праўкі прывялі да таго, што апублікаваныя тэксты вершаў Ларысы Геніюш часта адрозьніваюцца, і то вельмі значна, ад аўтарскіх варыянтаў, якія захаваліся ў архіве паэткі. Дзеля нястачы месца варыянты паводле ранейшых публікацыяў не даюцца; гэтаксама пры адрасах першай і наступных публікацыяў не адзначаецца, ці адрозьніваецца апублікаваны варыянт ад аўтарскага (або аднаго з аўтарскіх) і наколькі значна. Адрознасьць гэтых варыянтаў змусіла б увесьці ў кнігу асобны разьдзел «Іншыя рэдакцыі і варыянты», які канечне мусіць увайсьці ў будучы збор твораў паэткі.

*7. Тлумачэньне асобных словаў.*

**Прынцыпы падачы тэксту**

Арфаграфія Ларысы Геніюш надта своеасаблівая. Яна асноўваецца на дыялектным вымаўленьні (асабліва што да правапісу галосных); часта, хоць і не заўсёды, адзначаецца асыміляцыйная мяккасьць зычных. Зрэшты, пасьлядоўнасьці ў правапісе няма, і часам адно і тое ж слова на адной і той жа старонцы пішацца па-рознаму. Аўтарская пунктуацыя моцна розьніцца ад агульнапрынятае; для яе, агулам беручы, характэрная перавага коскі над усімі іншымі знакамі прыпынку, а таксама пастаноўка працяжніка не ў канцы радка, а на пачатку наступнага.

У нашым выданьні за аснову ўзятая сучасная тарашкевіца. Пры публікацыі без агаворак робяцца наступныя праўкі:

1. Асыміляцыйныя мяккія знакі ўніфікуюцца паводле агульных нормаў тарашкевіцы (але не ў прыназоўніках).

2. Аканьне-яканьне, у тым ліку ў праклітыках (не/ня, без/бяз) праводзіцца пасьлядоўна ў першым складзе перад націскам і толькі ў ім.

3. Аднаўляюцца падвойныя зычныя ў словах тыпу «мякі», «квеці» ( = «мяккі», «квецьці»).

4. Напісаньні «барадзьба», «барадзьбіт» пасьлядоўна замяняюцца на «барацьба», «барацьбіт».

5. Напісаньні тыпу «безкрайных», «бязсьмерці» замяняюцца на «бяскрайных», «бясьсьмерці».

6. «У» доўгае або «ў» кароткае ставіцца ў залежнасьці ад рытму верша.

7. Рэгулярнае (за рэдкімі выняткамі) аўтарскае «сяньня» паўсюль правіцца на «сёньня». У архіўных матар'ялах нам ня трапілася ніводнага выпадку, дзе б гэтае слова, стоячы на рыфме, рыфмавалася як «сяньня» — заўсёды як «сёньня» (здаецца, адзіны адваротны прыклад — у вершы «Вясельле» (АРН, с.56): раньне — сяньня). Таму напісаньне «сяньня» варта, мабыць, палічыць за арфаграфічную ўмоўнасьць. Варыянт «сягодня» правіцца на «сягоньня».

8. Пунктуацыя праясьняецца без агаворак. У камэнтарах знакі прыпынку на канцы радкоў, як правіла, апускаюцца.

9. Без агаворак таксама выпраўляюцца відавочныя памылкі друку і апіскі (але пры перадруку з ранейшых выданьняў выпраўленьні адзначаюцца).

Іншыя арфаграфічныя і марфалагічныя зьмены адзначаюцца ў камэнтары, напрыклад: нівэчыць // нявечыць, птак // птах, болі // болю, маі // мае.

Бяз зьменаў захоўваюцца наступныя асаблівасьці аўтарскага правапісу:

1. Мяккасьць-цьвёрдасьць «л» у запазычаньнях перадаецца паводле аўтарскага напісаньня.

2. Рэгулярнае аўтарскае «калісьць», «чамусьць» і пад. пакідаецца нязьменным. Гэтаксама ж ня правяцца і формы тыпу «каліcь», «чамусь» (нашмат радзейшыя).

3. Захоўваюцца дыялектныя спалучэньні з націскнымі прыназоўнікамі: зо сну, до сну (у аўтаркі пішуцца разам, у нас асобна).

4. Пакідаюцца аўтарскія напісаньні «гдзе», «гдзесьць», «нігдзе»

і пад. (апрача тых выпадкаў, калі верш перадрукоўваецца з ранейшага выданьня).

5. Захоўваюцца мяшаныя зборна-множныя формы накшталт: «крыльлі», «гольлі», а таксама форма з падвойным «р»: даверра.

6. Як правіла, захоўваецца напісаньне асобных словаў з вялікае літары (і нават цалкам вялікімі літарамі).

**Кніжныя выданьні вершаў Ларысы Геніюш**

Вершы Ларысы Геніюш выдаваліся дагэтуль кніжкамі прынамсі дзевяць разоў:

1. **Ад родных ніў**. Прага, выданьне Беларускага Камітэту Самапомачы ў Нямеччыне, 1942 г. Укладаў, як удзячна ўспамінае аўтарка, д-р Вітаўт Тумаш. Рэпрынт: Менск, 1995.

2. **Невадам з Нёмана**. Менск, Беларусь, 1967. Пад рэдакцыяй Ул. Караткевіча; прадмова Юл.Пшыркова. Увайшла большыня вершаў з АРН, з касмэтычнымі праўкамі і дзе-нідзе скарачэньнямі дзеля цэнзуры, а таксама багата пазьнейшых.

3. **Казкі для Міхаські.** Менск, 1972. Дзіцячыя вершы.

4. **Добрай раніцы, Алесь!** Менск, 1976. Дзіцячыя вершы.

5. **На чабары настоена**. Менск, Мастацкая літаратура, 1982. Рэцэнзэнт Сьцяпан Гаўрусёў, рэдактар Р.М.Яўсееў, прадмова Дануты Бічэль-Загнетавай. Апошняя ўспамінае: «Я дапамагала Ларысе Антонаўне ўкладаць зборнік «На чабары настоена», выйшаў у Менску ў 1982 годзе. Пасьля мяне чытаў яшчэ Максім Танк, прыслаў Ларысе Антонаўне заўвагі — што выкінуць, а што пакінуць...» (МіС, с.5). Тамсама засьведчана: «Практычна над тэхнічнай падрыхтоўкай яе кніжак да друку, у тым жа і д[зьвю]х дзіцячых, мы працавалі разам» (с.6).

6. **Dzieviać vieršaŭ**. Беласток, 1987. Самвыдаўская брашура, аддрукаваная на ратапрынце. Зьмяшчае вершы, пераважна калядныя, канца 1970-х—пачатку 1980-х гг.

7. **Белы сон: вершы і паэмы**. Менск, Мастацкая літаратура, 1990. Укладаньне і прадмова Барыса Сачанкі. У кнігу ўвайшлі амаль цалкам усе чатыры кніжкі Ларысы Геніюш, выдадзеныя ў савецкай Беларусі, а да таго ж шэраг вершаў з АРН, з прыжыцьцёвых і пасьмяротных публікацыяў і з рукапіснае спадчыны.

8. **Вершы. Рукапісны зборнік з 1945-1947 гг.** Лёндан, Беларуская бібліятэка імя Ф.Скарыны, 1992. Пад рэдакцыяй і з уступам (англамоўным) А.Б.Макмільліна. Выданьне рукапіснага зборніку, які захоўваецца ў Скарынаўскай бібліятэцы і зьмяшчае 41 верш з паваеннага, яшчэ праскага, пэрыяду.

9. **Маці і сын**. Беласток, 1992. Бібліятэчка беларускага літаратурнага аб'яднаньня «Белавежа» пад рэдакцыяй Яна Чыквіна. Пад адной вокладкай — два асобныя зборнічкі: Ларысы Геніюш «Сэрца» (укладаньне і прадмова Дануты Бічэль) і яе сына Юркі Геніюша «Да сьвету» (выбраў і да друку падрыхтаваў Сакрат Яновіч). Тут 40 вершаў Ларысы Геніюш, дагэтуль не публікаваных.

**Мой родны кут** (***Мой родны кут), с.5.
АРН, сс.16-17. НзН, сс.77-78, дзе датавана: 1940. БС, сс.46-47. Друкуецца паводле АРН, з нашаю праўкаю ў р.28 (як у НзН): ў начы // уначы.
**Вячэрняя містэрыя** (***Золатам тканаю рызаю), с.7.
АРН, с.91. НзН, с.19, дзе датавана: 1935. БС, с.12. Друкуецца паводле АРН.
**На начлезе** (***Вецер хвалі ўперад гоне, вербы гне), с.8.
12 вытры, вытры, месячыку, твар.
*Пасьля* 12 *да канца:*

Час дамоў, зачыніць маці дзьверы
і сям'я натруджана засьне,
час дамоў, свавольнік легкаверны,
вецер зноў запутаўся ў касе.
Маладзік плыве, плыве, ня гасьне,
дзеўчына касу перапляла,
а зямля свае ім бае басьні,
дарагая, родная зямля...

*Варыянты паводле а/з 19, а.28:*
1-16: *як у а/з 19, а.11, апрача:*
2 я іду басонач па зямлі
12 схіліў месяц задумёны твар
15 летучы, свавольнік легкаверны,
16 вецер ёй запутаўся ў касе.
*Пасьля* 16 *да канца*:
Незнарок нейк белаю рукою
дзеўчына касу перапляла,
затужыла песьня за ракою,
ўздрыганула сонная зямля.
Адплыў месяц па нябесным ўлоньні
адзінокім, зораным шляхом,
не прыпаў аблiччам да далоняў,
жаль, ня выцер твару ручнiком...

**Гром** (***Дзіўны мой дом быў у юнасьці), с.172.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 166, а.11 = а/з 168, а.1.
*Варыянт:*
8 вершы на карце бяроз
*Варыянты паводле аўтографу (а/з 42, а.6):*
2 дзьверы насустрач вятроў
5 Тайны пяяў мне магільныя
7 птушкі расьпісвалі крыльлямі
9 Лёгка дружыць было з месяцам
10 З ветрам ўрывацца у сад
З бурай ўрывацца у сад
11 ў хмараў чарнеючым месіве
12 з громам маланкі красаць
14 усё згінула, ў попеле дом
у магіле, у попеле дом
16 чуецца, чудзіцца гром
*У а/з 42, а.6адв, пасьля* 16 *яшчэ 4 радкі:*
Вольнай бы, не паланянкаю,
ў брызгах няспыненых мар
рву залатымі маланкамі
чорнае месіва хмар.
*Варыянт у р.3 гэтага слупка*: залатымі // агнявымі.

******Там пад дрэвамі поўначчу цёмнай**, с.173.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 165, а.3.
*Варыянт:*
7 слоў мужчынскіх грукочучы россып
*Рэдакцыя паводле а/з 21, а.39:*

Гдзесьць пад дрэвамі поўначчу цёмнай
бродзіць ўсё неспакойны мой дух.
Ў ноч вятры там на сто верацёнаў
незабыўныя казкі прадуць.
Ліпы гольлі ўзьнялі аж да хмараў.
Зелянеюць старыя дубы,
па іх коўзалі громаў удары,
ім маланкі палілі чубы,
а яны ўсё стаяць як стаялі,
крыюць раны ў зялёным гальлі.
Мужным сэрцам ўсе буры стрывалі
<зноў> і растуць, і шумяць на зямлі.

*Варыянты гэтае рэдакцыі:*
5 Дрэвы гольлі ўзьнялі аж да хмараў
11-12 Мужным сэрцам даўно ўжо пазналі,
што няможна сыходзіць з зямлі.
*Тоесны тэкст у а/з 166, а.3, з тымі ж варыянтамі і яшчэ адным, нрзб., у р.12.*
******Шумяць дрэвы ў адвечным лесе**, с.174.
Упершыню: НЧН, с.105. БС, с.197. Друкуецца паводле а/з 172, а.7.
*Варыянты паводле а/з 160, а.18:*
4 запусьціла калісьць карані
9 гула песьня насупраць ночы
*Варыянты паводле а/з 32, а.38=78:*
1 Шумяць дрэвы ў задуманым лесе
3 ў маё сэрца адвечная песьня
5 Яна ў полі гучэла калісьці
6 Ля зярністых, жытнёвых снапоў
8 маіх юных, дзіцячых гадоў
9-12: *няма.*
13-16: Жаль глыбокі падчас і балесны,

з-пад кудзеляў, старых верацён
столькі долі, што ў гэтай вось песьні,
столькі шчасьця, што з юных тых дзён...

*Варыянты паводле а/з 43, а.5:*

1 шумяць дрэвы ў задуманым лесе
3 недзе ў сэрца адвечная песьня
4-16: Гэта песьня гучэла калісьці
ля зярністых, жытнёвых снапоў,
калі гойдалі ветры калыску
маіх ў полі дзіцячых гадоў.
Гула песьня насуперак ночы,
хвалявала і нівы і бор,
чар той жніўны прарваўся аднойчы,
сумнай песьняю ў сэрцы замёр.
Жаль глыбокі падчас і балесны,
з-пад кудзеляў, старых верацён
столькі долі, што ў гэтых вось песьнях,
столькі шчасьця, што з юных тых дзён...

*****Разьвітальна заплакала восень**, с.175.
Упершыню: Гродненская правда, 1.11.1980, с.4. НЧН, сс.77-78, пад назовам: Разьвітальна заплакала восень. БС, с.177. Друкуецца паводле а/з 32, а.32=73.

*Варыянт:*

9 Са сваіх, з наднямонскіх я гоняў

*Варыянты паводле а/з 147, а.31:*

7 Тушыць восень дажджамі касымі
8 жар рабінаў ў забытым саду
18 калі восень бярозы нагне

*Варыянты паводле а/з 147, а.20:*

5 Я з далін, гдзе туманна і сіня
7 Гасіць вецер дажджамі касымі
9 З наднямонскіх засеяных гоняў
10 з гэтых рэк, што ўвабралі у плынь
13 З беларускай я створана гліны
18 Калі восень галіны сагне

*****Адплывалі няўпынна ў вечнасьць дзеі жыцьця**, с.176.
Упершыню: Маладосьць, 1980, №6, с.100, пад назовам: Сын і матуля.

НЧН, с.76. БС, с.176 (перадрук з НЧН) і с.299 (у разьдзеле «З рукапіснай спадчыны»). Друкуецца паводле а/з 32, а.23=64.
Гураганы — ураганы.
***Дзень у сумётах сініх дагарае,** с.177.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 22, а.22 = а/з 168, а.9.
**Сонца ясна засьвяціла** (***Сонца ясна засьвяціла), с.178.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 158, а.3=4.
***Гутарка сэрца людзкога бяз слоў**, с.180.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 27, а.4 = а/з 31, а.1=4=5.
**Вецер** (***Вецер лісьцямі кружыць, кружыць), с.181.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 21, а.5 = а/з 166, а.5, з нашаю праўкаю ў р.24: абымкі // абдымкі.
***Песьня каронай на голаў лягла**, с.182.
Упершыню: НЧН, с.93. БС, с.189. Друкуецца паводле а/з 154, а.2 = а/з 58, а.5 = а/з 176, а.18. Рэдакцыя аўтографу (а/з 41, а.22адв.):

Песьня каронай на голаў лягла,
цярнёвым вянком на чало.
Горда са мною праз мукі прайшла
зброя мая ў буралом.

Песьня з-за кратаў, з цямніцаў, з дратоў,
болем пранізаны твар,
крыкі глухія пакутных братоў
і песьня як вечны бунтар.

Хочацца сяньня як сэрца узьняць
і даць ёй свабодны узьлёт.
Хай кружыць, варкуе, пяе, як вясна,
прарваўшыся сілаю вод.

*Варыянты гэтага аўтографу:*
10 і даць Табе вольны узьлёт
12 прарваўшысь стыхіяю вод

**Салавейка** (***Ні сялянскі, ні панскі), с.183.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 22, а.24.
**Начная акварэль** (***Такая ноч. Не шалахнецца вецер), с.184.
Упершыню: НЧН, с.104. БС, с.196. Друкуецца паводле а/з 32, а.22.

*Варыянты паводле а/з 166, а.13:*

3 На крыльлях хмар, як залаты брасьлецік
8 капытамі амаль кранаюць зор
капытамі кранаюць зор

*У а/з 19, а.6, з пазнакаю на месцы загалоўка:* Першы варыянт гэтага верша...:

Такая ноч, усё адпачывае.
Ў дрымоце дрэвы хіляць галаву,
За ценем цень. На пальчыках ступаю,
Бясшумна так, каб не збудзіць траву...

Апошняе сьвятло ў вакне пагасла,
Апошні дым расплыўся з каміноў,
Ў такую ноч адны толькі Пэгасы
Капытамі кранаюць аблакоў.

Такая ноч. Не шалахнецца вецер,
Здалёку зорка на зямлю глядзіць,
На хмары гдзесьць, як залаты брасьлецік,
Прынадна сьвеціць кволы маладзік.

Запала рэчка ў сіні сон глыбокі,
Трысьцё ў паўсьне, і толькі я ня сплю,
Пэгас задумана вярнуўся з-пад аблокаў
Да рук маіх, каб апяваць вясну...

*****Цягнецца ў неба таполя**, с.185.

Упершыню: Гродненская правда, 16.2.1980, с.4. НЧН, с.91. БС, с.187.
Друкуецца паводле а/з 172, а.4, з нашаю праўкаю ў р.13: болі // болю.

*Варыянты паводле а/з 147, а.8:*

8 Можа й мяне уракліʼ?
10 Люба цьвіла сенажаць

*Варыянты паводле а/з 32, а.32=72=107:*

6 Гнецца вярба да зямлі
7 Ёсьць ў маім краі урокі
8 Можа й мяне уракліʼ (*рук. варыянт*: можа // недзе).
11 Поле мяне навучыла

*****Даўно за поўнач ўжо, а мне ня сьпіцца,** с.186.
Упершыню: Полымя, 1980, №7, с.167. Гродненская правда, 5.9.1987, с.4. Друкуецца паводле а/з 174, а.1=2=3.
*Варыянты:*

5 Рассыпала іх назнарок па краі
Рассыпала і семя зор па краі
Рассыпала і скарбы зор па краі

*****На ашпараных сьцюжаю дрэвах**, с.187.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 179, а.2.
*****Праляцелі гады з разлукаю**, с.188.
Упершыню: НЧН, с.24. БС, с.136. Друкуецца паводле а/з 165, а.4 = а/з 122, а.1=2.
*Варыянт*:

11 Уцякла доля наша з пакражаю

*****Іду адна, а прада мною — ноч**, с.189.
Упершыню: Полымя, 1963, №4, с.96. НзН, с.149, дзе датавана: 1962. БС, с.88. Друкуецца паводле БС.
*****Рукой хтосьць чорнай дакрануўся крыльляў**, с.190.
Упершыню: НЧН, с.73. БС, с.173. Друкуецца паводле а/з 165, а.6; тоесны тэкст у а/з 147, а.29. У а/з 165, а.6 далей амаль без прабелу ідзе:

Я сэрца ўздым, жыцьцё сваё і вернасьць,
і ўсё, чым толькі мерыцца любоў,
аддам Табе, каханая бязьмерна,
пакутная зямля маіх дзядоў!

*****Навокал сьнег, бы сівізна на скронях**, с.191.
Упершыню: ЛіМ, 11.3.1983, с.8. БС, с.245. Друкуецца паводле БС.
*Варыянты паводле а/з 26, а.2:*

3 Гляджу на шлях, нейк мне сумн[а] сяньня
7 вію // ую
11 бровы // брові

*Варыянты паводле а/з 27, а.2 = а/з 154, а.1:*

3 Гляджу на шлях, неяк мне сумна сяньня
4 Прачхнуцца б сэрцу ад вясьняных сноў
7 вію // ую
11 бровы // брові

*****Сьцюжа. Вецер толькі дзіка гаспадарыць**, с.192.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 25, а.12.
Лятарні — ліхтары.

**Пазёмка** (***Дзіўная сёньня з полем гаворка), с.193.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 21, а.8.
*Варыянты паводле а/з 176, а.11:*

4 кружыць сьнег белы паміж кустамі
6 схапіў і душу ў далонях песьціць

**З паганаў я** (***Ныраюць сані ў белыя сумёты), с.194.
Упершыню: НЧН, сс.109-110, без загалоўку. БС, с.200. Друкуецца паводле а/з 22, а.12 = а/з 21, а.19. Тоесны тэкст у а/з 32, а.35=75.
**За гаспадара** (***Адкінуўшы ўбок блытаніну), с.195.
Упершыню: НЧН, сс.116-117, пад назовам: Тост. БС, сс.205-206. Друкуецца паводле а/з 21, а.6.
*****Ціха ад дрэваў лёг цень на страху**, с.196.
Упершыню: ЛіМ, 1.6.1990, с.9. БС, с.303. Друкуецца паводле а/з 32, а.21=62, з нашаю праўкаю ў р.12: маі // мае.
**З мінулага** (***Восень прарочаць панікшы юргіні), с.197.
Упершыню: НЧН, с.131. БС, с.217. Друкуецца паводле а/з 25, а.10.
**Памяць** (***Памяць — вечны сябра, неадступны цень), с.198.
Упершыню: НЧН, сс.28-29. БС, с.142. Друкуецца паводле а/з 32, а.20. У а/з 147, а.16 радкі ўдвая карацейшыя, ўсяго 16 радкоў.
*Варыянты паводле а/з 147, а.16 (згодна з нашай нумарацыяй):*

4 ў надвячоркаў сьпевы звонкіх верацён
ў надвячоркі, ў сьпевы звонкіх верацён

*****Мне ня сьпіцца. Зноў ноч без спагады**, с.199.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 25, а.7.
*****Цішыня раўнамерна плыве за вакном**, с.200.
Упершыню: НЧН, с.99, пад назовам: Дзе блудзяць сны. БС, с.146. Друкуецца паводле а/з 174, а.1=2=3.
*****За акном у сутоньні**, с.201.
Упершыню: НЧН, с.36. БС, с.147. Друкуецца паводле БС.
*Варыянты паводле а/з 176, а.11:*

1 За акном ўжо сутоньне
2 сплыло сонца са стрэх
4 душу выбеліў сьнег
5 Мне б льняную кашулю
7 вы на ноч апранулі
10 ля палёў ў цішыні
11 дзе б свая толькі песьня
12 калыхала мяне

**Чужыне** (***Нэонавым, такім рэкламным вечарам), с.202.
Упершыню: МіС, с.23, дзе датавана: 1956. Друкуецца паводле самвыдаўскага машынапісу.
**Не кранай майго сэрца** (***Не кранай майго сэрца прыцішаных струн), с.203.
Друкуецца ўпершыню паводле аўтографу: а/з 97, аа.13,13адв. У самвыдаўскім машынапісе датавана: 1943.
**Чужына** (***Эх, ліхая чужына... Ня выжыў бы тут), с.204.
Друкуецца ўпершыню паводле самвыдаўскага машынапісу, дзе датавана: 1943, з нашымі праўкамі ў р.16: павуціньнем // павуціньне, і ў р.20: неба краю // небакраю
***__Песьняў хочаце шчырых__, с.205.
Друкуецца ўпершыню паводле аўтографу: а/з 41, аа.20,20адв. У самвыдаўскім машынапісе датавана: 1960.
***__На прыпечку мурлыча кот__, с.206.
Упершыню: НЧН, сс.110-111. БС, с.200. Друкуецца паводле а/з 21, а.15 = а/з 22, а.4. Тоесны тэкст у а/з 32, а.43=83.
*Ранейшы варыянт у а/з 21, а.15 = а/з 22, а.14:*

5 Маўчаньне й цемень угары

***__Калі бачу лютую няпраўду__, с.207.
Упершыню: НЧН, сс.45-46. БС, с.154. Паўнейшы тэкст: ЛіМ, 1.6.1990, с.8. Друкуецца паводле а/з 32, а.45=85.
***__Сьнег пластом. Ляцяць шпаркія сані__, с. 208.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 165, а.2 = а/з 148, а.3. Рукапісныя аўтарскія праўкі аднолькавыя ў абодвух тэкстах.
*Варыянты:*

4 ў бель палёў, ды ня тыя гады...
11 закранаюць сьляды ў каляінах

***__Кажуць, што праўды няма на сьвеце__, с.209.
Упершыню: НзН, с.183, дзе датавана: 1966. БС, с.107. Друкуецца паводле БС.
**Белы сон** (***Белы сон, толькі неба здалёк), с.210.
Упершыню: НЧН, с.122. БС, с.211. Друкуецца паводле а/з 121, а.1.
Беляхціць (дыял.) — бліщчыць бельлю, вельмі чыстым.
**На варце** (***Зашумелі травы на лугох), с.211.
Упершыню: БС, сс.235-236. Друкуецца паводле а/з 35, а.9.

***Кожны дзень без Цябе**, с.213.
Друкуецца ўпершыню паводле аўтографу: а/з 71, аа.9адв,10.
Зьдзьвігі — подзьвігі, цяжкая праца, гараваньне.
*Варыянт:*
24 Мой любы змагар.
***Гляджу на шлях, злы вецер ўсё пяе**, с.214.
Друкуецца ўпершыню паводле аўтографу: а/з 98, а.2, з нашаю праўкаю ў р.2: йзноў // ізноў.
**Восень** (***Задрыжала зьнячэўку асіна), с.215.
Упершыню: НЧН, с.17, пад назовам: Сыну ў Беласток. БС, с.131. Друкуецца паводле а/з 168, а.10, з нашаю праўкаю ў р.13: хахочаш // рагочаш.
*Варыянт:*
8 яшчэ восень снуе з серабра.
Лекацець — трымцець, дрыгацець, калаціцца.
***Зьвініць песьня запозьненым шчасьцем**, с.217.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 22, а.9 = а/з 21, а.3.
**На акне** (***На акне маім фіранкі), с.218.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 22, а.28 = а/з 21, а.26, з нашаю праўкаю ў 10 радку: маём // маім.
***Плынь жыцьця майго — цёмная ночка**, с.219.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 179, а.2.
**Сон** (***Калі зо сну цяжкога прачнуся), с.220.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 22, а.25 = а/з 21, а.11, з нашымі праўкамі ў радках: 1: прачхнуся // прачнуся, 12: прачхнуцца // прачнуцца, 15: маі // мае.
Ясыр — палон, няволя.
*Варыянт:*
20 хмары з сном маім ўжо адплылі...
***Бесканечна ўсё раняць, як ранілі**, с.221.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 21, а.39 = а/з 166, а.3.
*Варыянты паводле а/з 147, а.30:*
2 гэта сяньня ня так баліць
3 вось, здаецца, асеньняя раніца
5 Далі толькі паволі туманяцца
***Схавалася сонейка, праца ня цешыць**, с.222.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 172, а.7=8 = а/з 160, а.18.

*Варыянты паводле а/з 43, а.5:*

3 пажоўклы лісток, на парог прыляцеўшы
4 сумна напомніў, што восень брыдзе
8 <заплаканай восені сумна ля ног>
12 што летам зьлівалі зямлі прыгажосьць
21-24: *няма*

******За вокнамі гасьне дзень***, с.223.
Упершыню: ЛіМ, 23.08.85, с.10. На думку публікатара (Данута Бічэль), гэта, магчыма, апошні верш Ларысы Геніюш. БС, с.278. Друкуецца паводле БС.

******Далі табе нямала чарак***, с.224.
Упершыню: МіС, с.49. Друкуецца паводле самвыдаўскага машынапісу. Можна датаваць 60-мі гадамі.

******Хай славіцца наш беларускі род***, с.225.
Упершыню: ЛіМ, 14.9.1979, с.9. НЧН, с.50. БС, с.156. Друкуецца паводле а/з 21, а.39 = а/з 166, а.3, тоесны тэкст у а/з 32, а.4=50=90.

******Атлас — гэта сіла! Аберуч той бог***, с.226.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 22, а.12 = а/з 21, а.19.

******Славяцца людзі гуманнасьцю спраў***, с.227.
Упершыню: ЛіМ, 14.9.1979, с.9. НЧН, с.48. БС, с.155. Друкуецца паводле а/з 32, а.16 = 100.

**Быць** (***Быць, то на ўласную сьцежку ступіць), с.228.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 21, а.34, тоесныя тэксты ў а/з 22, а.15, а/з 32, а.16=100, а/з 147, а.33. Нашая праўка ў р.2: сваі // свае.

******Словы пустыя — пена***, с.229.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 22, а.5 = а/з 21, а.13, тоесны тэкст у а/з 32, а.35=75.

******Колькі дум маіх ні раскулачвалі***, с.230.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 21, а.8, тоесны тэкст у а/з 166, а.6, і практычна тоесны ў а/з 147, а.23.

******У кожнага зара сваіх надзей***, с.321.
Упершыню: НЧН, с.112. БС, с.203. Друкуецца паводле а/з 32, а.33=73, тоесны тэкст у а/з 147, а.23. Нашая праўка ў р.2: сваі // свае.

******Моцны дух наш — дарагое рэчыва***, с.232.
Упершыню: ЛіМ, 11.3.1983, с.8. БС, с.246. Друкуецца паводле а/з 26, а.3 = а/з 30, а.3.

***Мудрасьць сьпелую сівых вякоў**, с.233.
Упершыню: ЛіМ, 14.9.1979, с.9. НЧН, с.52. БС, с.159. Друкуецца паводле а/з 22, а.11 = а/з 21, а.35. Практычна тоесныя тэксты ў а/з 32, а.16, і ў а/з 147, а.33.
***Йду шляхамі крутымі**, с.234.
Упершыню: ЛіМ, 1.6.1990, с.9. БС, с.307. Друкуецца паводле а/з 32, а.22=63.
***Радасьць як вецер**, с.235.
Упершыню: НЧН, с.69. БС, с.173. Друкуецца паводле а/з 176, а.6, тоесны тэкст у а/з 21, а.10.
***Нада мною ляглі туманы**, с.236.
Упершыню: БС, с.307. Друкуецца паводле БС.
***На зоры глядзець немагчыма**, с.237.
Упершыню: НЧН, с.58. БС, с.162. Друкуецца паводле а/з 32, а.6=52, з нашымі праўкамі ў рр. 2: маргаюць // міргаюць, 4: запечку // прыпечку
***Час, бы нітка льняная, прадзецца**, с.238.
Упершыню: НЧН, с.63. БС, с.166. Друкуецца паводле а/з 32, а.3=49=89.
*Варыянт паводле а/з 168, а.3 = а/з 166, а.8:*
4 стане заўтра нявартым ўспамінам
***Іду скрозь зялёныя шолахі дрэў**, с.239.
Упершыню: ЛіМ, 14.9.1979, с.9. НЧН, с.91. БС, с.188. Друкуецца паводле а/з 32, а.5=51=91.
***Сіратліва ўзіраецца топаль**, с.240.
Упершыню: НЧН, с.127. БС, с.214. Друкуецца паводле а/з 32, а.35=75. Тоесны тэкст у а/з 21, а.13 = а/з 22, а.5.
**З намі Бог** (***Каляда, Каляда, зьзяе зорка ўрачыста), с.241.
Упершыню: 9В, сс.4-5. На Беларусі ўпершыню: Роднае слова, 1992, №12, сс.48-49. Друкуецца паводле а/з 134, а.3.
*Варыянты паводле а/з 134, а.1=2=3:*
8 Божы Сын улюбёны на землю прыйшоў
11 І // А
13 Ён ня зброяй прыйшоў заваёўваць дзяржавы
16 Ведучы ў страшны час на пакутную сьмерць
17-20: <Ён народы вучыў, што ўсе людзі ёсьць брацьця
І што роўныя ўсе перад Богам з нябёс,

І таму вось Яго павядуць на расьпяцьце,
І пакорна Ён ўспрыме назначаны лёс.>

*(замест гэтага слупка збоку старонкі ўпісаны ад рукі варыянт, які мы падаем у асноўным тэксьце)*

21 Яго моц у дабрыні, Яго веліч у слове
23 Яго сіла ў цярпеньні, ў няземскай любові
24 Бо любоўю прыйшоў Ён каб сьвет пакарыць
25 Ён у дарозе пакутнай, апошняй
28 Ворагаў будзе нат благаславіць
30 Ён пройдзе ахвярай, найбольшай з ахвяр
32 Сплыве болем пакутаў на змучаны твар
33 Ён устане з цярпеньняў, уваскросьне з магілы
35 І будзе у сьвеце адзінаю сілай
36 З мёртвых уваскросшы нам Бог-Чалавек!
38 І самому за ўсіх на пакуты пайсьці
40 Гэта вера і шчыт чалавечы ў жыцьці!
42 А канец сярод вечных, бясконцых трывог
45 А пакуль сьвеціць зорка, Вячэра, калядкі

*Варыянты паводле а/з 134, а.4:*

8 Абяцаны Сын Божы на землю прышоў
11 І // А
13 Ён ня зброяй прыйшоў заваёўваць дзяржавы
19 Навучаць будзе сьвет, што ўсе людзі ёсьць брацьця
23 Яго веліч ў цярпеньні, ў няземскай любові
28 Ён род чалавечы паблагаславіць
30 Ён стане найболей нявіннай з ахвяр
35 І будзе магутнай духоваю сілай

*Пасьля* 36:

Мінаюць вякі, а змаганьне трывае,
Зло з дабром ў людзкіх сэрцах сутычкі вядуць,
Ўсё адныя сурова Яго расьпінаюць,
А другія, як Ён, на пакуты ідуць.

Ён ня сеяў крыві, а лагодзіў цярпеньні,
Ён ня нішчыў, а мёртвых к жыцьцю падымаў,
І ісьці будуць людзі за Ім ў захапленьні,
Бо інакшай дарогі да міру няма!

*Далей, як у нас ад р.37 да канца.*
*Варыянты паводле а/з 134, а.6=7:*

2 Незабыўная ўзьнёсласьць славутых хвілін
3 Ў ціхіх ясьлях ляжыць ля Марыі Прачыстай
4 Людзям пасланы, нованароджаны Сын.
8 Божы Сын гэтак скромна на землю зышоў
12 Што пакорна у ясьлях быдлячых ляжыць
13 Ён ня зброяй прыйшоў заваёўваць дзяржавы
14 На чало залатую карону адзець
16 Ведучы, бы Ягня, на пакутную сьмерць
17 То за людзкасьць Яго павядуць на расьпяцьце
18 Ён пакорна успрыме назначаны лёс
19 Бо народы вучыў Ён, што людзі ёсьць брацьця
21 Яго моц у дабрыні, Яго веліч у слове
23 Яго сіла ў цярпеньні, ў няземскай любові
24 То любоўю прышоў Ён злы сьвет пакарыць

*Пасьля* 24:

Аздаровіць Ён хворых, злагодзіць цярпеньні,
Будзе мёртвых уваскрошваць і цуды тварыць,
І натоўп пойдзе ўсюды за Ім ў захапленьні,
А Ён будзе любові і праўдзе вучыць.

26 Калі ўскладуць церні Яму на чало
28 Ён пройдзе бяз скаргі праз мукі і зло
29 І ня будзе ахвяр у Яго абароне
30 Бо Ён сам быў ахвярай, найбольшай з ахвяр
32 Сплыве болем пакутаў на змучаны твар

*Далей да канца:*

Праз пакуты прайсьці — сьмерць, дастойная Бога,
І найбольшая ў сьвеце з усіх перамог,
А забіць, укрыжаваць — гэта не перамога,
А канец і мучэньні бясконцых трывог.

Ажыве Ён з цярпеньняў, уваскросьне з магілы,
І любоў пераможа ўсю лютасьць і зьдзек,
І стане у сьвеце адзінаю сілай
З мёртвых уваскросшы наш Бог-Чалавек!

Несьці людзям дабро і любоў сеяць ў сэрцы,
І самому за ўсіх на пакуты пайсьці,
Гэта Божая моц, непадуладная сьмерці,
Божы Сын і наш шчыт чалавечы ў жыцьці!

І мінаюць вякі, а Бог вечны трывае,
Зло з дабром ў людзкіх сэрцах змаганьне вядуць,
Ўсё адныя да сёньня Яго расьпінаюць,
А другія, як Ён, на расьпяцьце ідуць.

А пакуль сьвеціць зорка, Вячэра, калядкі,
І вялікая праўда прышла на парог.
Туліць ў ясьлях Марыя сьвятое Дзіцятка,
І пяюць пастушкі: з намі Бог, з намі Бог!

**Сьвяты Вечар** (***Ляціць сьнег на палі, над зямлёю сутоньне), с.243. Упершыню: 9В, сс.7-8, дзе датавана: 1978-79 г. Друкуецца паводле а/з 123, а.3.

*****Каляда, Каляда, прачынаюцца зоры**, с.245. Друкуецца ўпершыню паводле а/з 142, а.1. Датуецца: 1973-1974 (паводле тэксту, знойдзенага Лявонам Юрэвічам у архіве Беларускага Інстытуту Навукі і Мастацтваў у Ню-Ёрку).

*Варыянты паводле а/з 126, а.4 = а/з 127, а.4:*

1 Каляда, Каляда, запаліліся зоры
2 Неба сяньня здаецца ялінкай ў агнях
5-12: Ў думках сяньня мы ўсе на каленях прад Дзецем,
Што прынесла на землю любоў і дабро,
Сэрцам нашым зара Бэтлеемская сьвеціць,
Як сьвяціла тады пастушком, каралём.
Прыпадаем сасмагла да веры крыніцаў,
Мудрасьць з ясьляў лунае няземскім сьвятлом,
Гэтай сьцежкай прайсьці б, ў горы не аступіцца,
На дарогах жыцьця разьмінуцца са злом.
18 Ён, нявінны з нявінных, сьвятое Ягня,
20 Сьмерць прыняўшы страшную «за друзі свая».
21 Сьвеціць зорка ўгары, як калісьць ў Бэтлееме
23 Ляжыць ў ясьлях Дзіцятка сьвятое на сене
24 А на цэлай зямлі — цішыня

*У гэтым варыянце рр.5-8 сьпярша стаялі ў парадку: 7,8,5,6. У р.10 аўтарская праўка ад рукі:* з ясьляў лунае // нас азарае, *у р.24*: цэлай // Божай.
*Варыянты паводле а/з 147, аа.2-2адв:*

1 Каляда, Каляда, <зараз выглянуць> прачынаюцца зоры
2 Неба будзе сягоньня ялінкай ў агнях
3 Ў гэты вечар ў зямлі бесканечных прасторах
5 Шчасьце Маці-Марыі, радзіўшае Сына
6 Над Дзіцяткам праменіць няземскай красой
8 Запяялі ягняткі Дзіцятку на сон
11 Над прыбыткам зара, і на зорку дарога
Панад імі зара, і на зорку дарога
Ясна сьвеціць зара, і на зорку дарога
14 Над маленькай галоўкай зіяе сьвятло
16 І закапае кроў на сьвятое чало
20 Сьмерць прыняўшы страшную «за друзі свая»
24 А па Божай зямлі — цішыня...

*Усе варыянты, пададзеныя для а/з 147, аа.2-2адв, апрача р.20, зьнятыя і зьмененыя аўтаркаю на прынятыя намі ў асноўным тэксьце.*
*У а/з 126, а.4адв., а/з 127, аа.4, 4адв. — рукапісныя накіды да гэтага верша, якіх мы тут не падаем дзеля нястачы месца.*
**Каляда** (***Верным сэрцам, хоць болем параненым), с.246.
Упершыню: 9B, с.10, дзе датавана: 1979/80 г. Друкуецца паводле а/з 132, а.1. Варыянты паводле а/з 132, а.2=3:

3 Я вітаю Вас, Брацьця каханыя
11 Няхай добра Вам будзе у сьвеце
12 Як на бацькаўскай, роднай зямлі!
27 Частка нашай душы, каласы нашы з поля
28 Ў гэты Вечар Сьвяты шлем вам нашу любоў!

*Варыянты паводле а/з 132, а.4:*

3 Я вітаю Вас, Брацьця каханыя
13 Галаву нахіляючы нізка
20 Ад заплаканых Маці і сівых Бацькоў
28 Ад сьвяточных сталоў шлем вам нашу любоў! *(забіта)*
Ад Вячэры сьвятой шлем вам нашу любоў! *(надрукавана)*
Ад // Ў час *(упісана ад рукі)*

**Каляда** (***Вецер хлешча з нялюдзкаю сілаю), с.248.
Упершыню: 9В, с.9, дзе датавана: 1979/80 г. На Беларусі ўпершыню: Роднае слова, 1992, №12, с.49. Друкуецца паводле а/з 123, а.4, з нашаю праўкаю ў р.15: колькі // столькі.
*Варыянты паводле а/з 123, а.5:*

10 Дум калядных узьнёслы настрой
24 Вас ў адзіную нашу сям'ю
36 Азарыў нашы сэрцы дабром

***Кружыць сьнег густым роем над хатамі**, с.250.
Друкуецца ўпершыню паводле аўтографу: а/з 112, аа.5адв.-6адв.
*Варыянт:*

24 І сям'я, як чакаем штогод

***Бясхмарнага неба туманіцца сінь**, с.252.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 167, а.6 = а/з 27, а.5, з нашымі праўкамі ў р.9: Тваею // Тваёю, рр.10, 17: маей // маёй, р.11: маёй // мае.
***Божа бацькоў маіх, Божа дзядоў**, с.253.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 24, а.31 = а/з 179, а.1, з нашымі праўкамі: р.6: канвоя // канвою, р.12: Тваей // Тваёю, р.17: йзноў / / ізноў, р.22: цуду // цудаў, р.39: Тваі // Твае.
**У Жыровічы** (***Ляцяць з выраю птушкі, гамонячы), с.255.
Друкуецца ўпершыню паводле а/з 60, а.3.
***Вецер марозны гуляе над вёскамі**, с.258.
Друкуецца ўпершыню паводле аўтографу: а/з 112, а.3-3адв.

## АСНОЎНЫЯ ДАТЫ ЖЫЦЬЦЯ І ТВОРЧАСЬЦІ ЛАРЫСЫ ГЕНІЮШ

9 жніўня (27 ліпеня ст.ст.) 1910 г. — у вёсцы Жлобаўцы Ваўкавыскага павету на Гарадзеншчыне ў заможнай сялянскай сям'і Міклашэўскіх нарадзілася дачка Ларыса.

1928 г. — Ларыса Міклашэўская сканчае Ваўкавыскую жаночую гімназію.

3 лютага 1935 г. — Ларыса Міклашэўская бярэ шлюб з Янкам Геніюшам з Зэльвы, студэнтам мэдыцыны ў Празе (нар. 24 лютага 1902 г.).

21 кастрычніка 1935 г. — нарадзіўся сын Юрка.

Канец 1937 г. — Ларыса Геніюш перабіраецца з сынам да мужа ў Прагу.

1939 г., 17 верасьня — Красная Армія займае Заходнюю Беларусь. У тым жа годзе бацька Ларысы Геніюш арыштаваны і па нядоўгім побыце ў гарадзенскай турме расстраляны. Маці высылаюць у Казахстан (станцыя Кіялы) з дзьвюма дачкамі — малодшымі сёстрамі Ларысы.

Канец 1930-х—пачатак 1940-х гг. — першыя публікацыі вершаў Ларысы Геніюш у эміграцыйным друку.

1942 г. — у Празе выходзіць першая кніга вершаў Ларысы Геніюш «Ад родных ніў».

14 сакавіка 1943 г. — у Празе памірае Старшыня Рады Беларускае Народнае Рэспублікі (БНР) Васіль Захарка. Паводле ягонага тастаманту Мікола Абрамчык прызначаны Старшынём Рады БНР, а Ларыса Геніюш — Гэнэральным Сакратаром БНР. Разам з Абрамчыкам Ларыса Геніюш перапраўляе найбольш каштоўную частку архіваў БНР у бясьпячнейшае месца.

27 ліпеня 1944 г. — пад Монтэ-Касіна ў Італіі ў арміі Андэрса гіне брат Ларысы Геніюш Аркадзь.

26 (28?) красавіка 1945 г. — пад Бэрлінам у арміі Касьцюшкі гіне брат Ларысы Геніюш Расьціслаў.

1945 г. — у Казахстане памірае маці Ларысы Геніюш.

5 сакавіка 1948 г. — Ларыса і Янка Геніюшы арыштаваныя ў Вімпэрку (Чэхія). Сын Юрка застаўся на волі.

12 жніўня 1948 г. — Геніюшаў перадалі савецкім уладам.

Кастрычнік 1948 г. — люты 1949 г.: Геніюшы сядзяць у менскай турме. Ларысу Геніюш дапытвае міністр дзяржаўнае бясьпекі Цанава, патрабуючы аддаць архівы БНР.

7 лютага 1949 г. — Вярхоўны Суд БССР асуджае Ларысу і Янку Геніюшаў на 25 гадоў лагераў.

1949—1956 г. — Ларыса Геніюш зьняволеная ў лагерах у Комі АССР (Інта і Абезь).

1956 г. — Ларыса і Янка Геніюшы часткова рэабілітаваныя, тэрмін пакараньня ім зьменшаны да 8 гадоў, ужо імі адбытых. (Цалкам не рэабілітаваныя дагэтуль.) Па вызваленьні селяцца ў Зэльве на Гарадзеншчыне. Савецкага падданства, аднак, Ларыса Геніюш не прыняла аж да сьмерці.

1967 г. — у Менску выходзіць першая ў савецкай Беларусі кніжка вершаў Ларысы Геніюш «Невадам з Нёмана».

1972 г. — выходзіць кніжка дзіцячых вершаў «Казкі для Міхаські».

1976 г. — выходзіць кніжка дзіцячых вершаў «Добрай раніцы, Алесь».

8 лютага 1979 г. — памірае Янка Геніюш.

1982 г. — выходзіць кніжка вершаў «На чабары настоена».

7 красавіка 1983 г. — Ларыса Геніюш памірае ў Горадні ў анкалагічнай больніцы. Пахаваная ў Зэльве, побач з мужам.

1985 г. — у Беластоку памірае Юрка Геніюш, лекар, празаік і паэт.

1990 г. — выходзіць найпаўнейшы дагэтуль збор вершаў Ларысы Геніюш «Белы сон».

1993 г. — выходзяць пад назовам «Споведзь» успаміны Ларысы Геніюш.

ЗЬМЕСТ

Мой родны кут (***Мой родны кут) ... 5
Вячэрняя містэрыя (***Золатам тканаю рызаю) ... 7
На начлезе (***Вецер хвалі ўперад гоне, вербы гне) ... 8
Ноч (***Ноч трапечацца, і зоры ярка сьвецяць) ... 9
На струнах Вэлтавы (***На струнах хваль іграе вецер) ... 10
Па-над Вэлтаваю (***Па-над Вэлтаваю) ... 11
Бывай (***Бывай, дарагая мне Прага) ... 12
Маладыя крыльлі (***Ўжо сонца за морам ў пасьцельку лягло) ... 14
У асеньні дзень (***Йду ціхім, асумелым садам) ... 16
Кір (***Любоў і праўду я бяру за шчыт) ... 17
Заўтра (***Поўны тугі, поўны красы) ... 18
Цуд (***Весяліўся, сьмяяўся агонь) ... 19
Ля чужых варот (***Хоць доля б'е і ў сэрцы лёд) ... 20
Ноч (***Ноч, цемені вечнай таемная пані) ... 22
Трывога (***Ўжо ня буду Цябе калыхаць) ... 23
Брат мой А. (***Брат мой, кажуць, ад кулі памёр) ... 24
Дзяды (***Дождж падае вонку прыцішаным звонам) ... 25
Малы перапынак (***Ачамі да воблакаў сініх прыпаўшы) ... 27
Удар (***Учора сурова падбілі мой лёт) ... 28
Я ня буду (***Я ня буду пісаць аб каменьнях) ... 29
Юнасьць (***Сады адцьвітаюць за дротам) ... 31
***Я з вамі ў няволі, я з вамі усьцяж ... 32
***Я сустрэлася з сябрамі не на балі ... 33
Ня знаю (***Ня знаю, я з гора ці з працы) ... 35
Наш шлях (***Наш шлях як ноч, як крыж балесны) ... 36
***Беларусь маю зноў закавалі ... 37
***Краіна родная, ня плач сьлязьмі крывавымі ... 38
***Калі ноччу дарогай засьнежанай ... 39
Узвышша (***Прад намі, мой мілы, узвышша) ... 40
***Не хачу быць тваёю жонкаю ... 42
Кахаць (***Глянь, месяц спыніўся на сіняй мяжы) ... 44
Крылаты (***Шырокім размахам хвалюючых крыл) ... 47

Шахцёр (***Тае сьнег на шляхох і дарогах) ............................ 49
***Перастань, не траві мяне ядам ............................................ 51
***Можна сэрца жывое пакласьць на агонь ............................ 52
Усё роўна (***Ўсё роўна мне, ці сьмерць, ці перамога)........... 53
На магілу З.К. (***Ты выбачай, што мы цябе так плытка пахавалі) 54
Вечар (***Вось ідзем праз тундру, беразьняк убогі) ................ 56
Дожджык (***Я ня плачу, то вербы у тундры шумяць) ............ 57
Усё б'е ў твар (***Усё б'е ў твар пакутны лёс) ......................... 58
***Гнаны холадам, гнаны ветрам ............................................... 60
Лёс (***Лёс ударыў ў жыцьцё маё долатам) ............................. 62
***Помню Прагу, вясьняныя сьвяты .......................................... 64
***Востры боль пранізаў навакольле ........................................ 66
***За Урал ўпала сонца, бы зарава ............................................. 67
Далёка ад роднага краю (***Далёка ад роднага краю).............. 68
Хто? (***Хто боль мой ўвесь зьбярэ і ў словы згорне) ............ 71
З мінулага (***Сілаю ў сеці злоўлена) ......................................... 72
***Ізноў ўсё навокал, што сэрцу няміла ...................................... 73
***Ў горы я над Тваімі ранамі ...................................................... 74
Воўпа (***Воўпа. Дамоў ўжо няма прывычных) ....................... 75
***Над народам ўсё чужыя «босы» ............................................. 77
***Не пазнаю цябе, мой Краю ....................................................... 78
***Толькі вятры гамоняць на курганах ....................................... 79
***Беларусь маю гора, як каменем ............................................... 80
***Прайграў вайну народ-змагар ................................................. 81
***Далі ёсьць далі, і лёс наш круты ............................................. 82
***Пуста ў сядзібах бывае сягоньня ............................................ 83
***Воўны белае пасмачкі кволыя ................................................. 84
***На зямельцы дзядоў нашых, прадзедаў ................................... 85
***Нас, забітых, загнаных на сьвеце ............................................ 87
***Кажуць — добра, а мне нядобра .............................................. 89
***Сьцішаным сэрцам я чую: бурліць .......................................... 90
***О Беларусь, мой край стары і слаўны ..................................... 91
***Край мой любы, войнамі змучаны ........................................... 92
***Час ймкне наперад, час адлятае .............................................. 94
Баразна (***Дуб зваліўся, упала сасонка) ..................................... 96
***Хто сьцінае дубы і хвоі ................................................................ 98

Кастусь (***Калі ў бой на змаганьне з царамі) ........................ 99
***То ня гоман чужы і грымотны ........................................... 101
***Страх за праўду кінуцца ў бой ........................................... 103
***Луг прайсьці і ног не памачыць ........................................... 104
***Падкрадаецца зьнячэўку страх ........................................... 106
***Шэры дым з каміноў узьвіўся ........................................... 107
***Сонейка у небе і вецер-гусьляр ........................................... 108
***Ноч глухая наўкол, цемень сэрца трывожыць .................. 110
***Сягоньня сьвята, і я сьвяткую ........................................... 111
***Чалавечы, нястрыманы боль ........................................... 112
Мары (***Мары мае высокія, нязбытныя) ................................ 113
***Сьвішча вецер ярасна і востра ........................................... 114
Не прашу! (***Не прашу я ў вас дапамогі) ................................ 115
Зіма (*** Зіма — беласьнежна-суровае зьзяньне) .................. 117
***Беларусы ад касы ........................................... 118
***Сэрцам да краю зьвернена ........................................... 119
***Моладзь ідзе няпэўна ........................................... 120
***Кроў зьбяжыць рабінамі на вусны ........................................... 121
***Зноў час круты і б'е тупым абухам ........................................... 122
***Не згінай мяне, я не сагнуся ........................................... 123
***Ты пан зямлі, я пан свайго сумленьня ................................ 124
***Запаветная мара ўсіх часоў ........................................... 125
***Змагаешся з цемраю — знача, жывеш .................................. 126
***Жыцьцё каламутнае зноў усялякае ........................................... 127
***Блукаю сёньня па родным краю ........................................... 128
***Над душамі чужы, суровы пан ........................................... 129
***На вейках сьляза ледзянее ........................................... 130
***Вам страх маёй прысутнасьці ........................................... 131
***Зіма, беласьнежка, суровая пані ........................................... 132
***Сонца, цяплынь і зрух лёду вясновы .................................. 133
Крылатыя (***Кожны сябра крылаты свой ведае шлях) ........ 134
***Вецер схапіў ўжо асеньнюю пражу ........................................... 135
***Зубр у пушчы, адзінец, ад стада адвык ................................ 136
Жыць (***Жыць — гэта у заўтра праменнае верыць) ........... 137
***Калі палеткі ад жніва астынуць ........................................... 138
Мая крыніца (***Жыта морам наўкол, сіні лён і пшаніца) ... 139

***Юным ня сьпіцца, ня ўцішыць сяла ................................ 140
Раньне (***Блаславеннае летняе раньне) ................................ 141
***Дзень быў сонцам, як сэрцам, сагрэты ................................ 142
***Здратаваны кулямі і ботамі ................................ 143
***Дзіўны час, ўсіх збываюцца мары ................................ 144
Залатая сонца калясьніца (***Ноч крылом пастукала у дзьверы) .. 146
***Пакуль аж сьмерць мне не закрые вочы ................................ 147
***Зноў вясны пераможнай напеў ................................ 148
***Сонца у полі сумуе і цешыць ................................ 149
Беларусь (***Беларусь мая сьпеўная, летняя, жніўная) ......... 150
***Родны дом, родны сьпеў, родны край ................................ 151
Над Зэльвянкай (***Стаю адна, а прада мной ірдзіцца) ........ 152
Зэльва (***Раненым крылейцам сонейка хіліцца) ................ 154
***Усю ноч аж да ранка ................................ 155
Белавежа (***У Белавежу іду, як у храм) ................................ 157
Баравікі (***З прыполу хмар асеньні дождж пасеяў) ............ 159
Ўспамінала дзяўчынанька (***Ўспамінала дзяўчынанька) ... 160
***Ты ня кліч у сьвет мяне з сабою ................................ 161
Неіснуючы (***З каменьчыкаў імя не выкладаю) ................ 162
***Ноч разгарнула бяззорны плашч ................................ 163
***Вечар жыцьця ўжо ступіў на парог ................................ 164
***Вянуць ружы мае на кустах ................................ 165
***Мне патрэбны бор стары сасновы ................................ 167
***Йзноў басонач іду па расе ................................ 168
***Адзінока ў гарачцы ляжу ................................ 169
***Раніца, як марыва. Травы у расе ................................ 170
Маладзік (***Не спыняй, ня кліч мяне ў зазор'е) ................ 171
Гром (***Дзіўны мой дом быў у юнасьці) ................................ 172
***Там пад дрэвамі поўначчу цёмнай ................................ 173
***Шумяць дрэвы ў адвечным лесе ................................ 174
***Разьвітальна заплакала восень ................................ 175
***Адплывалі няўпынна ў вечнасьць дзеі жыцьця. ................ 176
***Дзень у сумётах сініх дагарае ................................ 177
Сонца ясна засьвяціла (***Сонца ясна засьвяціла) ................ 178
***Гутарка сэрца людзкога бяз слоў ................................ 180
Вецер (***Вецер лісьцямі кружыць, кружыць) ........................ 181

***Песьня каронай на голаў лягла ........ 182
Салавейка (***Ні сялянскі, ні панскі) ........ 183
Начная акварэль (***Такая ноч, не шалахнецца вецер) ........ 184
***Цягнецца ў неба таполя ........ 185
***Даўно за поўнач ўжо, а мне ня сьпіцца ........ 186
***На ашпараных сьцюжаю дрэвах ........ 187
***Праляцелі гады з разлукаю ........ 188
***Іду адна, а прада мною — ноч ........ 189
***Рукой хтосьць чорнай дакрануўся крыльляў ........ 190
***Навокал сьнег, бы сівізна на скронях ........ 191
***Сьцюжа. Вецер толькі дзіка гаспадарыць ........ 192
Пазёмка (***Дзіўная сёньня з полем гаворка) ........ 193
З паганаў я (***Ныраюць сані ў белыя сумёты) ........ 194
За гаспадара (***Адкінуўшы ўбок блытаніну) ........ 195
***Ціха ад дрэваў лёг цень на страху ........ 196
З мінулага (***Восень прарочаць панікшы юргіні) ........ 197
Памяць (***Памяць — вечны сябра, неадступны цень) ........ 198
***Мне ня сьпіцца. Зноў ноч без спагады ........ 199
***Цішыня раўнамерна плыве за вакном ........ 200
***За акном у сутоньні ........ 201
Чужыне (***Нэонавым, такім рэкламным вечарам) ........ 202
Не кранай майго сэрца (***Не кранай майго сэрца
прыцішаных струн) ........ 203
Чужына (***Эх, ліхая чужына... Ня выжыў бы тут) ........ 204
***Песьняў хочаце шчырых ........ 205
***На прыпечку мурлыча кот ........ 206
***Калі бачу лютую няпраўду ........ 207
***Сьнег пластом. Ляцяць шпаркія сані ........ 208
***Кажуць, што праўды няма на сьвеце ........ 209
Белы сон (***Белы сон, толькі неба здалёк) ........ 210
На варце (***Зашумелі травы на лугох) ........ 211
***Кожны дзень без Цябе ........ 213
***Гляджу на шлях, злы вецер ўсё пяе ........ 214
Восень (***Задрыжала зьнячэўку асіна) ........ 215
***Зьвініць песьня запозьненым шчасьцем ........ 217
На акне (***На акне маім фіранкі) ........ 218

***Плынь жыцьця майго — цёмная ночка ........ 219
Сон (***Калі зо сну цяжкога прачнуся) ........ 220
***Бесканечна ўсё раняць, як ранілі ........ 221
***Схавалася сонейка, праца ня цешыць ........ 222
***За вокнамі гасьне дзень ........ 223
***Далі табе нямала чарак ........ 224
***Хай славіцца наш беларускі род ........ 225
***Атлас — гэта сіла! Аберуч той бог ........ 226
***Славяцца людзі гуманнасьцю спраў ........ 227
Быць (***Быць, то на ўласную сьцежку ступіць) ........ 228
***Словы пустыя — пена ........ 229
***Колькі дум маіх ні раскулачвалі ........ 230
***У кожнага зара сваіх надзей ........ 231
***Моцны дух наш — дарагое рэчыва ........ 232
***Мудрасьць сьпелую сівых вякоў ........ 233
***Йду шляхамі крутымі ........ 234
***Радасьць як вецер ........ 235
***Нада мною ляглі туманы ........ 236
***На зоры глядзець немагчыма ........ 237
***Час, бы нітка льняная, прадзецца ........ 238
***Іду скрозь зялёныя шолахі дрэў ........ 239
***Сіратліва ўзіраецца топаль ........ 240
З намі Бог (***Каляда, Каляда, зьзяе зорка ўрачыста) ........ 241
Сьвяты вечар (***Ляціць сьнег на палі, над зямлёю сутоньне) ..... 243
***Каляда, Каляда, прачынаюцца зоры ........ 245
Каляда (***Верным сэрцам, хоць болем параненым) ........ 246
Каляда (***Вецер хлешча з нялюдзкаю сілаю) ........ 248
***Кружыць сьнег густым роем над хатамі ........ 250
***Бясхмарнага неба туманіцца сінь ........ 252
***Божа бацькоў маіх, Божа дзядоў ........ 253
У Жыровічы (***Ляцяць з выраю птушкі, гамонячы) ........ 255
***Вецер марозны гуляе над вёскамі ........ 258

КАМЭНТАР ........ 259

АСНОЎНЫЯ ДАТЫ ЖЫЦЬЦЯ І ТВОРЧАСЬЦІ ЛАРЫСЫ ГЕНІЮШ ........ 312

Ларыса Геніюш
Выбраныя вершы

Оригинал-макет изготовлен в ООО «Редакция журнала «Монолог»»
г. Минск ул. Авангардная, 1А

Сдано в набор 11.11.97 г.
Подписано в печать 25.11.97 г.
Бумага книжно-журнальная
Печать офсетная
Формат 60x80/16
Усл. печ. листов 13,5
Тираж 500. Заказ 4347

Отпечатано с готовых деапозитивов в полиграфической фирме «Красный пролетарий»
103473, г. Москва, ул. Краснопрлетарская, 16

У афармленьні вокладцы выкарыстана графіка Андрэя Клюйко